

ЯК УДАСКАНАЛЬВАЮЦЬ САЦЫЯЛЬНЫЯ СЛУЖБЫ МС

НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ГАРАДСКОГА ТРАНСПАРТУ МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 199 (29066)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай СНАПКОЎ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«За тры няпоўныя дзесяцігоддзі наша краіна прайшла сапраўды ўнікальны шлях эканамічнай трансфармацыі. На працягу гэтага часу вучоныя незалежнай Беларусі заўсёды аказвалі магутную і своечасовую падтрымку. Пры гэтым гады дысбалансаў настолькі трывала заселі ў свядомасці беларусаў, што ператварыліся ў фобію, а падтрыманне збалансаванасці з'яўляецца сініцай у руках і, па сутнасці, галоўнай мэтай апошніх чатырох гадоў. На маё глыбокае перакананне, гэтая філасофія ніяк не адпавядае ні чаканням грамадства, ні задачам, якія ставіць кіраўнік дзяржавы. Таму сёння, напярэдадні работы над прагнозам на наступную пяцігодку і работы над Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця да 2035 года, стаяць новыя мэты. Ад навукоўцаў чакаюцца рэальныя рэцэпты пераўтварэнняў, якія былі б гарманічна ўплецены ў менталітэт грамадства, яго гатоўнасць да іх і якія адпавядалі б нацыянальным прыярытэтам і прынцыпам».*

# «СОНЕЧНЫ» СЛОН



**Скульптуры трох вясёлых слонікаў, якія сімвалізуюць моцную сям'ю — бацькоў і іхняе дзіцяня, стаяць на тэрыторыі дзіцячага садка-яслаў № 1 «Сонейка» ў горадзе Сянно. Выхаванцы садка з ахвотай гуляюць з вушастымі насельнікамі двара. Нашаму фотакарэспандэнту Анатолю КЛЕШЧУКУ яны пазіравалі, з усіх бакоў абступіўшы «тату-слана».**

## КОРАТКА

• У Беларусі ў летніх лагерах працы і адпачынку дзеці змаглі зарабіць па Br100—300.

**• У Асіповічах і Браславе абсталявалі новыя футбольныя палі са штучным пакрыццём.**

• У Верхнядзвінску 38-гадовы мужчына выкраў у знаёмай пярсцёнак і збег. Дзяўчына звярнулася ў міліцыю, мужчыну затрымалі ў Полацку, з дапамогай флюараграфіі пярсцёнак знайшлі ў яго страўніку.

Камунальныя стасункі

# ТЭМПЕРАТУРА БАТАРЭІ — 38 °С



59.ru

## У кватэрах рэжым прапальвання, а не адключанае ацяпленне

**Напачатку сёлетняга асенне-зімовага сезона, калі раптам пачаліся нават нечаканыя ў гэтую пару замаразкі, а не толькі халады, ваду ў батарэі ацяплення пусцілі з тэмпературай каля 55 °С. У жыллі пацяплела, а неўзабаве раптоўна настала бабіна лета, і ў кватэрах стала горача. Пасля амаль тыдня перагрэву, калі ў кожнай трэцяй кватэры было ледзьве не 30, батарэі ў памяшканнях нарэшце пераcталі «жарыць» — вада ў іх цяпер 38 °С. Хоць навобмацак здаецца, што яны зусім халодныя, гэта не так — прылады перайшлі ў рэжым прапальвання. Ці лёгка было гэта зрабіць, і ад каго гэта залежыць?**

### АЎТАМАТЫКА ЦІ ЧАЛАВЕК?

Адказвае за наладжванне тэмпературнага камфорту ў жыллі сістэма аўтаматычнага рэгулявання (САР). Яна складаецца з праграмнага забеспячэння, спецыяльнага блока кіравання і клапана, які і рэгулюе падачу цепланосьбіта ў ацяпляльныя прыборы кватэр. Аўтаматыка вызначае градус гарачай вады ў залежнасці ад тэмпературы на вуліцы. Раніцай яна павінна паддаваць жару, а днём прыпыняць нагрэў. Гэта ў ідэале. На справе ж аўтаматыка застаецца ўсяго толькі абсталяваннем, і часта наладжваць яе работу прыходзіцца ўсё роўна чалавеку. А вось спецыялістаў, што маюць права на работу з такой сістэмай, няшмат. Адсюль і перапальванні, і доўгае чаканне паратунку ад спёкі.

СТАР. 3

Разумныя грошы

# «Узяць крэдыт і пакрасавацца куды важней, чым трацiць з толкам»

## АЛЕ МЫ Ж НЕ ТАКІЯ?

**Даўгі беларусаў па крэдытах перасягнулі чарговую псіхалагічную адзнаку. На першае верасня насельніцтва завінавацілася банкам 13 мільярдаў 72 мільёны рублёў. Пра гэта сведчыць статыстыка Нацбанка на гэтую дату. У аналітыку ўключаюць у тым ліку спажывецкія крэдыты, пазыкі на куплю жылля і аўтамашыны, а таксама карты растэрміноўкі.**

Запазычанасць насельніцтва па спажывецкіх крэдытах на пачатак восені склала 5 мільярдаў 123,4 мільёна рублёў. Гэта на 125,1 мільёна рублёў больш, чым месяцам раней. Фінансавыя інстытуты краіны могуць зрабіць больш жорсткімі правілы выдачы спажывецкіх крэдытаў. Такую магчымасць дапускае Нацбанк. Гэта можа адбыцца ў выпадку паскарэння тэмпаў крэдытавання. Пры гэтым на бягучы момант змяненне інструментаў пазыковай нагрузкі не плануецца.

Банкі атрымалі рэкамендацыі па методыцы разліку сярэднямесячнага плацяжу па авердрафтных крэдытах, у тым ліку па картах растэрміноўкі, а таксама крэдытных лініях. Акрамя таго, пры ацэнцы крэдытаздольнасці фізічных асоб і разліку паказчыка пазыковай нагрузкі банкам рэкамендуецца выкарыстоўваць звесткі аб запазычанасці па камунальных плацяжах і іншых паслугах, якія змяшчаюцца ў АРІП, а таксама аб растэрміноўках у прадпрыемствах гандлю і сэрвісу.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X
19199

# ДУХОЎНАСЦЬ, ГІСТОРЫЯ, ЭКАНОМІКА...

## У Палацы Незалежнасці абмеркавалі агульнае мінулае і будучыню Беларусі і Наўгародчыны

**Члены дэлегацыі Наўгародскай вобласці, што гэтымі днямі наведваюць Беларусь, прызнаюцца: перад ад'ездам землякі па-добраму ім зайздросцілі і прасілі пацiснуць руку Аляксандру Лукашэнку. У госці ж наўгарадчане прыехалі не з пустымі рукамі: пасля сустрэчы з Прэзідэнтам стала вядома, што расійская вобласць мае намер да 500-годдзя Жыровіцкага манастыра адліць у падарунак абіцелі тры званы.**

Аляксандр Лукашэнка назваў візіт губернатара Наўгародскай вобласці Расіі Андрэя Нікіціна добрай магчымасцю пазнаёміцца з нашай краінай, ацаніць яе эканамічны і прамысловы патэнцыял, па-новаму зірнуць на перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва.

«Вы ведаеце, што я вельмі вялікую ўвагу аддаю супрацоўніцтву Беларусі з рэгіёнамі Расіі. Шчыра кажучы, некаторыя СМІ насцярожвае, што мы часта маем зносіны з кіраўнікамі рэгіёнаў. Павінны вам сказаць, што тут ніякай канспіралогіі», — расставіў кропкі над «і» Прэзідэнт. Ён прапанаваў госцю ставіцца да пэўнай інфармацыі, якую можна прачытаць у некаторых тэлеграм-каналах, як да выдумкі, якой яна і з'яўляецца.

У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў сапраўдную «рэвалюцыю», якая паднялася ў расійскіх СМІ ў сувязі з затрыманнем, што нібыта мела месца, у Беларусі грамадзянкі Расіі, якая трапіла пад санкцыі па справе аб «умяшанні ў выбары прэзідэнта ЗША».

«Трэба разумець, што мы практычна дзейнічаем як на тэрыторыі адной дзяржавы ў падобных выпадках. Што Расія ў адносінах да нашых грамадзян, што мы ў адносінах да расійскіх. І тут не можа быць ніякіх іншых варыянтаў, як абарона інтарэсаў Расіі і грамадзян Расійскай Федэрацыі. Таму накручваць там чагосьці, што ў Беларусі затрымалі і гэтак далей...», — адназначыў беларускі лідар. «А як інакш? Вось у нас адзіная сістэма. Чалавека, які прыбывае ў Беларусь, засяляецца, — мы ж IT-краіна — у камп'ютары высвечваецца прозвішча чырвоным шрыфтам. Гэта значыць ён знаходзіцца пад нечай увагай. Я вобразна кажу: чырвоны колер — паглядзелі, такі-такі чалавек... Што трэба зрабіць? Разабрацца. Можа быць, чалавек здзейсніў забойства, яшчэ нешта. Мы ж не ведаем, мы бачым толькі прозвішча. Вось мы і ўдакладнялі, што да чаго. Калі мы ўбачылі, што нібыта нехта ўмешваўся ў амерыканскія выбары, то пасля гэтага размовы не было», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што «накрутка» пачалася з боку расійскіх СМІ, бо на тэрыторыі Беларусі падобных каналаў няма.

«Праўда, адзін наш апанент, вельмі сур'ёзны, што мяне здзівіла, сказаў: слухайце, а як беларусы мусілі зрабіць? Павінны былі высвятліць, што гэта за чалавек. А тое, што яна будзе адпушчана, не выклікае сумнення». Так ён сказаў да таго, як высветлілі ўсе абставіны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка і меркаванне, што з расійскага боку падобны выпадак мог быць «лакмусавай» паперкай, каб праверыць Беларусь на стаўленне да Расіі.

«Калі гэта так у кагосьці, то гэта глупства несусветнае. Нам гэта не трэба. Трэба вось так супрацоўнічаць: прыехаў губернатар... Я пры падрыхтоўцы гэтай сустрэчы паглядзеў, у якіх сферах мы можам супрацоўнічаць. Ва ўсіх», — сказаў беларускі лідар.

«Ведаем, што элементарна — накарміць людзей і апрануць. Тады не развалiцца ні Расія, ні Беларусь. Мы ж Савецкі Саюз развалілі, як я часта кажу, з-за пральных парашкоў. Бедныя жанчыны (ажно перад вачыма ў мяне) стаялі ў чарзе суткамі, каб купіць пральны парашок. А імпартныя — ну гэта ўвогуле мара была! Дык што, мы не маглі ў Савецкім Саюзе пяць-дзесяць фабрык пабудаваць? Ды за паўтара года пабудавалі б і забяспечылі народ. Але ніхто гэтым не займаўся. Яны далёкія былі, кіраўнікі нашы, ад гэтага. Вось космас, нейкую стрэльбу новую вынайсці — так. А займацца жыццём людзей ніхто не жадаў. Таму вось наша сфера, дзе мы можам з рэгіёнамі Расіі працаваць», — выказаў меркаванне Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, Беларусь гатовая падзяліцца досведам у развіцці сельскай гаспадаркі. «У жывёлагадоўлі, племянной справе, вырошчванні агароднінных культур, аснашчэнні малочнатаварных ферм у нас досвед вялікі. Калі будзе зацікаўленасць, па сходнай цане можам пабудаваць і аснасціць», — прапанаваў наўгародскаму губернатару Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што адносіны Беларусі і Расіі захаваныя менавіта дзякуючы стасункам паміж рэгіёнамі, нягледзячы на складанасці, якія ўзнікалі з пастаўкамі газу, нафты. І пытанні, якія існуюць, будуць вырашаныя.

«Нам нельга згубіць адно аднаго. Ні ў якім выпадку. Што, у вас ёсць больш блізкі саюзнік, чым Беларусь? Больш блізкай краіны за Расію ў нас таксама няма. Таму мы павінны супрацоўнічаць», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што і Беларусь мусіць у рэгіёне бачыць сваіх суседзяў: Украіну, Польшчу, краіны Балтыі, Еўрапейскі саюз. Аляксандр Лукашэнка заклікаў не глядзець на Беларусь як на ворага, які адвярнуўся спінай да Расіі.

«Гэтага ніколі не было і не будзе. Нас асабліва там не чакаюць, бо перашкодай для гэтага з'яўляецца нават не дыктатура Лукашэнкі, а эканоміка. З нашай эканомікай у Еўрасаюзе мы нікому не патрэбныя! Таму што там машынабудаванне не горшае за нашае (усё, акрамя БелАЗаў). Усё астатняе вырабляюць: і малако, і мяса, і іншае. І на рынак нас ніхто не пускаў і не пусціць. Я ўвесь час іх за гэта крытыкую, хоць у нас прадукцыя, і яны гэта прызнаюць, нашмат лепшая па многіх параметрах», — падкрэсліў беларускі лідар.

Але ён не стаў хаваць, што ў гэтым плане намеціліся праблемы і з Расіяй. Праўда, у іх вырашэнні кіраўнік Беларусі ўпэўнены — тут, па меншай меры, гаворка ідзе на адной мове.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што асабіста ўдзел губернатараў — краевугольны камень у наладжванні адносін. Калі кіраўнік зацікаўлены, справы будуць паляпшацца. Асабліва важна, што Наўгародчына і Беларусь зацікаўлены не проста ў развіцці гандлю, але ў пашырэнні кааперацыйных сувязяў.

«Мы разлічваем на ваша садзейнічанне ў пытаннях удзелу нашых будаўнікоў у вас... Я калісьці прасіў кіраўнікоў рэгіёнаў: калі беларусы да вас ідуць, вы дайце нам добры аб'ект альбо квартал, каб вы бачылі беларускі досвед у будоўлі. Каб насельніцтва бачыла, што беларусы прыехалі, пабудавалі гэты аб'ект. Гэта наш твар. Хочам і гэтымі аб'ектамі прысутнічаць у рэгіёнах Расійскай Федэрацыі», — прапанаваў госцю Прэзідэнт.

Таксама ён нагадаў, што яшчэ з савецкіх часоў Беларусь моцная машынабудаваннем. Цяпер у краіне выпускаецца шырокая лінейка грузавой, дарожнай, камунальнай і будаўнічай тэхнікі. Наўгародцам таксама прапануюць сучасныя аўтобусы МАЗ з рознымі тыпамі рухавікоў і тралейбусы з павялічаным аўтаномным ходам. Упэўніцца ў іх экалагічнасці і эканамічнасці госці могуць на свае вочы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу госця, што галоўная наша мэта — паглыбленне эканамічных кантактаў, двухбаковага ўзаемадзеяння. Будзе інтарэс у эканоміцы — усё астатняе дадасца. Беларускі лідар запрасіў губернатара Наўгародскай вобласці прыязджаць часцей, паабяцаў усялякую дапамогу і падтрымку.

У сваю чаргу Андрэй Нікіцін перш за ўсё падзякаваў за славутую беларускую гасціннасць. Па перакананні губернатара, у гісторыі Беларусі і яго рэгіёна ёсць па меншай меры дзве нязменныя рэчы. Адна з іх — памяць пра Вялікую Айчынную вайну. «На Наўгародскай зямлі зарадзіўся пошукавы рух, зараз у ім актыўна ўдзельнічаюць у тым ліку атрады з Беларусі. Штогод прыязджае атрад з Брэста. Толькі за апошнія гады адшукалі каля 80 чырвонаармейцаў, народжаных на Беларусі, у наўгародскіх лясах і балотах. Сёлета пошукавікі знайшлі ўраджэнца Гомельскай вобласці Івана Іванавіча Зарэцкага. 8 мая, напярэдадні 75-годдзя Перамогі, яго астанкі будуць урачыста пахаваны на Наўгародскай зямлі», — паведаміў Андрэй Нікіцін. Ён выказаў перакананне, што такую гістарычную сувязь не парушыць ніякімі тэлеграм-каналамі і нічым іншым. Гэтая сувязь — назаўсёды.

Як і Сафія Наўгародская з Сафіяй Полацкай — аснова і фундамент усёй нашай гісторыі. Гэта тое, што немагчыма адмяніць і неяк перайначыць, упэўнены губернатар. Адзначыў ён і актыўнае супрацоўніцтва Наўгародскага і Полацкага музеяў.

«Ведаю, што вы нядаўна з нашым прэзідэнтам на саміце СНД гаварылі пра неабходнасць сумесных прарыўных праектаў. Наўгародская зямля гатовая быць адным з удзельнікаў такіх праектаў. Вось ужо нашы наўгародскія аграрыі прагаласавалі за беларускую тэхніку, не чакаючы ніякіх камандаў з нашага боку. Ужо, напэўна, больш за 50 працэнтаў тэхнікі — беларуская. Працэнт гэты расце», — праінфармаваў прэзідэнта Андрэй Нікіцін.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# ШТО НАРАДЖАЕ ПРАБЛЕМУ?

**З гэтым пытаннем спрабаваў разабрацца памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску Віталь ПРЫМА на прыёме грамадзян у адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы.**

«Падчас такіх прыёмаў неабходна не толькі зразумець сутнасць праблемы, але і яе першапрычыны», — лічыць ён. Памочнік Прэзідэнта стараўся выслухаць абодва бакі: ведаць пазіцыю і грамадзяніна, і мясцовых уладаў.

Вялікі рэзананс выклікала пытанне з капрамонтам дамоў № 18, 20, 22 па вуліцы Калініна, які цягнецца з 2015 года. Па словах жыхароў, у гэтых дамах неабходны абнаўленне і рамонт сістэмы ацяплення — за чатыры апошнія гады адбылося сем аварый. Аднак гэты від работ не ўключаны ў праект капрамонту з мэтай эканоміі. Як варыянт вырашэння праблемы жыхары прапануюць матэрыяльнае пакрыццё за няякасныя матэрыялы і работу.

Яшчэ адно вострае пытанне — недахоп парковачных месцаў. У двары названых дамоў ёсць участкі, дзе пешаходы вымушаны перамяшчацца ў зоне руху аўтамабіляў з шасці напрамкаў. Віталь Прыма даручыў пракантраляваць выкананне графікаў работ па капітальным рамонце, разабрацца з недахопамі, прапрацаваць пытанні абмежавання руху аўтамабіляў і абсталяваць ходнікі.

З прапановамі з нагоды парковак да інспектара па Мінску звярнуліся прадстаўнікі ТАА «Белспецаўтаэвакуацыя». У кампаніі распрацавалі інавацыйны прадукт для электроннага ўліку транспартных сродкаў, якія не эксплуатуюцца. База даных дапаможа ўкараніць у сталіцы адзіны інфармацыйны падыход. Віталю Прыму такая ініцыятыва спадабалася, аднак канчатковае рашэнне застаецца за гарадскімі ўладамі.

У іншай сітуацыі з рашэннем таварыства ўласнікаў спісваць з жыхароў узносы на ўладкаванне і ўтрыманне шлагбаума не пагадзілася адна з членаў таварыства ў Ленінскім раёне. Жанчына лічыць, што такія меры з'яўляюцца парушэннем заканадаўства, а платная паслуга — навязаная.

Усяго за час прыёму да памочніка Прэзідэнта паступіла 16 пытанняў. Абмяркоўваліся ў тым ліку тэмы падзелу зямельных участкаў і перанясення іх межаў, атрымання льгот па аплаце ЖКП, пазбаўлення бацькоўскіх правоў, праблемы даўгабуду.

Па словах Віталя Прымы, практыка паказвае, што за адзін раз вырашыць праблему падчас прыёму немагчыма. Бываюць выпадкі, калі некаторыя пытанні разглядаюцца па два-тры разы. «Ёсць некаторыя пытанні, па якіх існуюць розныя меркаванні аб прымяненні законаў. Наша задача — выпрацаваць адзіны пункт гледжання і вызначыцца з варыянтам вырашэння праблемы або ўнесці прапановы на заканадаўчым узроўні, як такую праблему можна вырашыць», — падвёў вынікі гутаркі з мінчанамі памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску.

**Паводле БелТА.**

## На пытанні будуць адказы

**У гэтую суботу з 9 гадзін раніцы да 12 дня ў аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме адбудуцца традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання з насельніцтвам. Можна тэлефанаваць па пазначаных ніжэй нумарах, і вам дадуць адказ на пытанні, якія вас хвалююць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч Рабкавец. Тэл.: 80162213121;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч Сысоеў. Тэл.: 80212222222;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч Прывалаў. Тэл.: 80232331237;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алёйзавіч Жук. Тэл.: 80152735644;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч Варонін. Тэл.: 80222501869;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч Гурыновіч. Тэл.: 80175004160;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч Дараховіч. Тэл.: 80172224444.

www.girza.by



Рассекатели веток «СЕКАЧ» и щепорезы «ДРОБНЯК» для переработки древесных отходов в дешевое топливо под пиролизные и твердотопливные котлы, камины, печи.

Производим и поставляем продукцию согласно запросу каждого клиента.




Работаем по всей территории РБ.

УНП 691586696



Тел. 8(029) 675 18 75

Надвор'е

# Амаль на 10 градусаў вышэй за норму!

**Анамальна цёплы кастрычнік працягваецца.**

Цёплае надвор'е захаваецца ў нашай краіне і ў наступныя выхадныя дні, і ў пачатку наступнага тыдня, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Здаралася б, нашых сіноптыкаў здзівіць цяжка, але і яны сёння ўражаныя. Напрыклад, 16 кастрычніка стала незвычайна цёплым — сярэднясутачная тэмпература яго на 6—9 градусаў вышэй за кліматычную норму. Максімальная тэмпература паветра знаходзілася ў межах плюс 17—23, а мінімальная тэмпература паветра ўначы дасягала 12 цяпла.

Заўтра ўдзень надвор'е ў краіне будуць вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску і цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы. Будзе воблачна з праясненнямі. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 да плюс 12 градусаў, а максімальная ўдзень будзе ў дыяпазоне 13—20 цяпла, на поўдні краіны да плюс 22 градусаў. У нядзелю надвор'е ў краіне будзе вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску і цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы. Таму цёплыя рэчы адкладзём на потым. У гэты дзень нябесная канцылярыя зноў збіраецца біць рэкорды па цеплыні. Крыху павысіцца тэмпература паветра ўначы, калі будзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, а максімальная ўдзень стане амаль як летам — ад плюс 15 да плюс 21 градуса, на паўднёвым захадзе краіны паветра разагрэецца да плюс 23 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ТЭМПЕРАТУРА БАТАРЭІ — 38 °С

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Калі на вуліцы +8 °С, вада ў батарэі павінна быць, напрыклад, 41 °С. Цяпер надвор'е цяплейшае — і цепланосьбіт награваецца не больш за 38 °С — да так званай тэмпературы прапальвання. Калі памацаць батарэю, то можна адчуць, што яна не зусім халодная, а ледзь цепліца, значыць, сістэма працуе, — расказаў **Аляксандр АСТРОЎСКІ, галоўны інжынер ЖЭУ № 4 Заводскага раёна Мінска** (на прыкладзе гэтай арганізацыі мы высвятлілі пагляддзець, як усё працуе). — Сезон толькі пачаўся, праводзяцца рэгламентныя работы. А ў нашым ЖЭУ, якое абслугоўвае 90 дамоў, адзін спецыяліст, адказны за работу САР. Рэгулятары ў праграме могуць і збіцца недзе падчас работы, гэта здараецца штогод. Каб наладзіць яе і настроіць на бесперабойны рэжым, неабходна ўмяшальніцтва інжынера кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі (КВПіА). Паспець зрабіць гэта своечасова ва ўсіх дамах ён фізічна не зможа. А хаус-майстры на такія работы не маюць права.

## ГРАДУС У РЭАЛЬНЫМ РЭЖЫМЕ

З кацельнай вада прыходзіць у дом з тэмпературай 61 °С. Каб паменшыць градус у батарэях, САР змешвае гарачы цепланосьбіт з адпрацаванай вадой, якая ўжо вяртаецца з батарэі назад у сістэму. Хуткасць руху вады, адпаведна, крыху замаруджваецца, яна хутчэй астывае і ў батарэі ўжо трапляе з меншымі градусамі. Калі адпрацаваны цепланосьбіт, дарэчы, астывае больш чым да +35 °С, значыць, ён не аддаў запланаванае цяпло ў батарэі, і праблему трэба вырашаць, кажуць камунальнікі.

Яны заспакойваюць жыхароў, што рэжым прапальвання застанецца, пакуль на вуліцы цёпла. Прынамсі, як паказвае прагноз, да наступнага аўторка, калі толькі надвор'е рэзка не сапсуецца. Аўтаматыка ўжо будзе больш аператыўна рэагаваць на паніжэнне градуса і награваць ваду ў батарэях вышэй, бо інжынер-КВПіА ўжо настроіў яе.

— Вядома, збоі ўсё роўна могуць здарыцца, і зноў прыйдзецца наладжваць сістэму ўручную, таму і сочым штодня, — кажа Аляксандр Астроўскі. — Ёсць дамы, дзе сістэму ўключаеш, і яна аўтаматычна ўвесь сезон адпрацоўвае без праблем, а ёсць такія, дзе лепш раз на месяц стабільна правяраць работу праблемных прылад. Чым гэта абумоўлена? Мажліва, тэрмінамі эксплуатацыі, а недзе, магчыма, рэгламентныя работы па тэхабслугоўванні праводзіліся няякасна.

Нагадаем, што сочаць за тэмпературнымі параметрамі ў дамах у рэжыме рэальнага часу камунальнікі Заводскага раёна з дапамогай спецыяльнай праграмы INDEL — сістэмы дыстанцыйнага здымання паказчыкаў, да якой падключаны ўсе групавыя прыборы ўліку і сістэмы рэгулявання. Аднак і тут здараюцца хібы, напрыклад, няма сувязі з домам.

**Ірына СІДАРОК.**

# Пустэльнік выходзіў на «справу»

**Следчыя органы разбіраюцца з жыхаром Рагачоўскага раёна, якога праваахоўнікі на пэўны час згубілі, а праз шэсць гадоў знайшлі ў лесе жывым, праўда, трохі здзічэлым.**

Яшчэ ў 2013 годзе грамадзяніна сталі падазраваць у здзяйсненні шэрагу крадзяжоў, паведаміла **прэс-сакратар МУС Беларусі Вольга ЧАМАДАНАВА.** Дачы і вясковыя хаты мужчына «чысціў» на радзіме, у Рагачоўскім раёне. У момант, калі супрацоўнікі міліцыі выйшлі на яго след, ён раптам знік. Дарэчы, і крадзяжы на некаторы час спыніліся. Але праз некалькі месяцаў з прыватных дамоў зноў пачалі знікаць прадукты, посуд, адзенне, бытавая хімія, батарэйкі, ліхтарыкі. Аператыўнікі па наборы гэтых прадметаў здагадаліся, што зладзюжка жыве недзе ўдалечыні ад цывілізацыі.



Між тым і лес вочы мае. Адзін з паляўнічых паведаміў мясцоваму ўчастковаму, што бачыў у зарасніках дзіўнаватага мужчыну з роварам. Месца было не грыбное, таму міліцыянер вырашыў праверыць лясны гушчар. У яго глыбіні ўчастковы інспектар патрапіў на збудаванне з бярвення, перакладзенага мохам, дах якога быў пакрыты рэкламным поліэтыленам.

У пабудове на ложку спаў чалавек у бушлаце і шапцы. Пасля абуджэння ўчастковы пазнаў у ім вяскоўца, якога на працягу апошніх гадоў вышуквалі за крадзяжы. Там мужчына расказаў, што вырашыў схавацца пасля таго, як даведаўся, што ім зацікавіліся аператыўнікі. Спачатку ён збег у Расію, дзе нелегальна працаваў. Але калі наймальнік ашукаў яго і не заплаціў грошай, давялося вярнуцца на радзіму.

За краты не хацелася, таму стаў пустэльнікам. Пабудаваў у лесе халупу, забяспечваў сябе самым неабходным за кошт начных крадзяжоў. Ежу варыў на газавай гарэлцы і вогнішчы, а жыллё асвятляў выкрадзенымі ліхтарыкамі і свечкамі. Слухаў радыёпрыёмнік і толькі зрэдку выходзіў на бераг Дняпра, каб пагутарыць з рыбакамі.

Цяпер у адносінах да 53-гадовага грамадзяніна ўзбуджаны крымінальныя справы па частцы 2 артыкула 205 Крымінальнага кодэкса Беларусі «Крадзеж». Вядома больш чым пра 40 эпізодаў злачыннай дзейнасці мужчыны ў Рагачоўскім і Жлобінскім раёнах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Фота прадстаўлена прэс-службай УУС Гомельскага аблвыканкама.**

Чулі?

# Беларуска прадставіць на конкурсе прыгажосці... Нігерыю

**На міжнародным конкурсе «Міс свету Plus Size», які пройдзе 5—10 лістапада ў Кіеве, удзельніца беларускага адбору мулатка Ванеса Морская-Умене прадставіць радзіму свайго бацькі — Нігерыю.**



Гэтую ідэю 23-гадовая дзяўчына з інтэрнацыянальнай сям'і прапанавала арганізатарам сама. «Я з дзяцінства разумела, што жыву як быццам у двух светах: у паўднёвым, дзе вітаюцца пышныя формы, і ў паўночным, дзе яны лічацца, хутчэй, праблемай. А я люблю сваё цела — значыць, і ўспрымание ў мяне не беларускае, а афрыканскае. І хоць характарам я больш падобная да мамы, але знешне, скажам шчыра, якая з мяне беларуска? Хоць у народным беларускім строі я танцавала!» — смяецца Ванеса. А нацыянальны дырэктар конкурсу, вядомая мадэль Яўгенія Цюленева, якая два гады таму ўвайшла ў топ-5 лепшых на конкурсе «Міс свету Plus Size» ў Сінгапуры, дадае, што беларуская каманда аднеслася да ідэі з разуменнем і без крыўдаў, таму працягне падтрымліваць дзяўчыну, бо грамадзянства ў яе ўсё ж беларускае. Больш за тое: калі Ванеса пераможа ў міжнародным конкурсе, карона прыедзе ў Беларусь, а Мінск атрымае правы стаць гаспадаром форуму прыгажосці ў 2020-м.

Нагадаем, праект «Міс Беларусь Plus Size» прайшоў у нашай краіне ўпершыню, да ўдзелу ў ім запрашаліся дзяўчаты ад 20 да 40 гадоў і з памерам адзення не меншым за 46-ы. Арганізатары атрымалі 146 анкет з усіх куткоў краіны, з якіх у працэсе вочнага кастынгу і папярэдніх конкурсаў выбралі 20, 10 і, нарэшце, пяць наймацнейшых канкурсантак. Менавіта яны прадстаўляць нашу краіну на міжнародным конкурсе прыгажосці, не абмежаваный «стандартнымі» параметрамі і рамкамі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**Фота прадстаўлена арганізатарамі.**

Як нас дураць

# ЖЫЦЦЁ НЕ НАВУЧЫЛА...

**Ужо колькі разоў, у тым ліку і праз друк, супрацоўнікі Следчага камітэта, міліцыі, банкаўскія работнікі заклікаюць нашых грамадзян не верыць абяцанням хуткага і лёгкага заробку і не ўкладваць грошы ў гандаль на сумнiўных віртуальных пляцоўках. Але ашуканцы ў гэтай сферы працягваюць паспяхова абладжваць свае справы, узяўшы на ўзбраенне ці то фінансавую неадукаванасць, ці то простае жаданне хуткай нажывы грамадзян.**

Вось і сёння Гомельскім гарадскім аддзелам Следчага камітэта ўстанаўліваюцца абставіны махлярства ў сферы біржавога гандлю на віртуальнай пляцоўцы.

Як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА,** жыхарка Гомеля (69-ці гадоў, кабета з жыццёвым вопытам), жадаючы паўдзельнічаць ў біржавым гандлі, зарэгістравалася на інтэрнэт-рэсурсе гандлёвага брокера. Паводле інструкцыі, якая паступіла ёй на мабільным тэлефоне ад «менеджара» інтэрнэт-рэсурсу, жанчына пераявла са сваёй банкаўскай аплатнай карты на рахунак электроннага кашалька папулярнай аплатнай сістэмы больш за 17 тысяч расійскіх рублёў (каля 541 беларускіх). Пасля гэтага на яе віртуальным рахунку на інтэрнэт-рэсурсе адлюстравалася залічаная сума ў 240 долараў ЗША. Праз некаторы час, нібыта ў выніку паспяховага біржавога гандлю, праведзенага асабістым «менеджарам» гамяльчанкі, сума на яе рахунку значна павялічылася.

Пасля гэтага акрыленая такім поспехам жанчына пераявла на ўказаны рахунак яшчэ больш за 10 тысяч беларускіх рублёў. У яе асабістым віртуальным кабінеце адлюстравалася сума ў 5 тысяч долараў ЗША, якая праз пару месяцаў павялічылася больш чым у два разы.

Калі жанчына вырашыла вывесці грошы на сваю рэальную банкаўскую картку, другі невядомы «работнік» інтэрнэт-рэсурсу паведаміў ёй аб неабходнасці аплаціць розніцу ў курсах крыптавалют і розныя камісіі. У выніку гамяльчанка пераявла на названыя ёй рахункі грашовыя сродкі ў агульнай суме больш за 36 тысяч беларускіх рублёў. Аднак... грошы на яе картку так і не паступілі. Пасля чаго жанчына звярнулася ў міліцыю.

Следчымі ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле «Махлярства» ў асабліва буйным памеры. Вярнуць стрaчанае, аднак, будзе няпроста.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Moody's спрагназавала, хто выйграе прэзідэнцкія выбары ў ЗША ў 2020 годзе

Агенцтва Moody's Analytics апублікавала ўласны прагноз выбараў прэзідэнта ЗША 2020 года. Згодна з ацэнкай аналітыкаў, дзеючы амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп атрымае перамогу. Прычым дзве з трох прадстаўленых мадэляў аддаюць Трампу больш упэўненую перамогу ў параўнанні з вынікамі кампаніі 2016 года. Прагнозы Moody's на амерыканскіх выбарах вызначаліся высокай дакладнасцю. Варта адзначыць, што ўсе мадэлі агенцтва прадказваюць перамогу Трампа, нават у тым выпадку, калі да канца 2020 года эканоміка ЗША ўпадзе да шматгадовых мінімумаў, а фондавы рынак абваліцца на 9 працэнтаў. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што аналітыкі Moody's выходзяць з таго, што цяперашні гаспадар Белага дома не будзе адхілены ад пасады і дапрацуе цалкам свой першы прэзідэнцкі тэрмін.

## Італія змагаецца з ценявой эканомікай



211 мільярдаў еўра склаў абарот ценявой эканомікі Італіі за 2017 год, паведаміў Euronews. Амаль палова значнай сумы сканцэнтравана ў сектарах гандлю, транспарту і арганізацыі грамадскага харчавання, а 19 мільярдаў еўра былі атрыманы ад незаконнай дзейнасці — такой, як наркагандаль або прастытуцыя. Пра гэта паведаміла Нацыянальная італьянская служба статыстыкі ISTAT. 211 млрд еўра — гэта больш чым 12 працэнтаў аб'ёму валавога ўнутранага прадукту Італіі. Асноўная частка прадукцыі ценявой эканомікі — дабаўленая вартасць, якая выпрацоўваецца з выкарыстаннем нелегальнай рабочай сілы і застаецца незадэклараванай. Паводле звестак Еўракамісіі, у Італіі найбольшы ў ЕС разрыў паміж запланаванымі і атрыманымі паступленнямі ад ПДВ (падатку на дабаўленую вартасць) — 33,6 млрд еўра. А ўсяго ў 2017 годзе эканоміка ЕС недаатрымала такім чынам 137,4 млрд. Цяперашні італьянскі ўрад рыхтуецца ўвесці ў бюджэт меры для барацьбы з ухіленнем ад выплаты падаткаў — такія, як заахвочванне выкарыстання лёгка адсочваемых крэдытных картаў замест непразрыстых грашовых аперацый і санкцыі для рознічных прадаўцоў і пастаўшчыкоў паслуг, якія працуюць «міма касы».

## Улады Малі прадоўжылі на год рэжым надзвычайнага становішча

Рэжым НС прадоўжаны ў сувязі з пагрозамі з боку тэрарыстаў і экстрэмістаў. Пра гэта паведаміла агенцтва France Presse. Асаблівыя паўнамоцтвы ў рамках рэжыму надзвычайнага становішча дазволяць органам бяспекі эфектыўна процідзейнічаць узброеным баевікам на ўсёй тэрыторыі краіны. Як вядома, узброены канфлікт у гэтай афрыканскай краіне паміж урадавымі войскамі і баевікамі розных груповак разгарэўся ў пачатку 2012 года. Шмат у чым ён быў справакаваны абвастрэннем абстаноўкі ў Лівіі пасля звяржэння рэжыму Муамара Кадафі.

# «Узяць крэдыт і пакрасавацца...»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб стрымаць крэдытны бум, Нацбанк увёў з 1 мая мінулага года новыя правілы выдачы банкамі пазык насельніцтву. Банкі сталі лічыць для патэнцыйных пазычальнікаў каэфіцыент пазыковай нагрузкі. Аднак, нягледзячы на гэтыя меры, як паказвае статыстыка, рост запазычанасці насельніцтва перад банкамі працягваецца. Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што хапае сярод беларусаў і людзей, якія ні разу ў жыцці не бралі крэдыт або растэрміноўку. Прычым гэтыя людзі далёка не школьнікі. Ці можна пражыць не ў доўг? Пра гэта мы спыталі менавіта ў іх.

## ГІСТОРЫЯ № 1

Жыхару горада Лепеля Віцебскай вобласці Сяргею 35 гадоў. Ён працуе ў сферы вытворчасці. Мужчына жанаты, сыну зараз чатыры гады. Штомесячны даход сям'і цяпер складае 1300 рублёў.

— Падрабязную статыстыку па тратах не вяду, але прыкладны расклад наступны: «камуналка», інтэрнэт і сувязь — 140 рублёў, тавары для дзіцяці — 300—400 рублёў, бензін — 100 рублёў, наша харчаванне — 250—400 рублёў. Усё астатняе — па сітуацыі.

Ні растэрміновак, ні крэдытаў ён ні разу ў жыцці не браў, нават калі трэба было абзаводзіцца жыллём.

— Мы пажаніліся пяць гадоў таму. Вяселле рабілі за свае зарobленыя, яно выйшла ў нуль, — тлумачыць Сяргей. — І ў мяне, і ў жонкі да вяселля былі аўтамабілі. Адзін з іх мы прадалі. Праз год пасля вяселля, калі цэны знізіліся да разумных лічбаў, змаглі купіць кватэру.

Разглядалі варыянты: «слабая» двухпакаёвая хрушчоўка ці вялікая аднапакаёвая кватэра ў новабудоўлі. Першы варыянт падыходзіць для сям'і, якая плануе дзяцей. На хрушчоўку хапала і трохі заставалася. «Больш за тое, амаль усю суму, якая засталася пасля куплі кватэры, а гэта прыкладна 2500 долараў, мы здолелі захаваць». Рамонт рабілі паэтапна і толькі на тыя грошы, што зараблялі на той момант. З электрыкай дапамог бацька мужчыны, сантэхніку рабіў наёмны чалавек, столі, сцены, падлогу — ён сам. У выніку былі з кватэрай, без даўгоў і са свабоднай сумай на руках.

Пасля такога вопыту пазіцыя Сяргея жыць без крэдытаў і растэрміновак стала яшчэ больш цвёрдай.

— Самы галоўны аргумент за крэдыты, які чуеш у першую чаргу: «Мне проста шкада аддаваць усю суму адразу, а так я плачу паволі і не напружваюся». Наступны аргумент: «Я магу назапасіць на ўмоўны тэлевізар, але тады прыйдзецца чакаць некалькі месяцаў. А навошта чакаць некалькі месяцаў, калі вось проста сёння можна ім валодаць?» З імі я катэгарычна не згодны. Для сябе засвоіў наступнае. Калі расставацца з усёй сумай для мяне складана псіхалагічна, то тавар не падыходзіць мне, ці, іншымі словамі, я на яго яшчэ не зарабіў. Калі ж я гатовы аддаць адразу ўсю суму, то перыяд назапашвання грошай на куплю з'яўляецца для мяне своеасаблівым тэстам на тое, сапраўды я хачу гэтую рэч ці гэта сучасны маркетынг навязвае мне да імпульсіўнага дзеяння.

Акрамя таго, мінус растэрміноўкі я бачу ў абмежаванні магчымасці ў распараджэнні сваімі фінансамі. Ты не з'яўляешся гаспадаром сваіх яшчэ не зароблены грошай. Нават калі ты раптам зразумееш, што табе патрэбны ўмоўны тэлефон замест тэлевізара, то ў цябе два шляхі: альбо ўлезці ў яшчэ адну растэрміноўку, альбо аддаць папярэднюю і потым тут жа ўзяць наступную. Атрымліваецца замкнутае кола.

## ГІСТОРЫЯ № 2

Знаёмай маёй дачкі Ангеліне 23 гады. Па адукацыі яна сістэмны адміністратар, адпрацоўвае размеркаванне на дзяржпрадпрыемстве. Разам са сваім маладым чалавекам яны здымаюць пакой. Заробак плата ў яе сярэдняя — каля 950 рублёў.

— Недзе 300 рублёў у месяц сыходзіць на арэнду і «камуналку», яшчэ 40 — на праезд, — кажа дзяўчына. — Таму амаль палову свайго заробку я гублю ў першы ж дзень, як яго атрымліваю. Прыкладна 100—150 рублёў сыходзіць на асабістыя патрэбы. Астатнія грошы, а гэта 300—400 рублёў выдаткоўваю на ежу. Закупляюся месяцы на два наперад. У асноўным усё бяру па акцыі, асабліва прадукты, якія можна доўга захоўваць. На працягу месяца дакупляю толькі мяса (курыцу), «малочку» і агародніну (купляю на рынку раз у тыдзень).

Фактычна ўся зарплата Ангеліны сыходзіць на самае неабходнае. З заробку яе хлопца маладыя людзі адкладаюць на буйныя пакупкі, адпачынак і іншае. Імкнуцца адкласці кожны месяц 300 долараў, часам выходзіць менш, калі напярэдадні было нейкае свята.

Як чалавек, які ні разу ў жыцці не браў крэдыту, дзяўчына разглядае варыянт узяць пазыку ў банка толькі ў крайнім выпадку, калі спатрэбіцца жыллё. Паводле яе слоў, без гэтага купіць жыллё немагчыма практычна нікому.

Чаму людзі бяруць крэдыты? Першая прычына, на яе погляд, — яны хочуць выглядаць лепшымі, чым ёсць на самай справе. Бяруць крэдыт на тэлефон, бо брэнд, і не важна, што больш танныя смартфоны па якасці не саступаюць. Другая прычына — мала зарабляюць, але змяніць месца работы баяцца. Трымаюцца там, дзе стабільна.

## ГІСТОРЫЯ № 3

Майму суседу па пад'ездзе Андрэю 32 гады. Разам з жонкай і двума дзецьмі (аднаму з якіх чатыры гады, другому — год і восем месяцаў) яны жывуць у Мінску. Малады чалавек скончыў каледж, потым ВНУ і паралельна з 18 гадоў працаваў у будаўніцтве. Зараз займаецца ў кампаніі па вытворчасці дэкарацый і рэкламнай прадукцыі. Агульны даход сям'і складае 2000 рублёў на чацвярых. Асабліва за тратамі сям'я не сочыць. Але ў мужчыны ёсць некалькі правілаў, дзякуючы якім яны не залазяць у даўгі.

— Самае галоўнае — гэта максімальна рацыянальна расходаваць грошы: гатаваць дома, закупляцца раз на тыдзень, не гнацца за модай (маўляў, мусіш мець апошні iPhone, тэлевізар апошняй маркі і гэтак далей). Тэлефоны ў крэдыт наогул не прызнаю, заўсёды можна пахадзіць са старым або ўзяць таннейшую мадэль, — пералічвае ён. — Крэдыт — гэта заўсёды пераплата сродкаў. Любая рэч без крэдыту каштуе значна танней. А галоўнае, часцей за ўсё можна выкруціцца без яго, узяць нешта прасцейшае. Я наогул не разумею, як людзі могуць спакойна жыць, ведаючы, што ў іх куча плацяжоў па растэрміноўках.

Каб абыходзіцца без крэдытаў, Андрэй адкладае грошы па вызначаным правіле: «заначка» не павінна быць меншай за некалькіх сярэдніх заробкаў па краіне. На думку Андрэя, растэрміноўкі і крэдыты такія папулярныя, бо людзі хочуць усё і адразу, не лічацца са сваімі фінансавымі магчымасцямі і не задаюцца пытаннем, ці патрэбныя ім наогул апошні iPhone за 2,5 — 3 тысячы рублёў ці дарагі тэлевізар.

— Усім здаецца, што 50—150 рублёў у месяц — гэта невялікая сума і што яна не адаб'ецца на іх бюджэце. Аднак калі паглядзець кошт тавару без растэрміноўкі, часцей за ўсё, ён будзе каштаваць на 10—30 % танней. Так што гэта проста самападман.

А ўсялякія крэдыты на адпачынак — тут наогул бязмежжа. Значыць ты не адклаў неабходную суму за год, але ў крэдыт можаш сабе дазволіць? Гэта проста адсутнасць фінансавай адукаванасці і залежнасці маркетынгу. Крэдыт можна ўзяць хіба што на жыллё. Замест таго, каб здымаць у кагосьці, лепш плаціць нават крыху больш па крэдыце, але за сваё. У астатнім трэба жыць па сродках, якія ты зарабляеш, а не залазіць у будучыя даходы.

— Асноўная прычына, чаму чалавек залазіць у крэдыты і растэрміноўкі, — жаданне атрымаць усё і адразу, — лічыць Андрэй. — Не маючы дастатковага даходу, чалавек робіць дарагую пакупку — і заганяе сябе ў безграшоўе яшчэ глыбей.

## ГІСТОРЫЯ № 4

З крэдытамі ў майго знаёмага Міхаіла не атрымліваецца. Ён некалькі разоў спрабаваў афармляць іх (адзін — на куплю кватэры, другі — на спажывецкія патрэбы), але ўсюды адмаўлялі.

— Можа быць, таму, што я ў арміі не служыў. Як толькі даведваліся, што ў мяне няма на руках ваеннага білета, і адмаўлялі, — пацікаве плячыма малады хлопец.

Але Міхаіл усё роўна знайшоў выйсце — карыстаецца стандартнымі крамнымі растэрміноўкамі. Так ён узяў тэлефон, мэблю, бытавую тэхніку. Апошняя растэрміноўка — гэта тэлефон для жонкі. Штомесячны плацеж складае ўсяго 50 рублёў, выплаціць усю суму трэба за год. Да набыцця тэлефона сям'я купляла ў растэрміноўку кухонны камбайн. Стаўка была 0,0001 % , а пагасіць суму трэба было за год.

У сям'і Міхаіла ёсць правіла, каб не застацца без грошай і не патрапіць у фінансавую яму: сума растэрміновак не павінна выходзіць за памер другой зарплаты мужчыны на паўстаўкі — гэта дзесьці 200—250 рублёў. Часам бываюць нюансы: калі дзеці захварэлі або парвалі куртку і патрэбна новая, тады за рамкі ўжо выходзяць. Але тут ім бацькі дапамогуць, балазе, яны яшчэ могуць гэта зрабіць...

## ДАЛЕЙ — БОЛЬШ?

Эканамісты прагназуюць, што ў наступным годзе попыт насельніцтва на спажывецкія пазыкі захаваецца. Што датычыцца наступстваў гэтай тэндэнцыі для беларускай эканомікі, то, па словах экспертаў, рост аб'ёмаў спажывецкага крэдытавання, улічваючы выкарыстанне гэтых сродкаў у тым ліку для куплі імпартных тавараў, можа ў будучыні негатыўна адбіцца на плацежным балансе і абменным курсе беларускага рубля. У такім выпадку ўмяшанне Нацыянальнага банка проста непазбежнае. Для спажыўцоў жа ў такой сітуацыі высновa, як заўсёды, адна: пажывём — пабачым.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### У тэму

### СТРАХОЎКА — ЧЫСТА АСАБІСТАЯ СПРАВА

Навязванне страховак у дадатак да крэдытаў або павелічэнне працэнтаў па крэдыце, калі кліент адмаўляецца афарміць страхоўку, лічаца нядобрасумленнымі практыкамі, якіх банкі павінны пазбягаць. Пра гэта сказана ў лісце Нацыянальнага банка краіны на адрас камерцыйных банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый. Так што нас цяпер голымі рукамі не возьмеш.


**УП «БЕЛПАТ» – организатор торгов – ИЗВЕЩАЕТ о том, что 28.11.2019 г. в 10.00 состоятся ПОВТОРНЫЕ ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона (на повышение начальной цены) по адресу нахождения организатора: г. Минск, ул. Антоновская, 13. Тел.: 8 (017) 285 27 70, 294 41 36, 294 09 74, моб. 636 41 36.**

Торги будут проводиться в соответствии с порядком, установленным Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 по следующим лотам:

**Лот № 1. Легковой специальный автомобиль ГАЗ 2217 2 – 2006 года выпуска, 5 – МКПП, цвет – серебристый металлик, пробег 924 538 км, полная масса 2350 кг, объем двигателя 2,4 л. Автомобиль технически исправен. Начальная цена – 2158,24 руб. без НДС. Сумма задатка для участия в торгах – 215,82 руб.**

**Лот № 2. Легковой специальный автомобиль ГАЗ 2217 2 – 2006 года выпуска. 5-МКПП, цвет – серебристый металлик, пробег 518 117 км, полная масса 2350 кг, объем двигателя 2,4 л. Автомобиль технически исправен. Начальная цена – 2 158,24 руб. без НДС. Сумма задатка для участия в торгах – 215,82 руб.**

**Лот № 3. Грузопассажирский автомобиль УАЗ 39629 – 2004 года выпуска. 4-МКПП, цвет – светло-серый, пробег 106 732 км, полная масса 2500 кг, объем двигателя 2,4 л. Автомобиль технически исправен. Начальная цена – 1135,99 руб. без НДС. Сумма задатка для участия в торгах – 113,60 руб.**

**Лот № 4. Грузовой автомобиль – самосвал MUDAN MD-1042 2007 года выпуска, 5-МКПП, цвет кабины – серебристый металлик, пробег 146 108 км, грузоподъемность 3200 кг, полная масса 6000 кг, объем двигателя 2,8 л, размеры платформы 3820/1910/700 мм, колесная база 2800 мм, автомобиль технически неисправен (негерметична система охлаждения, плохо заводится), наличие коррозии на раме и бортовой платформе.**

**Начальная цена – 3729,13 руб. без НДС. Сумма задатка для участия в торгах – 372,91 руб.**

Извещение о первичных торгах было опубликовано 16.08.2019 в газете «Звязда».

Продавцом по лотам № 1 – № 4 выступает УП «БЕЛПАТ», г. Минск, ул. Антоновская, 13.

Прием заявок осуществляется по адресу проведения торгов ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме выходных и праздников) с момента настоящей публикации **до 10.00 25.11.2019 г.** включительно, здесь же ознакомление с формой заявки, договором и др. сведениями и документами. С лотами № 1 – № 4 ознакомиться можно по адресу: г. Минск, ул. Антоновская, 13 (ответственное лицо – Неборский В. С., тел. (017) 285 27 69).

**Оплата задатка производится с момента настоящей публикации до 10.00 25.11.2019 г. включительно на р/с BY76-BLBB30120100027393001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, УНП – 100027393, ОКПО – 14512784.**

С победителем торгов в течение 7 рабочих дней с момента завершения аукциона подписывается договор купли-продажи. Задаток победителя торгов учитывается при окончательных расчетах за предмет торгов по договору купли-продажи. Победитель торгов дополнительно возмещает затраты на организацию и проведение аукциона по победившему лоту в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Организатор торгов оставляет за собой право в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона, отказаться от его проведения.



## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | ООО «Дом на Передовой», г. Минск, ул. Передовая, д. 6, здание административно-хозяйственное, пом. 201 |

**Предмет аукциона**

Месторасположение: **г. Минск, ул. Передовая, д. 6**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание административно-хозяйственное** | **2390,4 кв. м** | **500/С-49451** |

***Сведения о земельных участках***: предоставлен продавцу пл. **0,0708 га** на праве аренды (срок действия по 28.02.2020) и **0,1659 га** на праве аренды (срок действия по 28.02.2054) для размещения объектов административного назначения с установленными ограничениями (охранные зоны линий электропередачи, сетей и сооружений канализации, водоснабжения теплоснабжения)

***Обременения***: частичная аренда. Подробности на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена без НДС – 1 100 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

**Аукцион состоится 20.11.2018** в 11. 00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка». Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 19.11.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, www.cpo.by. **E-mail: auction@cpo.by**



## Уважаемые акционеры ОАО «Элема»!

Настоящим сообщаем о смене депозитария ОАО «Элема» и доводим до сведения акционеров следующую информацию:

*полное наименование, юридический адрес эмитента ценных бумаг*: Открытое акционерное общество «Элема», 220033, г. Минск, ул. Тростенецкая, 5;

*полное наименование, юридический адрес, контактные телефоны депозитария, договор с которым расторгается:* Общество с ограниченной ответственностью «Промреестр», 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 16-614 (с 13.09.2019 г. – Общество с ограниченной ответственностью «Ласерта», 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 121, пом. 61), тел.: (017) 272-74-79, 200-02-72, 200-46-37;

*полное наименование, юридический адрес, контактные телефоны нового депозитария эмитента*: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал», 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6В, тел.: 209-42-59, 209-42-60;

*дата, с которой новый депозитарий эмитента приступает к учету прав на эмиссионные ценные бумаги эмитента*: **23.12.2019 г**.

УНП 100074549




## «А ЖАНЧЫНА ТАК І НЕ ПРЫЙШЛА...»

Праўду кажуць, што ўвосень і верабей багаты. Ну проста не ведаеш, чаго і захацець — прыеліся і кавуны, і вінаград, і перцы з баклажанамі... Усё са свайго агарода.

Не прыядаецца толькі бульба, калі гэта Адрэта. Але ж пра яе потым, пакуль...

Надумалася неяк успомніць дзяцінства — напарыць сабе кукурузы. Спеленькай ды жоўценькай, на жаль, не дачакалася. Мне і белая смачнай была. Не дзіва, што яе — адвараную — выгадна прадаваць. Кажуць, разлятаецца як гарачыя піражкі. Прадаўцу адпаведна — жывая капейка, бізнес, па-сучаснаму кажучы. А «сыравіны» для яго і на калгасным полі можна набраць... Ва ўсякім разе, *было*.

...У тыя гады турма за «каласкі» ўжо не свяціла, штраф у «дваццаць пяць базавых» (за што заўгодна) — не свяціў яшчэ. Я думаю, таму, што ўсё рабілася «по просьбам трудящихся», а тыя «трудящиеся» ў кукурузу пайшлі, забыўшы папрасіць, бо калгасная ж не тое, што свая. Пачатак там — амаль як рука ад локця да кісці: гоніць раслінку, ведама, на салетры... Вал калгасам патрэбны, а пра нітраты тады ніхто і не чуў.

Карацей, людзі гандлявалі. Гледзячы на іх, пасмялела і баба Сцёпа: схадзіла на поле, наламала пачаткаў (ну, прагоніць, казала, брыгадзір — дык з іншага боку зайду), напарыла іх у печы — падалася на рынак. І не моўчкі там стаіць, а зазывае народ, каб купляў:

— Кукурузка! — крычыць. — Салодзенькая! Гарачанькая!

Да таго ж, заўважым, калгасненькая — няслабых памераў...

Таму ў першы дзень бабуля мігам тавар прадала.

А ўжо ж потым купіла — і булак, і селядцоў, і «канхветаў» мякенькіх — нават хустку сабе! То чаму б назаўтра не з'ездзіць? І напаслязаўтра... Не бабка, а «бізнес-лэдзі» стала, сённяшняй мовай кажучы, хоць і з «прыстаўкай» «стар»...

Дык вось неяк стаіць яна, гандлюе. У пакупніках — жанчынка. Нічога такога: акуратна прыбраная, сярэдніх гадоў... Адзінае — глядзіць не столькі на тавар, колькі на саму бабулю. Кажа:

— Такая кукурузка ў вас харошая! Як яна такая вырасла?

Бабця, не разгубіўшыся:

— Дык у нізіначцы ж мой гарод (пляц па-нашаму). Там чысты чарназём і вады хапае... Вось яна і расце.

(Ага — я ад сябе дадам, — «нізіначка» ў бабы Сцёпы, «чарназём»... Дом на ўзгорку стаіць, пляц на пясочку... Нават трава не хоча расці.)

Але ж пакупніца бабулі паверыла, узяла аж дзесяць катахоў і пайшла.

А хвілін праз колькі — вярнулася — з кавуном, тады — найлепшым прысмакам:

— Гэта вам, — кажа. — Вазьміце... Я на вас паглядзела, — быццам маму сваю ўбачыла. Вы так да яе падобны! Дай вам божа здароўечка!..

І сышла.

А бабульцы — хоць скрозь зямлю праваліся! Бо яна ж (казала) нічога ў жыцці не хацела больш, як маму сваю ўбачыць — жывой, «ну хоць бы праз дзірачку!»... А тут чыясьці дачка глядзела на яе, прымала як бы за сваю, за родную, а яна ёй хлусіла.

І так бабулі сорамна стала, што ў кукурузу болей — ні нагой. Цыбулькі якой набярэ, яек, «чоснічку» (у нас так кажуць), ды на базар.

Усё стаіць там, чакае, што яшчэ раз тая пакупніца падыдзе... Яна пачаставала б...

Але жанчына так і не прыйшла.

Во як было.

Як стала? Ды ці вам казаць? Падман дзеля грошай цяпер як быццам і не падман ужо. Нікому ні за што не сорамна. Я сама сутыкалася.

У мяне любімая бульба ёсць — Адрэта. З мінулага стагоддзя вядзецца. Апошнім часам, думаю, трэба насенне абнавіць. Кінула кліч, — адзін знаёмец прывёз. Сказаў, што ў Мінску на Камароўцы знайшоў, нейкая бабулька прадавала: бажылася, што Адрэта.

Купіў чалавек (і немалыя ж грошы аддаў), а там такая «Адрэта», як я Рымскі Папа. І бабулі ж, відаць, не сорамна?

Сорамна чамусьці мне — за яе, за ўсіх, хто жыве з падману.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## ЗАЯЦ НА ЧАЦВЯРЫХ

Кажуць, што найлепшыя фантазёры не пісьменнікі-казачнікі, а паляўнічыя, рыбаловы ды грыбнікі. Гэта яны са ста метраў могуць пацэліць вавёрцы ў правае вока, выцягнуць з рэчкі трохметровага шчупака, а грыбы («адны баравікі!»), дык тыя самі, нахрапам, у кашы да іх лезуць.

Наслухаўся я падобных гісторый. Але адна з іх здалася праўдзівай, да таго ж расказваў яе не «прафесіянал», можна сказаць, аматар. Яму і слова.

«На паляванні да таго разу я быў толькі двойчы, — найперш прызнаўся Андрэевіч. — А тут, значыць, трэці, мы едзем у лес. Надвор'е — ну проста на заказ: ночку сняжок прайшоў, днём — невялічкі марозік.

На ўзлеску спынілі машыну, робім на чарцы — астатняе, кажуць, пасля палявання. Потым самы вопытныя з нас разводзяць іншых па месцах, ставіць задачы. Мяне, напрыклад, пакідае на скрыжаванні лясных дарог, кажа, куды глядзець і калі не марудзіць са стрэлам. Я ўважліва слухаю і трымаюся потым хвілін з пятнаццаць: стаю — як ля маўзалея. Але ж пачынаю сумаваць: брэх сабакі далекавата, звера не чуваць, ці...

Мусіць, ад напружання памроіўся шоргат за кустамі ядлоўцу. Я «ў ружжо», нават крок наперад зрабіў. Марна — ціш ды снежная бель наўкола. Ніякага сэнсу, думаю, у яе ўзірацца, да таго ж калі ведаеш, што ўсё залежыць ад шанцу: можна (паляўнічыя казалі) дзіка адразу пад стрэл «падагнаць», а можна за паўдня зайчаняці не ўбачыць...

Карацей, праз паўгадзіны я ўжо спакойна пераступаў з нагі на нагу і глядзеў не туды, куды загадалі.

А далей — болей, як той казаў: яшчэ праз колькі хвілін дастаў з кішэні біклажку з каньячком — каўтануў... Уміг на душы пацяплела: песня з яе папрасілася, але ж я «не выпусціў» — пакуль.

Праз паўгадзіны зноў прыкладваўся да біклажкі, прысеў на зламаную бярозу, спінай прытуліўся да стромкай хвоі... Не жыццё, — сам сабе думаю, — а проста маліна: чысцюткае паветра, цішыня, цеплыня, бо на мне кажушок, ватныя штаны і валёнкі...

Ногі ў іх «нясуць» у любімае кафэ, да знаёмай маладзіцы, якая так пяшчотна гладзіць руку...

А тут нешта трэсь!

Я зірк і ледзь не самлеў: лось. Метраў за дзесяць. І ўтаропіўся — як я на яго: з не меншым здзіўленнем...

Колькі часу мы так пазіралі, сказаць не бяруся: мне здалося — цэлую вечнасць, за якую ў снег, на зямлю з'ехала мая вінтоўка. І ціхутка, як быццам, але ж лось пачуў — скокнуў убок і, ломячы кусты, шыбануў у гушчар.

...Пасля гэтага я ўжо не драмаў. І пра біклажку забыўся, хоць стрэс зняць, можа, і трэба было.

А тым часам адгукнуліся хлопцы, сышліся разам. Адзін стаў бажыцца, што яго сабака з асінніку выгнаў ласа. І ён проста павінен быў з'явіцца на адной з двух сцяжын, дзе ў засадзе стаялі паляўнічыя. «Няўжо ніхто не бачыў?» — пытаўся ён. «Не», — дружна заявілі тыя. А я дык яшчэ і дадаў, што ў мяне нават і заяц не праскочыў бы! — «Шкада, — прызналі хлопцы. — Добры «ўлоў» мог быць. А так — давядзецца зайца дзяліць. На чацвярых».

**Віктар Сабалеўскі,** *г. Узда.*

## АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАЛЯВАННЯ

Мой аднавяскоўвец Валодзя нарадзіўся ў Казахстане, і нічога дзіўнага ў тым няма: яго бацькі, як, дарэчы, многія сем'і, на пачатку 60-х з'ехалі на асваенне цаліны, а потым вярнуліся. Так што сваё «замежнае» дзяцінства Валодзя помніць слаба — нібы праз сон, затое прыезд на радзіму ў памяці, мусіць, да скону.

Тады ў хату сышлося, можа, з паўвёскі: родныя, сябры, суседзі... Усіх цікавіла, якое яно — жыццё на чужыне, якія там парадкі, якія заробкі. Да таго ж цаліннікі ўсім раздавалі гасцінцы, у прыватнасці — чорны молаты перац. У час татальнага дэфіцыту ён быў вельмі дарэчы, а калі ўлічыць доўгачаканы час смалення вепрукоў...

На агеньчык да цаліннікаў завітаў і дзядзька Іван: з палявання ішоў — з дубальтоўкай за плячыма, са здабытым зайцам у рэчмяшку... Не адмовіўся, вядома ж, ад прапанаваных ста грамаў — за прыезд.

Карацей, дарослыя сядзяць, што называецца, чаркуюць, а малы вачэй не зводзіць з дзядзькавай стрэльбы.

«Відаць, паляўнічы будзеш? — перахапіўшы позірк Валодзькі, зазначыў дзядзька Іван. — Правільна! Бо табе для гэтага нават стрэльба не патрэбна. У цябе іншая «зброя» ёсць. (Дзядзька перавёў свой позірк на мех з перцам, у якім, заставалася яшчэ з палову.) Бяры, брат, гэты прадукт і ў лес. Далёка хадзіць не трэба — за хлеўчыкам пачынай: не шкадуючы, перчы кожны пянёк. Да іх з усіх куткоў зайцы пазбягаюцца, а нюхнуць і на чых «праб'е» — аж галовы аб пні паразбіваюць... Табе застанецца толькі здабычу сабраць».

За сталом дзядзькаў гумар адзначылі чарговай чаркай і, магчыма, забыліся б, калі б дзён праз колькі не ўбачылі, што мех з перцам некуды... знік. І, што называецца, з канцамі: Валодзька схадзіў на паляванне.

...За страчаны прадукт бацькі яго строга не каралі, аднак дзядзька Іван у хату «цаліннікаў» яшчэ доўга не заходзіў. Баяўся, відаць, што падсыпяць перцу — за яго навуку.

**Генадзь Мішчук,**
*в. Вотчына, Маларыцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

*Ад яе ж* — **напамін, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» друкуюцца ў рамках конкурсу — на найлепшую. Вызначаць ды выбіраць іх, вось такія, на пачатку новага 2020-га будзе невялічкае рэдакцыйнае журы, але, па традыцыі, з «падачы» вялікага. Тобок кожны з нашых чытачоў можа выбраць і даслаць у рэдакцыю сваю дзясятку... не рублёў, а (на яго думку) найлепшых гісторый.**

**Што, магчыма, цікава — з часам вельмі многія з іх «чытаў бы і чытаў» (пажадана не запар). А таму — не спяшайцеся выкідваць пятнічныя газеты. Няхай паляжаць: падчас восеньскай хандры, магчыма, як знойдзеце?**

Неасабісты суб'ектыў

# Пра фаўну і флору

## Як мяняецца вясковая экасістэма, і ці добра гэта?



МЫШЫ ў вясковай хаце праелі дзірку ў канапе. Залезлі пад здымнае сядзенне, выгрызлі сабе ў паралоне гняздо, паспелі нацягаць туды паперы. Прыехаўшы на выхадныя, мы толькі войкалі і абураліся. Гэта ж трэба — паўсюль жа пакінулі атручанае зерне, яны яго начыста зжэрлі, і хоць бы што — палезлі канапу каштаваць. Назаўтра раніцай, пераначаваўшы, «вясяліліся» яшчэ больш: атручаны «пачастунак», які зноў шчодра парассыпалі на талерачкі па ўсіх пакоях, шэрыя паскудніцы нацягалі за ноч... сястры ў берэт, пакладзены на крэсла. А мне ў красоўкі, якія стаялі ў пакоі пад шафай, прывалаклі жолуд і пакамечаную абгортку ад цукеркі. Выказаўшы ўсё, што пра іх думаем, а пасля і пасмяяўшыся, мы ўрэшце і філасофстваваць пачалі: хто ж тады ў гэтай хаце гаспадар?

Уражанне яшчэ памацнела, калі пайшлі аглядаць сабраны ўраджай. У хляве ляжалі пагрызеныя кабачкі, у склепе — агрызкі мо дзесяці бульбін, — яе яшчэ не паспелі апусціць у яму. У мяшкі з буракамі і морквай я шчодра насовала сухіх галінак палыну — ведаю яшчэ ад бабулі, што гэтай горкай, як чэмер, расліны шкоднікі на дух не пераносяць. За бабуліным часам, можа, і не пераносілі, а тут мала што ўдосталь паласаваліся караняплодамі, дык яшчэ і амаль цалкам з'елі мяшок, у якім яны ляжалі. Мех быў «экалагічны», з другаснай сыравіны, пэўна, таму і прыйшоўся ім да смаку. Пакуль вытрасала тое, што ад яго засталося, з-пад падлогі выскачыла мышка і стала з цікаўнасцю за мной назіраць, абсалютна не баючыся, паблісківаючы вочкамі-кропачкамі. Хоць ты бяры ды гладзь. Тут жа ўзяла лапкамі кавалачак бурака і стала яго грызці. Мне ад такога нахабства аж дух заняло. Але, канешне, нічога ёй не зрабіла, толькі нагой тупнула. Яны ўжо і праўда тут гаспадары. А буракі ды бульба ў тыя ж выхадныя на гарадскі балкон пераехалі...

У чым прычына такога мышынага нашэсця? Кажуць, гэта паказвае на тое, што зіма будзе ранняя і халодная. Мо яно і так, але, калі разважаць пра асобна ўзятую вёску (хутчэй, на сённяшні дзень тыповую: большасць хат як дачы, зімаваць застаецца крыху больш за дзесяць чалавек), прычына бачыцца яшчэ ў іншым: тут амаль не засталося свойскіх жывёл — не тое што пра кароў і коней размова, няма нават катоў і сабак. Дзе ж тыя мышы не пойдуць у хату, калі па ўсім наваколлі ніводнага вусатага-паласатага, нідзе не чуваць звонкага брэху? Бабулі, што застаюцца ў вёсцы на зіму, калі прападае жывёлка, новую ўжо заводзіць не спяшаюцца: баяцца, што яна іх перажыве. «Я памру, а той коцік (сабачка) будзе пасля па вуліцы галодны цягацца. Навошта ж скацінку так мучыць», — не аднойчы чула такі адказ на пытанне, чаму няма ў хаце ці ў двары гадаванца. «Вось паеду да дзяцей на зіму, куды яго дзець, хто яго возьме?» — гаравала нядаўна цётка, гладзячы па галаве ласкавага невялікага сабачку, якога ўлетку спакусілася ўзяць шчанём. У лепшым выпадку цюцьку забярэ хтосьці з яе дзяцей, у якіх свае дамы ў аграгарадках. У горшым — ён пасоваецца па вёсцы ў пошуках ежы і сыдзе кудысьці, дзе ёсць надзея гэту ежу знайсці... А ў вёсцы, як выпадзе снег, нешматлікія жыхары прама пад вокнамі будуць заўважаць сляды вялікіх і меншых лап і капытоў лясных гасцей. А вы кажаце — мышы...

УЛЕТКУ да нас на ганак прыходзіў заяц. Сапраўдны, вялікі, зусім не палоханы. Сядзеў, касавурыўся на мяне праз шыбу. Лянiва паскакаў у бок суседчынага агарода — як потым аказалася, добра паласаваўся там маладой капустай. Прылятаў пажывіцца і вялізны ястраб — спрабаваў пацягнуць у кіпцях маленькага ёрка, якога суседчына ўнучка прывезла з горада на прыроду. Ратавалі мы таго сабачку як маглі — хто крычаў, хто махаў рукамі, нехта грукаў у металічны таз. Ястраб, хутчэй, здзіўлены, чым спалоханы, кіпці ўрэшце расціснуў, і стварэнне, больш падобнае на цацку, чым на жывёлу, жаласна павіскваючы, кулём пакацілася ў сенцы... У садзе ўжо каторы год гняздуюць крыклівыя нахабныя сойкі, якіх раней зрэдку можна было ўбачыць толькі ў лесе. Прыходзяць у двор лісы і куніцы, прылятаюць нейкія яркія, зусім не вядомыя птушкі. Ужо і сапраўды час задумацца: а хто з нас тут гаспадар?

На закінутых участках — калі перамервалі зямлю, многія паадмаўляліся ад кавалкаў, дзе раней былі бульба і сенакос: няма каго карміць той бульбай і сенам — пайшлі расці бярозы і малiннік. І канадскі залатарнік, які раней высаджвалі на кветніках. Цяпер ён запаланіў усе прасторы, дзе не косіцца, і рады даць яму вельмі няпроста. Спачатку жоўтыя мяцёлкі глядзяцца нават прыгожа, але пасля становяцца ржава-рудымі, і менавіта тады відаць маштаб праблемы, бо там, дзе залатарнік, нічога больш не расце, а яго з кожным годам становіцца больш на нічыёй зямлі. Сельгаспрадпрыемства тыя пакінутыя загоны сярод апрацаваных (паадмаўляліся ад сотак не ўсе) сабе пад пасевы забраць не можа, таму зямля пакуль сапраўды нічыя. Дакладней, «гаспадары» на ёй ужо іншыя — з жоўтымі, а пасля рудымі «галовамі»...

МЕНАВІТА тут, у здавалася б, жывой вёсцы (не закінутай — летам яна аж гудзе ад дачнікаў), вельмі дакладна разумееш, што чалавек — ніякі не «ўладар» і не «цар», а ўсяго толькі адна са складовых частак асобна ўзятай экасістэмы. І калі яго прысутнасць у ёй змяншаецца — прырода тут жа знаходзіць яму замену. Добра гэта ці дрэнна? Мы, здаецца, яшчэ не гатовы абмяркоўваць ні гэта, ні тое, што рабіць і ці трэба рабіць увогуле. Мы пакуль у пятніцу вечарам перад паездкай на дачу проста спяшаемся ў аддзел гаспадарчага магазіна, дзе прадаюцца пасткі і атрута для мышэй і ў якім у гэты час самы ажыятаж...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор/ оператор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703<br>Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | ЗАО «ДоВиТрэйд Плюс» 220005, г. Минск, ул. Краснозвездная, д. 18Б |

Предмет электронных торгов – имущество, реализуемое одним лотом по адресу Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, район д. Подгорье в следующем составе:

**– Здание санатория-профилактория «Строитель»** общей площадью 3132,1 кв. м, инв. номер 600/С-73602

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды (по 03.09.2034) общ. пл. 1,1484 га для обслуживания зданий и сооружений санатория-профилактория «Строитель»

**– Здание овощехранилища** общей площадью 115,4 кв. м, инв. номер 600/С-121926

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 1,2000 га для содержания и обслуживания зданий овощехранилища и теплицы на фактически занятых под объекты землях

**– Общежитие** общей площадью 590,8 кв. м, инв. номер 600/С-93935, **сооружение автоматической канализационной станции** общей площадью 35,7 кв. м, инв. номер 600/С-120317, **здание газораспределительного пункта** общей площадью 12,5 кв. м, инв. номер 600/С-120320, **сооружение отстойника**, инв. номер 600/С-120319, **здание котельной** общей площадью 662,3 кв. м, инв. номер 600/С-120322, **здание котельной** общей площадью 662,3 кв. м, инв. номер 600/С-120322, **здание трансформаторной подстанции** общей площадью 63,3 кв. м, инв. номер 600/С-120321, **сооружение артезианской скважины с насосной и двумя подземными резервуарами по 250 куб. м**, инв. номер 600/С-120318, **гараж** общей площадью 294,2 кв. м, инв. номер 600/С-93934

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 1,6891 га для обслуживания зданий и сооружений профилактория

В состав лота входит иное имущество. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Начальная цена без учета НДС: 274 518,00 белорусских рублей.**
Шаг аукциона: 13 725,90 белорусского рубля

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 9.00 до 16.00, Кудренок Елена Александровна, тел. +375 (29) 644-38-92.
**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка».
**Срок подписания договора купли-продажи: 15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов.
**Условия оплаты предмета электронных торгов:** победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но **не позднее тридцати дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.
Регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)». Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет.
**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**
Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить Организатору торгов и Продавцу затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение организатору в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов.
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.
Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 17.09.2019 г.
**Дата, время и место проведения электронных торгов: 06.11.2019** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by). Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 05.11.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by)**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

Предмет аукциона:
**Лот № 1: административное помещение № 1** (административное помещение), общ. пл. **980,0 кв. м**, инв. № **500/D-687422**, по адресу: **г. Минск, пр-т Партизанский, 6А-1.** Начальная цена с НДС 20 % – **1 495 881,60 бел. руб.**
**Дополнительная информация:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона, на сумму 80 081,96 бел. руб. с НДС 20 %. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов **www.cpo.by**
**Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 500000000003000457, предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административного здания, общая площадь 0,3723 га, доля в праве – 12/100

**Лот № 2: административное здание (здание административно-хозяйственное),** общ. пл. **597,5 кв. м**, инв. № **500/С-3432**, по адресу: **г. Минск, ул. Маяковского, 16А.** Начальная цена с НДС 20 % – **772 117,20 бел. руб.**
**Дополнительная информация:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона, на сумму 53 118,55 бел. руб. с НДС 20 %. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов **www.cpo.by**
**Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 500000000003002922, предоставлен на праве аренды по 31.08.2022 общей площадью 0,0996 га для эксплуатации и обслуживания административного здания

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **25.11.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **21.11.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

Предмет аукциона:
**Помещение финансового назначения** (помещение финансового назначения), общ. пл. **1588 кв. м**, инв. № **350/D-174671** по адресу: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 126-10.** Начальная цена с НДС 20 % – **1 272 507,60 бел. руб.**
**Обременение:** частичная аренда. Подробная информация на сайте **www.cpo.by.**
**Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 340100000002000659, общая площадь – 0,9223 га, предоставлен для содержания и обслуживания административных зданий и сооружений на праве общей долевой аренды по 03.01.2022, доля в праве – 2677/10000

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **20** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.11.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **18.11.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>E-mail: auction@cpo.by** |

## ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БПС-Сбербанк», опубликованном в газете «Звязда» от 16.10.2019 вносится изменение: **сумма задатка составляет 10 % от начальной цены предмета аукциона**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by** |

УНП 191021390

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта / Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Розовая, 4** и земельный участок | 121280401101000456 | 0,1078 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **49 013,86** | 9 800,00 | **2 603,44** | 0,0044 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт |
| 2 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Лыщицкая, 58** и земельный участок | 140100000001024636 | 0,1094 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **20 339,91** | 4 000,00 | **2 607,15** | 0,0032 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт;<br>0,0023 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления) |
| 3 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Клейниковская, 35** и земельный участок | 140100000001026672 | 0,1242 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **26 035,47** | 5 200,00 | **2 672,59** | 0,0027 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт;<br>0,0013 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления) |
| 4 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Берестовая, 20** и земельный участок | 140100000001022075 | 0,1017 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **39 718,52** | 7 900,00 | **2 603,44** | 0,1017 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях |

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **2 550,00 рублей**

**Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.
**Перечень документов представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**
• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:
– часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок) за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
– часть платы предмета аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
– возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
– компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);
• не позднее одного месяца с момента подписания акта приема-передачи получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;
• заключить договор на разработку проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома в течение 20 календарных дней с даты получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 3 месяцев с даты заключения данного договора, обеспечить ее изготовление;
• представить изготовленную проектную документацию для утверждения в Брестский городской исполнительный комитет в течение 30 календарных дней с даты ее изготовления;
• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;
• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся

Аукцион состоится 21 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30. 18.10.2019 г. до 17.30. 15.11.2019 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by

PARITETBANK

## Бухгалтерский баланс на 1 октября 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 29 324 | 25 839 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 36 739 | 43 829 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 34 180 | 7 390 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 123 295 | 129 910 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 249 493 | 215 150 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 150 | 150 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 36 856 | 36 452 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 473 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 154 | 122 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 83 | 83 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5 632 | 5 715 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 516 379 | 464 640 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 110 751 | 99 075 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 281 089 | 238 598 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 9 999 | 12 035 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | 1 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 345 | 1 769 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 404 184 | 351 478 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 66 056 | 66 056 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 4 227 | 4 017 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 12 810 | 14 994 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 29 102 | 28 095 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 112 195 | 113 162 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 516 379 | 464 640 |

## Отчет о прибылях и убытках на 1 октября 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2019 | 01.10.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 22 241 | 19 806 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 12 129 | 7 202 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10 112 | 12 604 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 11 849 | 3 389 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 394 | 919 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 9 455 | 2 470 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | 4 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 2 847 | (1 048) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 3 730 | 3 080 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 140 | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7 499 | (1 893) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 2 309 | 1 206 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 19 091 | 15 044 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 848 | 547 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 155 | 4 618 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | 688 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 155 | 3 930 |

Страница интернет-сайта Банка, где размещена отчетность о деятельности Банка в полном объеме
http://www.paritetbank.by/about/finance/kvartal/2019/3_kvartal_2019/

ОАО «Паритетбанк» УНП 100233809

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о внесении изменений в извещение о проведении аукциона по продаже имущества

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 420/D-2937 (назначение – складское помещение, наименование – помещение арочного склада), общей площадью 978,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14К-1, и многолетние насаждения в количестве 16 шт. следующего содержания

Условия проведения аукциона – предоставление безоговорочного и бесплатного доступа работников ОАО «Лидский завод электроизделий» в изолированное помещение теплоузла, инв. № 420/D-2938, находящегося в здании арочного склада, по мере необходимости, для обслуживания инженерных систем. Условия оплаты – возможна рассрочка на 12 месяцев. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Аукцион состоится 28 октября 2019 г. в 11.00. Последний день приема заявлений – 24 октября 2019 г. до 15.00

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/ УНП 500021270*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 4 ноября 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 65 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условия продажи:** **1)** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние; **2)** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя; **3)** Земельный участок под объект продажи **(лот № 1, 2, 3)** будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Возмещение затрат по выделению земельного участка под объект недвижимости возлагаются на Покупателя (победителя аукционных торгов). **Примечание:** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001000070** общей площадью **3,2777 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственной базы | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5035**, общей площадью **1 402,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Капитальное строение с инв. № 324/С-8673**, общей площадью **29,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **сторожка. Капитальное строение с инв. № 324/С-5037**, общей площадью **322,6** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание бытового помещения с двумя пристройками. Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42. Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 20.02.2019 г. № 34 (28901) | **223 675,20** | 11 183,76 | 22 367,52 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5039**, общей площадью **803,5** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание мастерской с пристройками. Капитальное строение с инв. № 324/С-5045**, общей площадью **614,6** кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада № 1 с пристройками. Капитальное строение с инв. № 324/С-5041,** общей площадью **357,2** кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – **одноэтажное кирпичное здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей. Капитальное строение с инв. №324/С-9410,** общей площадью **44,7** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **здание гаража. Капитальное строение с инв. № 324/С-5040,** общей площадью **557,0** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение с инв. № 324/С-9430,** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **эстакада для автомашин.** Благоустройство базы (покрытие из ж/бетон, покрытие бетонное) (инв. № 227). **Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **155 435,00** | 7 771,75 | 15 543,50 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5038**, общей площадью **392,4** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада № 2 с навесом. Капитальное строение с инв. № 324/С-5044**, общей площадью **40,7** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции. Капитальное строение с инв. № 324/С-5042**, общей площадью **423,1** кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – **здание лесопильного цеха с пристройкой. Капитальное строение с инв. № 324/С-8791**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **навес к лесопильному цеху. Капитальное строение с инв. № 324/С-5043**, общей площадью **415,7** кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с пристройкой. Капитальное строение с инв. № 324/С-8671**, общей площадью **65,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **компрессорная. Капитальное строение с инв. № 324/С-8790**, общей площадью **33,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **сушилка с навесом. Капитальное строение с инв. №324/С-8670**, общей площадью **230,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **склад заполнителей РБУ. Капитальное строение с инв. № 324/С-5036**, общей площадью **335,5** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **двухэтажное кирпичное здание растворобетонного узла с пристройкой.** Трансформатор ТМ 250 (инв. № 1049). Лесопильная рама вертикальная Р63-4Б-01 (инв. № 2138). Станок СР-4-20 рейсмусовый (инв. № 229). Универсальный круглопильный станок Ц6-2 (инв. № 401). Забор стройдвора бетонный сплошной (инв. № 53/2). **Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **92 792,00** | 4 639,60 | 9 279,20 |
| 11 | Домик КДМ (инв. № 945) | **1 085,00** | 54,25 | 108,50 |
| 21 | **Бульдозер Б-10М 0111-1Е**, заводской (серийный, идентификационный) № 42157, 2008 года выпуска, **рег. знак ЕВ-3 1144** | **12 880,00** | 644,00 | 1 288,00 |
| 23 | **Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW-1400**, заводской (серийный, идентификационный) № Y39W14000710067, 2010 года выпуска, **рег. знак ЕВ-3 3173** | **24 010,00** | 1 200,50 | 2 401,00 |
| 28 | **Полуприцеп специальный цистерна NPC-22 DK**, кузов (рама) № Y69AC22228PA48067, 2008 года выпуска, **рег. знак А 7143 А-3. Грузовой седельный тягач МАЗ 6430А8**, кузов (рама) № Y3M6430A890000869, 2009 года выпуска, **рег. знак АК 8638-3** | **18 970,00** | 948,50 | 1 897,00 |
| 36 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 5336 А3**, кузов (рама) № Y3M5336A390000811, 2009 года выпуска, **рег. знак АВ 9085-3. Прицеп бортовой МАЗ 837810 042**, кузов (рама) № Y3M83781080012096, 2008 года выпуска, **рег. знак А8085 А-3** | **9 695,00** | 484,75 | 969,50 |
| 38 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 5336 А3**, кузов (рама) № Y3M5336A380000561, 2008 года выпуска, **рег. знак АВ 6517-3. Прицеп бортовой МАЗ 837810**, кузов (рама) № Y3M83781080011730, 2008 года выпуска, **рег. знак А2349 А-3. Автобус вагон ПАЗ 32053**, кузов (рама) № X1M3205E070008334, 2007 года выпуска, **рег. знак АК 8651-3** | **11 060,00** | 553,00 | 1 106,00 |
| 40 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ-533603-220**, кузов (рама) № Y3M53360370005915, 2007 года выпуска, **рег. знак АК 8652-3. Прицеп бортовой MAZ 837810**, кузов( рама) № Y3M83781070010846, 2007 года выпуска, **рег. знак А 1389 В-3** | **7 105,00** | 355,25 | 710,50 |
| 43 | **Грузовой седельный тягач МАЗ 6422 А5**, кузов (рама) № Y3M6422A580000572, 2008 года выпуска, **рег. знак АК 8653-3. Полуприцеп бортовой МАЗ 975800**, кузов (рама) № Y3M97580080011167, 2008 года выпуска, **рег. знак А 1387 В-3.** Кассета для перевозки камня силикатного, инв. № 2055. Кассета для перевозки камня силикатного, инв. № 2056 | **13 650,00** | 682,50 | 1 365,00 |
| 44 | **Прицеп МАЗ-857100 010**, кузов (рама) № Y3M857100800004765, 2008 года выпуска, **рег. знак А 1386 В-3. Грузовой самосвал МАЗ-5551А2**, кузов (рама) № Y3M5551A290001753, 2008 года выпуска, **рег. знак АК 8637-3** | **8 295,00** | 414,75 | 829,50 |
| 45 | **Грузовой самосвал МАЗ 555102 220,** кузов (рама) № Y3M55510260009609, 2006 года выпуска**, рег. знак АА 6140-3** | **3 640,00** | 182,00 | 364,00 |
| 46 | **Грузовой седельный тягач МАЗ 6430 А8 360 010**, кузов (рама) № Y3M6430A8A0001019, 2010 года выпуска, **рег. знак АК 8636-3. Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2010**, кузов (рама) № Y3M975800A0012150, 2010 года выпуска, **рег. знак А 1388 В-3** | **16 345,00** | 817,25 | 1 634,50 |
| 47 | **Грузовой самосвал МАЗ-5551А2,** кузов (рама) № Y3M5551A280001004, 2008 года выпуска**, рег. знак АВ 6358-3** | **5 915,00** | 295,75 | 591,50 |
| 48 | **Грузовой самосвал МАЗ-5551А2,** кузов (рама) № Y3M5551A280001064, 2008 года выпуска**, рег. знак АК 1181-3** | **5 915,00** | 295,75 | 591,50 |
| 49 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2010,** кузов (рама) № Y3M97580080011105, 2008 года выпуска**, рег. знак 2014 АА-3** | **3 430,00** | 171,50 | 343,00 |
| 51 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2010,** кузов (рама) № Y3M97580090011603, 2009 года выпуска**, рег. знак А 3368 А-3** | **3 570,00** | 178,50 | 357,00 |
| 53 | Инвентарное здание, инв. № 974 | **420,00** | 21,00 | 42,00 |
| 55 | Квасовозка, инв. № 1023 | **178,50** | 8,93 | 17,85 |
| 56 | Квасовозка, инв. № 1023а | **178,50** | 8,93 | 17,85 |
| 57 | Штукатурная станция ШС-4/6 (СО-50А1Л), инв. № 2103 | **630,00** | 31,50 | 63,00 |
| 58 | Подкатные КБ-405 инв. № 24700623 | **770,00** | 38,50 | 77,00 |
| 60 | Дом-вагон, инв. № 55 | **525,00** | 26,25 | 52,50 |
| 61 | Вагон-общежитие, инв. № 58-1 | **1 050,00** | 52,50 | 105,00 |
| 62 | Вагон-общежитие, инв. № 59-1 | **1 050,00** | 52,50 | 105,00 |
| 65 | Станция штукатурная ШС-4/6 (СО-49С), инв. № 916а. Камера для сушки одежды, инв. № 138 | **1 540,00** | 77,00 | 154,00 |
| 66 | Станок вертикально-сверлильный настольный мод. 2М112 (станок сверлильный ручным управлением) инв. № 910. Местонахождение: **г. Добруш, пер. Крылова, 4** | **192,50** | 9,63 | 19,25 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8(044)769-19-61, 8(0232)53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой**»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 октября 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 31 октября 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10(десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127-129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 20.02.2019 г. № 34 (28901). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні работа не запатрабуе асаблівага напружання. На ваш кар'еры рост можа станоўча паўплываць чалавек, які даўно працуе з вамі. Зоркі кажуць, што вы дарма пазбягаеце больш цеснага супрацоўніцтва з ім. Панядзелак — спрыяльны дзень для новых знаёмстваў і камерцыйных прапаноў, лепш іх не адхіляць. Не выключана, што ў аўторак выявяцца рэчы, якія калісьці зніклі, нагадаюць пра сябе старыя сябры. У нядзелю вам, падобна, давядзецца паспяшацца на дапамогу камусьці са сваякоў.

**ЦЯЛЕЦ.** Час хоць злёгку абнавіць свой імідж — гэта надасць вам новую энергію. На рабоце магчыма павелічэнне нагрузкі, з'яўленне новых абавязкаў. У пятніцу вы зможаце праявіць творчы бок сваёй натуры, толькі асабліва не захапляйцеся. У суботу вас можа наведаць выдатная ідэя ў галіне фінансаў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Праявіце шчодрасць. Чым больш вы аддаяце, тым больш атрымліваеце. Жаданне падзяліцца творчымі ідэямі і назапашаным прафесійным вопытам прынясе немалы прыбытак. У асабістым жыцці ўсё складваецца найлепшым чынам. Гарачы раман абяцае абярнуцца вяселлем або прыбыткам у сям'і. У нядзелю будзе добрая магчымасць павысіць самаацэнку, не прыкладаючы да гэтага ніякіх асаблівых намаганняў. Фартуна ўсміхнецца вам у самы нечаканы момант, а гэта абяцае выкананне даўніх жаданняў.

**РАК.** Тыдзень будзе эмацыянальна насычаны і багаты на падзеі. Вашы жаданні атрымаюць падтрымку і шанц ажыццявіцца. Неабходна карыстацца момантам, каб бліснуць сваімі талентамі. Паспрабуйце быць мудрэйшымі, умейце прамаўчаць і знайсці кампраміс. У суботу наведайце канцэрт ці выстаўку, каб узбагаціць сябе новымі ўражаннямі. Будзьце дабрэйшым да сваіх блізкіх, пакажыце ім на справе, а не толькі на словах, як вы іх шануеце і любіце.

**ЛЕЎ.** Паспрабуйце асэнсаваць сітуацыю і зразумець, што менавіта вас не задавальняе на рабоце ці ў асабістым жыцці. Ёсць шанц выправіць некаторыя з назапашаных за апошні час памылак, што дазволіць вам адчуць сябе лёгкім і вольным чалавекам. Не выключаны канфлікты з дзецьмі або з бацькамі. Але лепш разабрацца ў сітуацыі, чым замоўчваць праблемы.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні ёсць сэнс падумаць пра павелічэнне даходу і новую работу. Спрыяльны час для пачатку назапашвання вялікага капіталу. Ва ўсіх сваіх справах вы можаце атрымаць неацэнную дапамогу ад сям'і. Пазбягайце адзіноты, больш будзьце на людзях, з сябрамі, завадзьце новыя знаёмствы і развівайце старыя адносіны. Не варта ў апошні момант карэктаваць планы, спрабуючы давесці ўсё да дасканаласці: гэтым можна займацца бясконца і безвынікова.

**ШАЛІ.** Хай не ва ўсім, але ў чымсьці адступіць давядзецца, пастаўцеся да гэтага працей. Паспрабуйце не хваліцца яшчэ не давядзеная да канца справай — пра вашу дзейнасць павінны ведаць толькі ў вузкім коле надзейных сяброў. На рабоце лепш дзейнічаць заадно з калегамі, а не цягнуць коўдру на сябе.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні здзейсняцца многія вашы жаданні. Чакайце новыя праекты і салідны прыбытак. Ды і ў каханні вам відавочна шанцуе. У сераду могуць выкрыцца новыя абставіны, якія ў корані зменяць сітуацыю, аднак гэта будуць прыемныя навіны. З другой паловы тыдня можа пачацца новы, яшчэ больш паспяховы ў кар'ерным плане перыяд вашай працоўнай дзейнасці.

**СТРАЛЕЦ.** Будзьце больш смелыя і экстравагантныя. Толькі не пускайце пыл у вочы, а адказвайце за свае словы. У чацвер многія справы скрануцца з мёртвага пункта. Вынікі вашай работы будуць залежаць ад самавалодання і самадысцыпліны. Амаль усё, пра што задумваліся, збудзецца, таму, перш чым загадваць жаданні, паразважайце, што вы сапраўды хочаце атрымаць.

**КАЗЯРОГ.** Сітуацыя, якая складзецца на гэтым тыдні, можа спраўакаваць на спрэчку з калегамі і нават з начальствам. Паспрабуйце па-філасофску паставіцца да гэтага і пераварыць дыскусію ў гутарку. Забудзьцеся пра ляжанне на канапе перад тэлевізарам. Вам проста неабходныя сустрэчы з сябрамі і актыўны адпачынак. Сачыце за сваімі словамі, лішняя фраза можа быць з поспехам выкарыстана вашым нядобразычліўцам.

**ВАДАЛІЙ.** Усе рашэнні неабходна прымаць на цвярозую галаву, не дазваляючы эмоцыям умешвацца ў працэс. У сярэдзіне тыдня магчымыя пэўныя праблемы ва ўзаемаадносінах у сям'і. Не варта ціснуць на блізкіх людзей. У пятніцу вас можа наведаць жаданне куды-небудзь з'ехаць. Але варта сувымяраць сілы і фінансавыя магчымасці. У суботу не пачынайце ніякай справы з дрэнным настроем, паспрабуйце спачатку яго выправіць.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні варта асаблівую ўвагу звярнуць на кар'ерны рост, бо магчымы вельмі прывабныя прапановы. Праўда, давядзецца больш працаваць. Каб дамагчыся поспеху, трэба прадумаць усё: што вы будзеце гаварыць, які ў вас імідж. Атрымаць многае без дбайнага аналізу і разліку не атрымаецца. А вось з рызыкоўнымі планамі і дзеяннямі пажадана пачакаць. Паспрабуйце не закідваць работу дзеля асабістага жыцця.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.42 | 18.06 | 10.24 |
| Віцебск — | 7.34 | 17.54 | 10.20 |
| Магілёў — | 7.32 | 17.57 | 10.25 |
| Гомель — | 7.26 | 17.56 | 10.30 |
| Гродна — | 7.57 | 18.22 | 10.25 |
| Брэст — | 7.55 | 18.25 | 10.30 |

### Месяц

*Поўня 14 кастрычніка.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр.* Аляксея, Дзям'яна, Ерамея, Мацвея, Піліпа, Пятра, Рыгора.
*К.* Ганны, Лукі, Пятра, Юльяна.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 18 КАСТРЫЧНІКА

**У краіне**

**1893** год — нарадзіўся (г. Коўна) Уладзімір Іосіфавіч Уладамірскі (Малейка), акцёр, народны артыст Беларусі і СССР. У 1924—1959 гадах — акцёр Беларускага тэатра імя Я. Купалы (у 1944-м узначальваў франтавую тэатральную брыгаду). Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Валодаў майстэрствам пераўвасаблення, пластычнасцю, уменнем карыстацца мімікай. Сярод роляў: Леапольд Гушка («Бацькаўшчына» К. Чорнага), Трыстан («Сабака на сене» Лопэ дэ Вегі), Іван Каламійцаў («Апошнія» М. Горкага) і інш. Здымаўся ў кіно («Хто смяецца апошнім», «Палеская легенда»), голас акцёра часта гучаў у радыёпастаноўках. Памёр у 1971 годзе.



**1914** год — у Мінску адкрыўся трохгадовы педінстытут, праграма навучання якога не перавышала ўзроўню сярэдняй школы. Адкрыццё яго абумовіў дэфіцыт настаўнікаў. Патрэба ў іх асабліва ўзрасла ў сувязі з пераўтварэннем гарадскіх вучылішчаў у чатырохкласныя, якія атрымалі назву вышэйшых пачатковых вучылішчаў. Заняткі пачаліся 18 кастрычніка ў наёмным доме на рагу Захар'еўскай і Садовай вуліц (раён парку імя Я. Купалы).

**У свеце**

**1009** год — па загадзе егіпецкага правіцеля Аль-Хакіма разрабаваны і разбураны храм Гроба Гасподняга. А заадно і ўсе астатнія іерусалімскія будынкі хрысціян. Матывы ж, якімі кіраваўся Аль-Хакім, які атрымаў ад сучаснікаў мянушку Вар'ят, не цалкам ясныя, хоць даклад-на вядома, што ён учыняў ганенні не толькі ў адносінах да хрысціян, але і іўдзеяў, і ўнутрыісламскіх апанентаў — сунітаў. Яшчэ самыя першыя хрысціяне ўшаноўвалі месца распяцця і пахавання Ісуса Хрыста. Пачатак ўзвядзенню храма Гроба Гасподняга ў 325 годзе паклала імператрыца Алена, маці Канстанціна Вялікага. Акрамя Магілы Гасподняй, у склад храмавага комплексу ўваходзілі меркаванае месца Галгофы і месца здабыцця Жыватворчага крыжа. Чуткі ж пра разбурэнне храма Гроба Гасподняга дасягнулі Еўропы і паслужылі адной з падстаў для агітацыі да пачатку Крыжовых паходаў.

**1854** год — нарадзіўся Аўгуст Андрэ Саламон, шведскі інжынер і палярны даследчык, якому належыць першая спроба дасягнуць Паўночнага полюса на паветраным шары ў 1897 годзе. Экспедыцыя скончылася трагічна. Андрэ і яго спадарожнікі пацярпелі аварыю і загінулі ад холаду. Астанкі экспедыцыі і запісы Андрэ былі знойдзеныя ў 1930 годзе на востраве Белы (на ўсход ад Шпіцбергена). У гонар Саламона Андрэ паўночная частка вострава Шпіцберген носіць назву Зямля Андрэ.

**1908** год — нарадзіўся (г. Жытомір) Аляксей Сямёнавіч Бурдзейны, Герой Савецкага Саюза, генерал-палкоўнік, ганаровы грамадзянін Мінска. На фронце з 1941 года — камандаваў танкавым палком, корпусам. Удзельнік абароны Львова, Кіева, Харкава, баёў пад Варонежам, ва Усходняй Прусіі, Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Літвы. Танкавы корпус пад яго камандаваннем вызваляў Оршу, 3 ліпеня 1944 года першы ўварваўся ў Мінск. У 1954—1963 гадах служыў у БВА. Памёр у 1987 годзе. Імем А. С. Бурдзейнага названа вуліца ў горадзе Мінску.

## УСМІХНЕМСЯ

**Жанчыны любяць разумных мужчын. Вось, напрыклад, калі ў мужчыны прыгожыя рукі, высокі рост, накачаные цела, густыя кучаравыя валасы, то ён разумны мужчына.**

— Вой, я як гэтых монстраў у кіно нагледжуся, начамі не сплю, баюся. Усё мне зомбі ў акно лезуць. А ты не баішся?

— Не, у мяне маскітная сетка.

**Толькі падарожнічаючы можна зразумець, каму ты на самай справе дарагі. Калі чалавек адпісаўся ад цябе ў сацсетках усяго пасля 30-й фатаграфіі з Парыжа — ніякі ён не сябар!**

— Скажы, Мікола, у цябе з жонкай заключаны шлюбны кантракт?

— Я б назваў яго дамовай аб ненападзенні.

**— Нешта цябе на рабоце даўно не відаць? Звольнілі?**

**— Не, сышоў па ўласным жаданні дырэктара.**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3524.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 кастрычніка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# Мясцовае Самакіраванне

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

18 кастрычніка 2019 г. № 42 (527)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# САЦЫЯЛЬНАЯ СЛУЖБА: ІСЦІ Ў НАГУ З ЧАСАМ

**Попыт на сацыяльныя паслугі павышаецца, і гэтая тэндэнцыя набірае абароты. Яна звязана і з тым, што насельніцтва нашай краіны старэе, і з тым, што расце працягласць жыцця, а такім чынам усё большае распаўсюджанне атрымліваюць хваробы пажылога і старэчага ўзросту. Немалаважным фактарам з'яўляецца і тое, што ў краіне даволі высокі ўзровень інваліднасці.**

стар. 4

ВЫБАРЫ-2019

# Стартуе передвыбарная агітацыя

**Акруговыя выбарчыя камісіі 17 кастрычніка завяршылі рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання, паведамляе БелТА.**

Перадвыбарная агітацыя на парламенцкіх выбарах у Беларусі стартуе фактычна з сённяшняга дня — пасля рэгістрацыі прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат. Як праінфармавалі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, усе кандыдаты па Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях, а таксама па горадзе Мінску атрымаюць магчымасць выступіць на тэлеканале «Беларусь 3», а па Мінскай вобласці — на СТВ. Выступленні кандыдатаў у дэпутаты па ТБ і радыё пачнуцца 21 кастрычніка і пройдуць у рабочыя дні да 6 лістапада. Працягласць кожнага абмежавана пяццю хвілінамі. Па тэлебачанні яны будуць трансляваўца ў вячэрні прайм-тайм — з 19.00 да 20.40. «Выключэнне — 22 і 29 кастрычніка, калі эфірны час выдзяляецца з 19.00 да 19.30, з улікам сеткі вяшчання тэлеканала «Беларусь 3», — удакладнілі ў прэс-службе медыяхолдынга. Тут нагадалі, што эфір усім удзельнікам палітычнай гонкі даецца бясплатна і падкрэслілі, што выкарыстанне ў выступленнях аўдыя- і відэаматэрыялаў не дапускаецца.

Радыёвыступленні можна будзе паслухаць з 7.00 да 8.00. Эфірны час кандыдатаў, якія будуць балатавацца па Мінску, выдзеліць «Радыё-Мінск», па Мінскай вобласці — радыёстанцыя «Мінская хваля». Тым, хто будзе вылучацца па іншых абласцях, час адвядуць адпаведныя абласныя тэлерадыёкампаніі.

Для тэледэбатаў эфірны час рэзервуецца з разліку не больш як пяць хвілін аднаму кандыдату. Парадак арганізацыі і правядзення дэбатаў, даты іх правядзення і вядучага вызначаюць тэлерадыёкампаніі.

Сваю перадвыбарную праграму прэтэндэнты на месцы ў парламенце маюць права апублікаваць альбо ў адной з рэспубліканскіх газет («Звязда», «Рэспубліка»), альбо ў адпаведнай абласной газеце ці тых, што выдаюцца на тэрыторыі іх акругі раённай, гарадской газетах. Тэкст кандыдаты павінны прадставіць у СМІ не пазней 27 кастрычніка.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Што зроблена?



Парламентарыі мінулых скліканняў згадалі свой заканатворчы вопыт. стар. 3

### Міні-санаторый



Для вяскоўцаў з-пад Гродна стварылі адмысловы цэнтр вольнага часу, дзе ўсё — бясплатна! стар. 13

### Без перашкод




У Оршы ў цэнтры сацабслугоўвання з'явіўся лесвічны гусенічны пад'ёмнік. стар. 14

### На «зялёнай» хвалі



Як у Полацку і Наваполацку «будуюць» устойлівы гарадскі транспарт. стар. 15

### «Маленькая краіна»



У Заходнім мікрараёне Гомеля ініцыятыўныя жыхары зрабілі дзіцячую зону адпачынку. стар. 16

# КААПЕРАЦЫЙНЫЯ СУВЯЗІ ТРЭБА РАЗВІВАЦЬ

**Такую думку спікер Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч выказаў падчас сустрэчы са старшынёй праўлення карпарацыі Weichai Group Тан Сюйгуанам**

**Сустрэча адбылася на мінулым тыдні ў Савеце Рэспублікі, у ёй таксама ўдзельнічалі міністр прамысловасці Беларусі Павел Уцюпін і генеральны дырэктар ААТ «БелАЗ — кіруючая кампанія холдынга БелАЗ — ХОЛДЫНГ» Пётр Пархомчык.**

— Мы рады, што ў новую эпоху беларуска-кітайскага супрацоўніцтва нашы краіны заўважна актывізавалі двухбаковыя кантакты на вышэйшым і высокім узроўнях, — падкрэсліў, адкрываючы сустрэчу, старшыня Савета Рэспублікі. Ён адзначыў, што, па выказванні лідара КНР Сі Цзіньпіна, двухбаковыя адносіны маюць «усепагодны» характар.

— Сапраўды, нам уяўляецца, што мы можам стварыць прапанаваную кіраўніком КНР супольнасць агульных інтарэсаў і адзінага лёсу, — упэўнены Міхаіл Мясніковіч.

Ён разлічвае, што супрацоўніцтва з групай кампаній Weichai будзе паспяховае. У якасці партнёраў з беларускага боку прапанаваны вядомыя прадпрыемствы МАЗ, БелАЗ, «Гомсельмаш» і іншыя, знакавыя для эканомікі нашай краіны.

Дарэчы, супрацоўніцтва кітайскай карпарацыі з беларускімі машынабудаўнічымі прадпрыемствамі ўжо мае сваю гісторыю: яшчэ ў 2016 годзе было прынятае рашэнне аб стварэнні сумеснага з Weichai Group вытворчасці рухавікоў унутранага згарання. З беларускага боку партнёрам выступіла ААТ «МАЗ». Мемарандум аб будаўніцтве завода быў падпісаны ў прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў. Праект запусцілі ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень». Цяпер рухавікі, што вырабляюцца на новым прадпрыемстве, ужо пастаўляюцца на Мінскі аўтамабільны завод. Таксама дадзены старт будаўніцтву новага сумеснага завода ААТ «МАЗ» і карпарацыі Weichai па вытворчасці каробак перадач.


Фота БелТА.

Але гэта не адзіны партнёр з беларускага боку, з якім кітайскую карпарацыю яднаюць дзелавыя стасункі. Летась быў падпісаны мемарандум аб стратэгічным партнёрстве і супрацоўніцтве ААТ «БелАЗ» з Weichai Holding Group.

— Я ўпэўнены, за гады супрацоўніцтва вы пераканаліся, што ў нас ёсць высокакваліфікаваныя і дысцыплінаваныя прамысловыя кадры, патрэбнае навуковае суправаджэнне, няма карупцыі і на заканадаўчым узроўні забяспечваецца абарона ўласнасці, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

На яго думку, прамысловасць — гэта драйвер развіцця навукі, вытворчасці і інтэлектуальнага патэнцыялу краіны. Таму кааперацыйныя сувязі неабходна развіваць і надалей. Усе інструменты для гэтага, дарэчы, ёсць: стабільнае заканадаўства і прававыя асновы для бізнесу.

— Хацелася б пачуць вашы ацэнкі і прапановы: як развіваецца бізнес у вашых кампаніях у Беларусі, якія існуюць пытанні, пажаданні, якія варта было б прадугледзець у рамках нацыянальнага заканадаўства, ці якія патрабуюць прыняцця адміністрацыйных ці іншых рашэнняў дзеля рэалізацыі сумесных праектаў, — прапанаваў спікер Савета Рэспублікі.

Ён адзначыў, што для яго гэта важна і як старшыні назіральнага савета ААТ «БелАЗ», бо беларускі вытворца хацеў бы бачыць кітайскую карпарацыю ў якасці свайго надзейнага партнёра ў Паднябеснай і прапанаваў стварыць сумеснымі намаганнямі пункт апоры ў Кітаі па вытворчасці і рэалізацыі кар'ернай тэхнікі для патрэб рынку гэтай краіны і краін Паўднёва-Усходняй Азіі.

— Адначасова я прапаную нашы сумесныя праекты разглядаць як акно магчымасцяў для рэальнага напаўнення глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс. Адзін шлях».

Тан Сюйгуан высока ацаніў узровень супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі, у прыватнасці, ААТ «БелАЗ»:

— Мы добра выканалі свае інвестыцыйныя абавязацельствы. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца здача ў эксперыментальную эксплуатацыю сумеснага праекта «Вейчай—БелАЗ», — падсумаваў ён.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

### ❍ ДАВЕДКА «МС»

Weichai — адна з найбуйнейных у Кітаі машынабудаўнічых карпарацый. Штаб-кватэра знаходзіцца ў горадзе Вэйфан правінцыі Шаньдун. Вытворчыя ж пляцоўкі размешчаны ў Кітаі, Паўднёва-Усходняй Азіі, а таксама Еўропе і Паўночнай Амерыцы.

Weichai ўваходзіць у топ 500 кампаній Кітая, займаючы 84-ю пазіцыю, у топ 500 прамысловых прадпрыемстваў Кітая з 27-м месцам, а ў топе 500 машынабудаўнічых кампаній Кітая ёй адводзіцца 2-е месца.

Карпарацыя з'яўляецца адным з сусветных лідараў па вытворчасці рухавікоў, электрагенератараў, транспартных сродкаў і аўтамабільных кампанентаў. Weichai Group валодае сур'ёзнымі інвестыцыйнымі магчымасцямі і вопытам інвестыцыйнага супрацоўніцтва ў Еўропе.

Дарэчы, старшыня праўлення гэтай карпарацыі Тан Сюйгуан двойчы станавіўся Чалавекам года Кітая.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ДАПАМОГА САЦЫЯЛЬНА ЎРАЗЛІВЫМ

**Дваццаць званкоў прыняла падчас прамой лініі старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ. Большая частка з тых, хто дазваніўся, — жыхары Гомеля. Але ж выйшлі на сувязь і грамадзяне з Калінкавіч, Жлобінскага і Гомельскага раёнаў. Тэматыка зваротаў была вядомая: праблемы ЖКГ, сацыяльнае абслугоўванне, асабістыя просьбы.**

Дзяўчына, інвалід другой групы папрасіла дапамагчы ёй у рэабілітацыі. Кацярына Анатольеўна паабяцала, што ў найбліжэйшы час гэта стане магчыма. Маці дзяўчыны — інваліда трэцяй групы патэлефанавала, каб расказаць пра цяжкасці з працаўладкаваннем дачкі-кветкавода. Варыянты работы падбяруць службы занятасці.

Яшчэ адна гісторыя, якая пакуль застаецца на кантролі: жанчына, інвалід першай групы, паведаміла, што шукае сацыяльнага работніка, які б згадзіўся даглядаць яе і мужа — ён да апошняга часу быў афармлены як сацыяльны работнік, але захварэў сам. Цяпер абодвум сужэнцам патрэбна дапамога.

Вельмі многа гэтым разам было зваротаў ад жыхароў Чыгуначнага раёна абласнога цэнтра. У асноўным яны датычыліся праблем у сферы ЖКГ. Напрыклад, людзі аднаго з дамоў па вуліцы Агарэнкі прасілі прывесці ў парадак пад'езд, у якім памянялі ліфт. Справа ў тым, што напярэдадні гэтай падзеі жыхары за свой кошт правялі касметычны рамонт пад'езда, які быў сапсаваны пры замене ліфта.

Таксама на прамую лінію старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярыны Зенкевіч звярталіся з праблемамі спілавання аварыйных дрэў, просьбамі пачысціць калодзеж, разабрацца ў судовых рашэннях і іншымі пытаннямі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# УСЕ ПОМНІКІ БУДУЦЬ УНЕСЕНЫ Ў СПІСЫ

**Пра выкананне патрабаванняў заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны і распараджэння Прэзідэнта аб добраўпарадкаванні месцаў пахавання гаварылі на Дубровеншчыне на выязным пасяджэнні прэзідыума абласвета дэпутатаў. У ім бралі ўдзел старшыні гарадскіх і раённых, а таксама сельскіх Саветаў.**

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** канстатаваў, што ў вобласці каля 960 гісторыка-культурных каштоўнасцяў — і гэта другі ў краіне паказчык.

Улічваючы, што налета будзе святкавацца 75-я гадавіна Вялікай Перамогі, у цэнтры ўвагі ўсё, што ўвекавечвае подзвігі барацьбітоў з ворагам, памяць аб ахвярах фашысцкіх акупантаў, пакутах нашых землякоў.

Шмат чаго было зроблена для прывядзення памятных месцаў у парадак у рамках выканання запланаваных мерапрыемстваў «Года малой Радзімы» і напярэдадні юбілею вызвалення Беларусі.

Канешне, і раней на тэрыторыі манументальных комплексаў, вайсковых могілак стараліся падтрымліваць парадак, каб помнікі былі ў добрым стане.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ** паведаміў прысутным, што да красавіка 2020 года будзе ўстаноўлена каля 370 указальнікаў да месцаў пахавання, якія знаходзяцца далёка ад вёсак і дарог.

Дарэчы, сёння ў вобласці больш за 1460 вайсковых могілак. Вечны спакой там знайшло каля 402 тысяч чалавек. І, на жаль, прозвішчы прыблізна 206 тысяч — невядомыя.

**Начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Пётр ПАДГУРСКІ** адзначыў, што сёлета ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў унеслі мемарыяльны комплекс «Суражскія вароты», а таксама помнік, прысвечаны падзеям вайны 1812 года, — у аграгарадку Вароны Віцебскага раёна. Ён падкрэсліў, што трэба ва ўсіх раёнах правесці інвентарызацыю памятных аб'ектаў па ўсіх правілах. У прыватнасці, нямала помнікаў усталявалі ў 1990-я гады, але належным чынам неабходную дакументацыю не афармілі.

Удзельнікі мерапрыемства наведалі некалькі знакавых месцаў на тэрыторыі раёна. Пабывалі ў парку райцэнтра, дзе многае зроблена, каб тутэйшым і прыезджым было цікава і ўтульна.

Дэпутаты азнаёміліся і з ходам рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Рыленкі». Там пахавана каля 9,6 тысячы салдат і афіцэраў, імёны якіх вядомыя. У «Рыленках» старшыня абласвета Уладзімір Цярэнцьеў узяў удзел у закладцы яблыневай алеі. Ён даў высокую ацэнку кіраўніцтву раённай вертыкалі выканаўчай улады ў справе захавання помнікаў, абеліскаў, могілак. І падзякаваў тым, хто карпатліва займаецца пошукавай работай, каб засталося меней невядомых імёнаў салдат.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**



# ПАД ПІЛЬНАЙ УВАГАЙ

**Місія БДІПЧ АБСЕ пачала назіранне за парламенцкай кампаніяй у Беларусі.**

Па запрашэнні беларускіх уладаў назіральнікі ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ адкрылі місію па назіранні за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Такая інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце АБСЕ.


Фота БелТА.

Місія, якую ўзначальвае Карнелія Вільямін Анке Ёнкер, складаецца з асноўнай групы ў складзе 11 экспертаў, якія знаходзяцца ў Мінску, і 30 доўгатэрміновых назіральнікаў, якія будуць працаваць па ўсёй краіне з 23 кастрычніка. Акрамя таго, чакаецца, што дзяржавы — удзельніцы АБСЕ накіруюць 400 кароткатэрміновых назіральнікаў, якія прыедуць у нашу краіну за некалькі дзён да выбараў.

Місія ацэніць правядзенне выбараў на адпаведнасць абавязацельствам у рамках АБСЕ і іншым міжнародным абавязацельствам і стандартам дэмакратычных выбараў, а таксама нацыянальнаму заканадаўству.

Неад'емнай часткай назірання стануць сустрэчы з прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады, палітычных партый, грамадскай супольнасці, сродкаў масавай інфармацыі і міжнароднай супольнасці.

У прыватнасці, кіраўнік місіі БДІПЧ ужо сустракалася з намеснікам міністра замежных спраў Беларусі Алегам Краўчанкам. Бакі абмеркавалі пытанні, звязаныя з арганізацыяй міжнароднага назірання па лініі БДІПЧ.

* * *

**Назіральнікі ад Савета Еўропы плануюць прыехаць на выбары ў Беларусь 13 лістапада.**

Пра гэта журналістам паведаміла старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына. Яна праінфармавала, што Савет Еўропы паведаміў беларускаму боку аб накіраванні місіі назіральнікаў: «Місія ад іх таксама будзе. Яна мае намер прыехаць 13 лістапада».

Дарэчы, 15 кастрычніка кіраўніцтва ЦВК сустракалася з кіраўніком місіі БДІПЧ АБСЕ па назіранні за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Карнэліяй Вільямін Анке Ёнкер. «Мы паведамілі, што адбывалася падчас выбарчай кампаніі з моманту прызначэння выбараў. Гэта была інфармацыйная сустрэча, дзе мы падалі звесткі і выдалі пасведчанні», — адзначыла Лідзія Ярмошына.

У склад першай пастаяннай місіі ад БДІПЧ АБСЕ ўключана больш за 30 чалавек. «Гэта тыя, хто будзе працаваць да пачатку галасавання. Асноўная місія БДІПЧ АБСЕ прыедзе 13—15 лістапада», — дадала старшыня Цэнтрвыбаркама.

Па звестках на 14 кастрычніка, акрэдытацыю на парламенцкіх выбарах у Беларусі атрымалі 326 міжнародных назіральнікаў, у тым ліку 278 чалавек ад СНД, 42 — ад БДІПЧ АБСЕ.

* * *

**Місія СНД адзначае спакойны і планамерны ход падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў.**

Аб гэтым журналістам паведаміў **старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.**

Назіральнікі ад СНД пачалі работу 4 верасня. На базе Выканаўчага камітэта СНД быў створаны штаб, начальнік і члены якога ўжо сустракаліся з прадстаўнікамі Генеральнай пракуратуры, Вярхоўнага суда, міністэрстваў замежных спраў, унутраных спраў. Абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі і правядзення парламенцкіх выбараў. Місія знаходзіцца ў пастаянным кантакце з Цэнтральнай выбарчай камісіяй, члены штаба прысутнічаюць на ўсіх пасяджэннях ЦВК. Акрамя таго, прадстаўнікі місіі назіральнікаў СНД — а яны прадстаўляюць розныя дзяржавы — пабывалі ўжо ва ўсіх абласцях Беларусі, дзе назіралі за падрыхтоўкай да выбараў.

«Нас радуе спакойны, планамерны ход падрыхтоўкі да выбараў», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

Місія СНД канстатуе вялікую ўвагу з боку ўсіх структур улады Беларусі да падрыхтоўкі да выбараў. Агульная задача, пастаўленая на самым высокім узроўні, — забяспечыць годнае іх правядзенне, правы грамадзян Беларусі на свабоднае волевыяўленне.

Вядзецца рэгістрацыя назіральнікаў ад СНД. Заяўкі паступаюць ад усіх дзяржаў-членаў. «Ужо цяпер зарэгістравана 302 назіральнікі з краін Садружнасці, якія пачнуць назіранне напярэдадні выбараў. Яны звычайна прыязджаюць дні за тры-чатыры. Мы лічым, што агульная колькасць нашай місіі складзе прыкладна 400 чалавек», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

У склад місіі ўключаны дэпутаты парламентаў краін Садружнасці, прадстаўнікі ЦВК, дыпламаты краін СНД, акрэдытаваныя ў Мінску.

«Ніякай інфармацыі аб скаргах у пракуратуру, МУС, з якімі мы ў цесным кантакце, пакуль не атрымлівалі. Але мы сочым за сітуацыяй. Натуральна, калі з'явяцца нейкія скаргі, будзем іх фіксаваць. А рэагаваць будуць адпаведныя органы Беларусі», — адзначыў Сяргей Лебедзеў.

Нагадаем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаны на 17 лістапада.

**Паводле БелТА**

# Перыяд для актыўных

## Сярод прэтэндэнтаў на месцы ў парламенце Беларусі становіцца ўсё больш моладзі

**У перспектыве ў ніжняй палаце парламента плануецца стварыць маладзёжную групу, якая будзе працаваць над законапраектамі ў цеснай звязцы з вопытнымі дэпутатамі. Пра гэта журналістам паведаміла старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ Кацярына Петрашкевіч.**

Па звестках ЦВК, колькасць маладых людзей да 30 гадоў сярод вылучэнцаў на выбарах у Палату прадстаўнікоў вырасла.

Кацярына Петрашкевіч паведаміла, што сярод прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты каля 10 членаў БРСМ. Хтосьці вылучыўся шляхам збору подпісаў, хтосьці ад працоўнага калектыву або палітычнай партыі. У саюзе моладзі плануюць стварыць у парламенце маладзёжную групу, члены якой акрамя непасрэднага ўдзелу ў распрацоўцы законапраектаў будуць вырашаць разам з вопытнымі парламентарыямі стратэгічныя задачы. «Гэта будзе тая сувязь, калі законапраект ёсць, і далей мы слухаем моладзь», — адзначыла старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ.

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі правёў у Мінску семінар-трэнінг «Беларусь і Я» з удзелам больш чым 250 прадстаўнікоў маладзёжнай арганізацыі: кіраўнікоў штабоў саюза моладзі па выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання, членаў акруговых камісій, акрэдытаваных назіральнікаў, маладых дэпутатаў мясцовых саветаў з усіх рэгіёнаў краіны, кандыдатаў БРСМ у беларускі парламент. Аналагічныя семінары яшчэ пройдуць у рэгіёнах. Кацярына Петрашкевіч падкрэсліла, што асноўная задача праекта — павышэнне электаральнай актыўнасці моладзі.

**Паводле БелТА.**

«МС» СПЫТАЛА

# ПАСАДА, ЯКАЯ НЕ МАЕ МІНУЛАГА ЧАСУ

**Выбарчая кампанія ў парламент — у самым разгары. Збор подпісаў ужо завяршыўся, і ў хуткім часе будуць дакладна вядомы імёны ўсіх кандыдатаў. Мы звярнуліся да дэпутатаў папярэдніх скліканняў з пытаннем, якімі значнымі законамі вызначыліся скліканні, дзе яны працавалі. Адзначу, што былых дэпутатаў не бывае. Кожны з іх нават пасля скончання тэрміну захоўвае гэты ранг.**

У першым (1996—2000 гады), другім (2000—2004 гады) і трэцім (2004—2008 гады) дэпутацкіх скліканнях суверэннай Беларусі працаваў **Ігар Васілевіч КАТЛЯРОЎ, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь** і,


Фота БелТА.

як ён адзначыў, адзіны сацыёлаг у краіне з гэтым званнем. Ігар Васілевіч паведаміў, што гэтыя часы, перыяд станаўлення, былі вызначальныя для айчыннага парламентарызму.

«Работа ў парламенце вельмі складаная. Ён дае кірункі развіцця, калідоры для ўсёй дзяржавы сваімі законамі. У ніжняй палаце нават першага склікання былі прафесіяналы, якія разумелі, што трэба рабіць і якім чынам», — расказвае Ігар Васілевіч.

Да выбрання ён працаваў на пасадзе дырэктара Беларускага інстытута прагнозу. У часы дэпутацтва і ўвогуле амаль усё жыццё Ігар Катляроў займаецца сацыялогіяй. Таму ўсе законы, што прымала камісія, у склад якой ён уваходзіў, базіраваліся на вывучэнні грамадскай думкі. «Многія акты, якія мы тады прымалі, эфектыўна працуюць і сёння ў новай структуры і сістэме», — паведаміў навуковец.

Напрыклад, закон аб адукацыі абмяркоўвалі доўга — закраналіся пытанні матэрыяльнага забеспячэння настаўнікаў, патрабаванне для іх сярэдняга заробку па краіне, а для дактароў навук і прафесараў вышэй за гэту норму.

Сярод актуальных і запатрабаваных дакументаў, якія прынялі ў тыя часы, парламентарый адзначыў закон аб палітычных партыях: «Сёння палітычныя партыі з'яўляюцца адным з найважнейшых элементаў беларускай грамадзянскай супольнасці. Мы не часта пра іх успамінаем, але набліжаюцца выбары, а партыі — сацыяльныя актары, якія робяць значны ўнёсак у развіццё мажарытарнай сістэмы выбараў». Была прынятая і канцэпцыя фарміравання грамадзянскай супольнасці, дзякуючы якой выпрацавалі шматлікія законы для развіцця гэтай сферы.

Ігар Катляроў, які ў Палаце прадстаўнікоў курыраваў пытанні навукі, быў аўтарам закона аб дзяржаўнай падтрымцы інавацыйнай дзейнасці. Дакумент значна паўплываў на развіццё навукі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Дэпутат *Ларыса Мікалаеўна* БАГДАНОВІЧ** працавала


www.house.gov.by.

ў чацвёртым (2008—2012 гады) і пятым (2012—2016 гады) скліканнях. Яна адзначае, што акрамя напружанай работы дэпутацтва, запомнілася сяброўскімі сувязямі, мноствам зносін з грамадзянамі, разнастайнасцю дзейнасці. Жыццё дэпутата часам нагадвала студэнцкія гады — кожныя выхадныя яна ездзіла ў Брэст да сям'і.

«Гэта вельмі важны, цікавы і прадукцыйны перыяд маёй працоўнай дзейнасці, які адрозніваўся новым вопытам, — у заканатворчасці. Гэтым чалавек, кім бы ён ні працаваў, не займаецца. Нават калі працуеш кіраўніком, ты толькі карыстаешся заканадаўчай базай, а не распрацоўваеш яе», — расказвае Ларыса Багдановіч.

Ад дэпутата, на яе думку, у першую чаргу запатрабаваны дыпламатычнасць, карэктнасць, кампетэнтнасць, прыстойнасць, упэўненасць, працаздольнасць і цярпенне, бо яго ініцыятывы не могуць быць рэалізаваны адразу і сёння.

Ларыса Багдановіч у 2014—2015 гадах уносіла прапановы, якія рэалізаваліся пазней, — аб захаванні месцаў работы за прызыўнікамі, аб аплаце камунальных паслуг у садовых таварыствах і дачных кааператывах.

Асноўныя пытанні, якімі займалася падчас дэпутацтва ўрач-рэабілітолаг Ларыса Мікалаеўна, мелі сацыяльную сутнасць.

Па словах дэпутата, асабліва запомнілася работа над папраўкамі ў Працоўны кодэкс па 170 артыкулах. Туды былі унесены новы раздзел аб адносінах у прафесійным спорце, удакладнены статус работніка-надомніка, дазволена сумяшчальніцтва на некалькіх прадпрыемствах у выхадныя дні і ў адпачынку.

Па прапанове парламентарыя змянілі Грамадзянскі кодэкс у частцы афармлення апякунства над асобамі, якія знаходзяцца ў каматозным стане. Яна працавала над законам аб сацыяльным абслугоўванні насельніцтва, куды былі дададзеныя новыя паслугі і раздзел аб дзяржаўным сацыяльным заказе.

Займалася Ларыса Багдановіч законамі аб трансплантацыі і аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях. «Сёння гэта вельмі вялікая праблема. Льготны крэдыт для сем'яў, якія скарысталіся дапаможнымі рэпрадуктыўнымі тэхналогіямі, — гэта ініцыятыва мая і нашай камісіі», — адзначае дэпутат.

«Было шмат пытанняў, па якіх спрачаліся, дыскутавалі. Многія пытаюцца: чаму гэтага не бачна ў зале? Бо гэта не варта выносіць. Што, трэба сварыцца, біцца? Не і яшчэ раз не. Толькі карпатлівая праца будзе даваць вынік», — упэўнена Ларыса Багдановіч.

Пасля скончэння тэрміну дэпутат працягвае працаваць для грамадства. Сёння разам з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) яна займаецца рэабілітацыяй дзяцей на ранніх стадыях цяжкіх захворванняў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

## Для доўгага і якаснага жыцця

**Намеснік старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, кіраўнік Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ падзяліўся вопытам дапамогі састарэлым і людзям з абмежаванымі магчымасцямі. У Прыдзвінні ўсё насельніцтва складае каля 1,2 мільёна жыхароў, з іх прыблізна 297 тысяч (25,3 %) — пажылых, 59,3 тысячы (5,1 %) — з інваліднасцю.**

Нядаўна з адпаведнай справаздачай дэпутат выступіў на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама. **Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ** падкрэсліў, што ўжо многае зроблена, каб сацыяльная дапамога была на высокім узроўні. Але якасць трэба павышаць і надалей, каб задаволіць кожнага, хто мае патрэбу ў дзяржаўнай падтрымцы.

Мэта — забяспечыць доўгае жыццё ў годных умовах для тых, каму неабходна дапамога. Для прафесіяналаў гэта не праблема, бо ёсць вопыт, жаданне працаваць, добрая матэрыяльна-тэхнічная база ва ўстановах сацыяльнага прызначэння.

Дарэчы, вопыт Віцебскай вобласці па сацыяльнай абароне не раз высока адзначаўся кіраўніцтвам профільнага міністэрства. І прызавыя месцы ў ацэнцы работы — ужо штогадовая традыцыя.

Калі казаць сухой моваю статыстыкі, то ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва паслугі аказваюць прыблізна 43 тысячам грамадзян. У 15 стацыянарах жыве больш за 3,6 тысячы чалавек. Плённа працуе і каля 30 аддзяленняў дзённага знаходжання інвалідаў. Іх пастаянна наведвае каля 1,2 тысячы людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У гэтых установах функцыянуе каля 85 рэабілітацыйна-працоўных майстэрняў, 425 гурткоў па інтарэсах.

Трэба сказаць, што той, хто мае патрэбу ў сацыяльным абслугоўванні, можа выбраць найбольш прымальную форму.

Каб паслугі былі ўсім па кішэні, аблвыканкамам замацаваны нізкі тарыф — 55 капеек за гадзіну. Найбольш запатрабаваная дапамога на даму, яе атрымліваюць 15,3 тысячы жыхароў вобласці.

Цікава, што так званыя разавыя сацыяльна-бытавыя паслугі аказваюцца 19 гаспадарчымі брыгадамі і 25 брыгадамі сацыяльнага абслугоўвання на мабільнай аснове.

Становіцца ўсё больш папулярным пражыванне састарэлых у так званых замяшчальных сем'ях: у вобласці іх каля трыццаці.

Пенсіянерам, інвалідам, у тым ліку і дзецям з абмежаванымі магчымасцямі, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, а таксама для іх бяспечнага пражывання са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання аказваецца матэрыяльная дапамога. Толькі ў першым паўгоддзі яе сума перавысіла 440 тысяч рублёў. Грошы атрымала каля 8 тысяч грамадзян.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# САЦЫЯЛЬНАЯ СЛУЖБА: ІСЦІ Ў НАГУ З ЧАСАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Пры гэтым спецыялісты адзначаюць, што нацыянальная сістэма сацыяльнага абслугоўвання пастаянна ўдасканальваецца. Яе аснову складаюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якія пастаянна шукаюць новыя формы работы са сваімі падапечнымі. Канешне, асноўныя паслугі зацверджаны і прапісаны ў нарматыўных дакументах, якія рэгулююць іх дзейнасць. Але разам з імі з'яўляюцца і цікавыя навінкі.

Напрыклад, у Бярозаўскім раёне, што на Брэстчыне, на базе ТЦСАН створаны цэнтр псіхалагічнай разгрузкі. Для пажылых людзей сталі даступныя кансультацыі прафесійнага псіхолага, гурткі па арт-тэрапіі і кіно. А ў Пружанскім раёне з мэтай стварэння лепшых умоў жыцця для пажылых людзей і павышэння іх інфармаванасці абсталяваны камп'ютарны клас, адкрытыя школа прыгажосці і здароўя, класы па вакале. І так практычна ў кожным ТЦСАН — апрацоўваюцца новыя формы работы і адбываецца абмен вопытам.

Апошнім часам назіраюцца і больш глабальныя змены ў саміх прынцыпах дзейнасці сацыяльнай службы.

«З гэтага года зменены падыход да выяўлення людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе дзяржавы, — паведаміў журналістам напярэдадні Дня пажылога чалавека **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** — Мы перайшлі ад заяўнага прынцыпу да выяўляльнага, каб максімальна забяспечыць сацыяльную падтрымку». Гэта значыць, органы сацабароны больш актыўна пойдуць да тых, хто мае патрэбу ў іх паслугах, каб спрацаваць на прафілактыку, прадухіліць крызіс у жыцці асобнага чалавека.

Галоўным кірункам сацпаслуг намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны называе развіццё стацыянаразамяшчальных паслуг, якія дазваляюць максімальна падоўжыць знаходжанне пажылых непрацаздольных людзей у хатніх умовах.

Такі падыход, з аднаго боку, зніжае нагрузку на бюджэт і аблягчае работу сацыяльнага работніка. З другога — дазваляе палепшыць жыццё адзінокім пажылым людзям. Бо сёння асноўная задача дзяржавы заключаецца не ў тым, каб змясціць адзінокага пажылога чалавека ў нейкую стацыянарную ўстанову. Галоўнае — максімальна захаваць знаходжанне чалавека ў сям'і, даць яму магчымасць зносін і дапамагчы весці звыклы лад жыцця.

## Новая сям'я

З 2018 года пачала ўкараняцца такая новая форма сацыяльнага абслугоўвання, як пражыванне пажылых альбо паўналетніх непрацаздольных людзей у замяшчальных сем'ях. На сёння ў нашай краіне ёсць 89 такіх сем'яў, у якіх пражываюць 90 пажылых людзей. Гэта значыць, фактычна тыя людзі набылі новую сям'ю. «Мы вельмі рады, што такая сацыяльная паслуга атрымала развіццё. Я ўпэўнены, што яна мае добрыя перспектывы, — адзначае намеснік міністра. — Для адзінокага пажылога чалавека падбіраецца сям'я, гатовая жыць з ім разам».

Пры гэтым важна тое, што сацыяльныя службы ў такім выпадку таксама не адыходзяць убок. Яны з'яўляюцца трэцім удзельнікам гэтых узаемаадносін: падбіраюць сям'ю для чалавека, які мае ў гэтым патрэбу, каардынуюць усю дзейнасць, здзяйсняюць псіхалагічную падтрымку і патранаж такой сям'і. Такім чынам дзяржава памяншае рызыку злоўжыванняў у адносінах да пажылога чалавека або інваліда.

— Заключаецца дагавор паміж чалавекам, сям'ёй, якая яго прымае, і прадстаўніком выканкама ці адміністрацыі раёна, — тлумачыць Аляксандр Румак. — Гэта дапамагае нам адысці ад дапамогі па доглядзе, якая цяпер выкарыстоўваецца. Яна даўно ўжо патрабуе карэкціроўкі. У замяшчальных сем'ях прадугледжана выплата ўзнагароды, калі ў сям'ю бяруць інваліда першай групы або чалавека, старэйшага за 80 гадоў. І тут ужо няма абмежаванняў, якія ёсць пры прызначэнні дапамогі па доглядзе за такімі людзьмі, — такіх як наяўнасць працаздольнага ўзросту ў таго, хто ажыццяўляе догляд, і адсутнасць у яго работы. Людзі, якія ўзялі ў сваю сям'ю пажылога чалавека, могуць працягваць працаваць і пры гэтым атрымліваць узнагароджанне за прыняцце ў сваю сям'ю іншага чалавека.

Запатрабаванымі сярод адзінокіх жыхароў у рэгіёнах застаюцца і дамы зімоўкі, якія прываблівацюць людзей цеплынёй, утульнасцю і добрай кампаніяй.

## Як падтрымаць сем'і, дзе ёсць чалавек з дэменцыяй?

Цяпер прадумваецца комплекс новых паслуг для грамадзян з дэменцыяй і членаў іх сем'яў. Мяркуецца, што гэтыя паслугі будуць запатрабаваныя ў сувязі з ростам працягласці жыцця і павелічэннем колькасці захворванняў, характэрных для пажылых людзей. У Еўропе ўжо цяпер дэменцыю лічаць адной з эпідэмій XXI стагоддзя, разам з анкалогіяй.

Па выніках даследаванняў, пажылыя людзі з кагнітыўнымі парушэннямі і дэменцыяй доўгі час могуць даволі паспяхова жыць дома і займацца самаабслугоўваннем, але маюць цяжкасці ў арыентацыі ў горадзе, карыстанні грамадскім транспартам, карыстанні паслугамі розных устаноў, правядзенні разлікаў і аплаты, напрыклад, за кватэру. Ім робіцца складана мець зносіны, знікаюць захапленні і інтарэсы, зніжаецца сацыяльная актыўнасць, з'яўляецца замкнёнасць.

Таму, па словах **загадчыцы аддзела развіцця інавацыйных формаў сацыяльнага абслугоўвання НДІ працы Мінпрацы і сацабароны Наталлі МІЛЬКОТА**, важна праводзіць адукацыйныя мерапрыемствы, каб спецыялісты арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя, медыцынскія і іншыя паслугі, маглі распазнаць праявы дэменцыі, не прыняўшы іх за праявы старасці або «шкоднага характару», і своечасова аказаць падтрымку.

Пры гэтым падтрымаць такіх людзей можна як змясціўшы іх у стацыянарны дом-інтэрнат, так і ў надомных умовах.

Адным з самых запатрабаваных відаў падтрымкі спецыялісты лічаць арганізацыю дзённага знаходжання пажылых людзей з кагнітыўнымі парушэннямі і дэменцыяй на базе сацыяльнай установы. Даюць плён таксама індывідуальныя візіты на дом. Такая арганізацыя дапамогі пажылым людзям дазваляе ім уключаца ў розныя віды творчасці, падтрымліваць фізічную актыўнасць, мець зносіны, успамінаць і зноў перажываць самыя яркія моманты свайго жыцця, захоўваючы пачуццё ўласнай годнасці. А члены іх сем'яў пры такім падыходзе не стануць перад неабходнасцю кідаць работу, каб даглядаць сваяка. Яны будуць мець магчымасць працягваць працаваць, не хвалюючыся пра бяспеку і камфорт сваіх блізкіх.

## Патрэбная дапамога

Пра яшчэ адно новаўвядзенне ў дзейнасці тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якое можа з'явіцца ў найбліжэйшай будучыні, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак паведаміў, выступаючы на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў, прысвечаным укараненню інавацыйных формаў сацыяльнага абслугоўвання ў інтарэсах людзей з інваліднасцю.

— Часам бывае, што чалавек, атрымаўшы заключэнне МРЭК, дзе яму прысвойваецца група інваліднасці, аказваецца сам-насам са сваімі праблемамі, — сказаў намеснік міністра. — Таму мы хочам перафарматаваць аддзяленні дзённага знаходжання для людзей з інваліднасцю ў ТЦСАН, каб у іх былі і спецыялісты па сацыяльнай рэабілітацыі, якія кантактавалі б з МРЭК. І як толькі чалавек атрымае інваліднасць, яны адразу будуць прыходзіць яму на дапамогу і вызначаць, што неабходна для сацыяльнай рэабілітацыі, у тым ліку для яго далейшага працаўладкавання.

**Святлана БУСЬКО.**



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

**Сацыяльныя паслугі грамадзянам і сем'ям, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, ажыццяўляюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На ўліку ў іх знаходзяцца 2 024 422 чалавекі (дадзеныя па стане на 01.04.2019). З іх 91 305 чалавек абслугоўваюцца дома.**

Тэлесеткі

# НАШЧАДКІ — ПОМНЯЦЬ

**Журналісты Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі прыступілі да здымак новых серый праекта «Беларусь памятае», у якіх раскажуць не толькі пра падзеі на фронце, але і пра лёсы людзей, якія жылі на акупаванай тэрыторыі падчас Вялікай Айчыннай вайны, пра трагедыі цэлых населеных пунктаў, што былі знішчаны разам з жыхарамі.**

У мінулым тэлевізійным сезоне творчая каманда АТН падрыхтавала 10 відэаролікаў пад агульнай назвай «Беларусь памятае», прысвечаных 75-годдзю вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У кожным міні-фільме былі рэканструяваны падзеі на фронце, а ролі рэальных салдат і афіцэраў выконвалі іх дзеці і ўнукі.

Цяпер праект раскажа не толькі пра герояў вайны, якія змагаліся на фронце і ў тыле, але і пра мірных жыхароў ваеннага ліхалецця. Так, у адной з серый у сучаснай студэнткі Крысціны Яўцішэнкавай з'явіцца магчымасць візуальна ўвасобіць успаміны пра сваю прабабулю — адлюстраваўшы падзеі тых часоў на палатне і ў кадры. Яе прабабуля Аляксандра Андрэеўна Малышка родам з вёскі Задуб'е Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, якую гітлераўцы спалілі 29 снежня 1943 года, знішчыўшы 48 жыхароў і 149 двароў. Аляксандры Андрэеўне ўдалося выжыць, але яна страціла трох сваіх дзяцей, якіх жорстка забілі фашысты. Пасля вайны гераіня змагла выгадаваць яшчэ чатырох дзяцей. Вёску таксама адрадзілі, а яе ахвяр назаўсёды ўвекавечылі ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».


Фота прэс-службы БТРК.

Для здымак творчая група АТН адправілася ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо Мінскага раёна. Таксама тэлевізійнікі працуюць у Смалявічах і ў Хатыні. З дапамогай высокатэхналагічнага абсталявання, здымак у паветры, выкарыстання разнастайнай піратэхнікі журналісты імкнуцца перадаць маштабы трагедыі вайны на прыкладзе адной канкрэтнай вёскі.

— Мы працягваем праект, бо ў нас шмат герояў і сярод мірных жыхароў, пра якіх абавязкова трэба расказваць, — адзначае выканаўчы **прадзюсар АТН Руслан ТУРКОЎ.** — Наш праект зацікавіў маладое пакаленне, хлопцы і дзяўчаты паднялі сваю асабістую гісторыю, каб даведацца, кім былі іх дзяды і прадзеды ў часы вайны і які ўнёсак яны зрабілі ў Вялікую Перамогу, 75-годдзе якой мы будзем адзначаць у маі.

Новыя ролікі з цыкла «Беларусь памятае» будуць выходзіць у эфіры «Беларусь 1». А знятыя раней міні-фільмы ёсць у доступе на афіцыйным YouTube-канале Агенцтва тэленавін.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ
Выпуск № 79

Аўтар наступнай задачы *(гл. дыяграму)* — мінскі складальнік Вадзім Іваноў.



**Белыя:** Kpg4, Фh4, Cc6, Kb4, пп. g6, g7 (6).

**Чорныя:** Kpe6 (1).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Кубак свету ў Ханты-Мансійску (128 удзельнікаў) выйграў азербайджанскі гросмайстар Тэймур Раджабаў, які ў фінале перамог кітайца Дзін Ліжэня ў дзвюх дадатковых бліц-партыях. У матчы за трэцяе месца француз Максім Ваш'е-Лаграў адолеў другога кітайца — Юй Ян'і. Адзіны беларускі прадстаўнік, Аляксей Аляксандраў, як мы ўжо паведамлялі, выбыў з барацьбы ў першым жа коле.

У казахстанскім Актобе прайшоў камандны Кубак Уладзіміра Дварковіча сярод юнакоў і дзяўчат 2002 года нараджэння і маладзейшых. Зборная Беларусі выйграла восем матчаў і адзін звяла ўнічыю, у выніку ўпэўнена заняўшы першае месца. На другім — Кітай, на трэцім — Расія. Потым адбыўся асабісты бліц-турнір (39 удзельнікаў), дзе нашы шахматысты таксама выступілі добра: Вячаслаў Заруцкі заняў другое месца, Дзяніс Лазавік — трэцяе. Вольга Бадэлька фінішавала 19-я, а юная Саша Тарасенка — 29-я (але ў асабістай сустрэчы перамагла Вольгу).

Беларускія каманды ўзялі ўдзел і ў «першым камандным чэмпіянаце свету сярод школьнікаў», як гучна назвалі гэты турнір арганізатары, — у Цахкадзоры (Арменія). Юнакі занялі пятае месца з васьмі, а дзяўчаты — шостае з сямі.

А на турніры ў Львове беларускі ўдзельнік Арцём Сіняўскі вызначыўся сваім міралюбствам: усе 9 партый звёў унічыю. У выніку — шостае месца.

* * *

Брэст вядомы ў Беларусі як горад з даўнімі і моцнымі шахматнымі традыцыямі. Нядаўна адбыўся яго чарговы чэмпіянат. Як паведаміў наш чытач Віктар Жук, за прызавыя месцы змагаліся тры майстры, чатыры кандыдаты ў майстры і дзесяць наймацнейшых першаразраднікаў. Набраўшы сем ачкоў з васьмі магчымых, чэмпіёнам Брэста пяты раз стаў майстар ФІДЭ, вядомы трэнер Уладзіслаў Каташук, які ўжо заваёўваў гэты тытул у 1999, 2001, 2003 і 2006 гадах. «Серабро» — у майстра спорту Дзмітрыя Буланава (чэмпіёна Брэста 2005, 2008 і 2017 гадоў), «бронза» — у кандыдата ў майстры дзесяцікласніка Міхаіла Яшчука (чэмпіёна 2018 года).

У мужчынскім чэмпіянаце ўдзельнічала і сёлетняя чэмпіёнка Беларусі сярод жанчын, 13-гадовая Аляксандра Тарасенка, якая ў выніку заняла чацвёртае месца.

А вось дзве цікавыя партыі з першынства горада над Бугам.

Дз. Буланаў — А. Алішэвіч. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kc3 Kf6 4. e5 Kfd7 5. Kce2 c5 6. c3 f6 7. f4 Ce7 8. Kf3 fe 9. de 0-0 10. Kg3 Ch4 11. Cd3 Kc6 12. Фc2 h6 (12...g6 13. C:g6 hg 14. Ф:g6+ Kph8 15. Фh6+) 13. Фe2 a6 14. 0-0 C:g3 15. hg Фb6 16. Cb1 Ле8 17. g4 d4 18. c4 Kf8 19. g5 hg 20. K:g5 g6 21. C:g6 (21...K:g6 22. Фh5) Ле7 22. Фh5 Фc7 23. Ke4 Kd7 24. Лf3 Kf8 25. Kf6+ Kpg7 26. f5 K:e5 27. Фh6+ Kp:f6 28. Cg5x

Дз. Буланаў — М. Яшчук. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. d4 ed 4. K:d4 g6 5. Kc3 Cg7 6. Ce3 Kf6 7. K:c6 bc 8. e5 Kg8 9. f4 d5 10. Ce2 h5 11. 0-0 Ke7 12. Ka4 Kf5 13. Cc5 h4 14. c4 Kg3 15. hg hg 16. Ле1 Фh4 17. Kpf1 Ф:f4+ 18. Cf3 Ф:c4+ 19. Kpg1 Фh4 20. Kpf1 Ca6+ 21. Ce2 Фh1+ 22. Cg1 Лh2, 0:1.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Kd5! ~ Kpg5 2. Kf6, 1...Kph5 2. Kf3. Першыя правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Ігар Ананіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## Убачыць кандыдатаў у твар

Кампанія па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выходзіць на фінішную прамую. Па завяршэнні рэгістрацыі кандыдатаў пачнецца перыяд перадвыбарчай агітацыі. Усе кандыдаты па Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях, а таксама па горадзе Мінску атрымаюць магчымасць звярнуцца да выбаршчыкаў непасрэдна: праз выступленні на тэлеканале «Беларусь 3», а па Мінскай вобласці — на тэлеканале «СТБ».

Выступленні кандыдатаў у дэпутаты пачнуцца 21 кастрычніка і пройдуць у рабочыя дні да 6 лістапада. Працягласць кожнага абмежавана пяццю хвілінамі. Нагадаем, у адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам кандыдатам даецца магчымасць выступіць на тэлебачанні адзін раз. Трансляцыя выступленняў адбудзецца ў вячэрні праймтайм з 19.00 да 20.40, за выключэннем 22 і 29 кастрычніка, калі эфірны час даецца з 19.00 да 19.30 з улікам сеткі вяшчання тэлеканала «Беларусь 3». Тэлеэфір усім удзельнікам палітычнай гонкі даецца бясплатна, аднак забараняецца выкарыстанне ў выступленнях аўдыя- і відэаматэрыялаў.


Фота БелТА.

Дарэчы, паводле Палажэння аб арганізацыі і правядзенні выступленняў у тэледэбатаў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання запісы выступленняў і тэледэбатаў зберагаюцца ў Белтэлерадыёкампаніі і з'яўляюцца яе ўласнасцю. Экзэмпляры (копіі) запісаў выступленняў грамадзянам і арганізацыям не выдаюцца, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам. Выкарыстанне гэтых запісаў без дазволу Белтэлерадыёкампаніі не дапускаецца.

## Медыцынскі дэтэктыў

Тэлеканал «Беларусь 2» працягвае радаваць прыхільнікаў серыялаў. Шматсерыйны дэтэктыў медыцынскай тэматыкі «Ланцэт» (Расія, 2019) ад рэжысёра Алены Нікалаевай («Манекеншчыца», «Камісарша», «Папса» і «Ванечка») цяпер чакае сваіх гледачоў па буднях.

Галоўны герой Ілья Ладынін — хірург ад бога. Яшчэ падчас вучобы ў медыцынскай ВНУ сябры празвалі яго Ланцэтам. Кар'ера і асабістае жыццё Ільі складваюцца пасля інстытута даволі ўдала, аднак усё змяняецца ў адно імгненне. Памірае каханая жонка Ладыніна, а сын Ільі, абвінавачўшы яго ў смерці маці, сыходзіць з дому. Мужчына ўпадае ў дэпрэсію і знаходзіцца на мяжы адчаю.

Уратаваць хірурга магла б любімая работа, але сур'ёзны стрэс, перанесены Ладыніным, дае свае наступствы: ва ўрача пачынаюць трымцець рукі. І яму застаецца толькі адно: адмовіцца ад урачэбнай практыкі і кінуць работу.

Аднак нечакана Ілью прапануюць узначаліць аддзяленне клінікі, якое займаецца расследаваннем здарэнняў у бальніцы. Пасля доўгіх роздумаў хірург усё ж такі вырашае кардынальна змяніць сваё жыццё. Да таго ж у яго цяпер з'яўляецца магчымасць даведацца, што адбылося з яго жонкай. Як здарылася, што пасля лячэння яна памерла, і хто вінаваты ў гэтай смерці...

За развіццём гісторыі Ільі Ладыніна гледачы «Беларусь 2» могуць назіраць па буднях у 17.55.



## На «Беларусь 3» — рэпартажы з культурнай нагоды

**У эфіры тэлеканала неўзабаве з'явіцца серыя «Культурных рэпартажаў», у якіх адлюструюць самыя яркія і значныя падзеі з культурнага жыцця краіны. Адметнасць новага праекта ў тым, што з'яўляцца на экранах ён будзе не цыклічна, а з нагоды фестываляў, конкурсаў, акцый і іншых буйных падзей.**


Фота БелТА.

Першы выпуск будзе прысвечаны Міжнароднаму фестывалю Юрыя Башмета ў Мінску. Каманда праекта наведала самыя значныя канцэрты форуму, паразмаўляла з арганізатарамі, удзельнікамі і гасцямі фестывалю, а таксама пазнаёмілася з закуліссем яго арганізацыі і падрыхтоўкі.

Так, напрыклад, тэлевізійнікі пабывалі на канцэрце Каралеўскага філарманічнага аркестра з Лондана, якім адкрываўся фестываль. І, нягледзячы на жорсткія ўмовы кантракта, паводле якіх прэса не дапускалася на рэпетыцыі, карэспандэнтам сацыякультурнага канала «Беларусь 3» усё ж такі ўдалося зазірнуць за кулісы гэтай унікальнай падзеі.

Дарэчы, ужо пачынаючы з 12 кастрычніка ў эфіры тэлеканала будзе паказана пяць канцэртаў з фестывалю Юрыя Башмета ў фармаце HD. На выхадны гледачоў чакаюць выступленні Міжнароднага камернага аркестра East-West Chamber Orchestra пад кіраўніцтвам Расціслава Крымера, Камернага ансамбля «Салісты Масквы» пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета, а таксама выступленні запрошаных зорак сусветнай акадэмічнай музыкі — Фазіла Сая, Барыса Беразоўскага і Летыцыі Марэна.

Прэм'ера новага праекта «Культурны рэпартаж» адбудзецца якраз напярэдадні тэлеверсіі канцэрта Камернага ансамбля «Салісты Масквы», 26 кастрычніка ў 21.05.

**Алена ДРАПКО.**

### Беларусь 1

**6.45 Меладрама «Ні за што не здамся» (16+).**
**8.15** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.45** Гісторыі выратавання (12+).
**10.25** «Усе за стол!» (12+)
**11.15** Вакол планеты.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Кулінарная дыпламатыя (12+).
**13.15 Меладрама «Пад дажджом не відаць слёз» (12+).**
**15.15** Твой горад.
**15.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**16.10 Меладрама «З Сібіры з каханнем». 1—4-я серыі (12+).**
**19.45** «На вылет!» (12+)
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Двайная хлусня» (16+).**

### Беларусь 2

**7.00 Серыял «Я не робат» (16+).**
**9.05, 21.15** Тэлебарометр.
**9.10** «Кліч крыві» (16+).
**10.20** «Селапаляцела» (16+).
**11.00** «Да пабачэння» (16+).
**11.50** «Багіня шопінгу. Бліскучае вяртанне» (16+).
**12.45 Фантастыка «Асобная думка» (12+).**
**15.10** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**16.05** «Тата папаў» (16+).
**17.00** «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
**18.50** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — БАТЭ (Барысаў).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.50** «Трэці лішні» (16+).
**22.55 Камедыя «Занадта крута для цябе» (16+).**

### Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 14.55, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.25** «Дзве казкі». М/ф (0+).
**8.40 «Каштоўны падарунак». Маст. фільм (12+).**
**9.55** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Катлеты са шчупака.
**10.50** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**11.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.20 «Пяць дзён, пяць начэй». Драма (12+) [СЦ].**
**14.05** «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Зоя Белахвосцік.
**15.15** Канцэрт, прысвечаны памяці Якава Навуменкі.
**16.45 «Вяселле ў Малінаўцы». Камедыя (12+) [СЦ].**
**18.20 «Развітальная гастроль «Артыста». Дэтэктыў (12+).**
**19.35** «Фарбы памяці. Эдуард Куфко».
**20.00** «На вышыні». Балерына Аляксандра Чыжык.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Доўгая дарога да сябе». Драма (12+) [СЦ].**
**22.30** «Сто дзён з Купалаўскім».
**22.55** «Адам. Жыццё чалавека». Дак. фільм. [СЦ].

### Беларусь 5

**6.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Астан Віла».
**8.00** Тэніс. WTA. Эліт трофі. Жухай. Фінал.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат свету U-17. Нігерыя — Венгрыя.
**11.50** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Шэньчжэнь.
**15.30** Трэніровачны дзень.
**16.00** Гульні «навырост».
**16.30** Авертайм. КХЛ.
**17.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Салават Юлаеў» (Уфа). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**19.20** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Тотэнхэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.30** Піт-стоп.
**22.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**22.45** Футбол. Чэмпіянат Партугаліі. «Спортынг» — «Гімараеш». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**0.40** Вынікі тыдня.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**7.10** «Здароўе» (16+).
**8.05** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25** «Метэагід».
**9.45 Маст. фільм «Вечная казка» (16+).**
**11.40** «Бачылі відэа?» (6+)
**14.35, 16.20** «Зоркі «Рускага радыё» (16+).
**17.10** «Зараз спяю!» (12+)
**18.25** «Лепш за ўсіх!» (6+)
**20.00** «Контуры».
**21.20** «Радыус бяспекі» (16+).
**21.55** «Вялікая гульня» (16+).
**23.40** «Спартклуб» (16+).
**0.00** Да 90-годдзя Л. Яшына. «Скачок Льва» (12+).

### СТБ

**6.00** «Ежа багоў» (16+).
**7.35, 20.35** Дакументальны спецпраект (16+).
**9.15** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.05** «Дзень сакрэтных праектаў» (16+).
**11.35, 13.40, 16.40 «Снайперы. Каханне пад прыцэлам». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**22.30** «Тыдзень спорту».
**23.00** Спартыўныя бальныя танцы. Capital Cup Minsk. Фіналы. 2-і дзень.
**23.45** «Хросны». Серыял (16+).

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.10** «Беларусь сёння» (12+).
**6.40** М/ф (6+).
**6.55** «Ведаем рускую» (6+).
**7.50** «Культ/Турызм» (16+).
**8.20** «Яшчэ танней» (12+).
**8.55** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**9.25** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Нітка да ніткі» (12+).
**10.45, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Ваўчынае сонца» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**2.30 Серыял «Афіцэрскія жонкі» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00 Серыял «Аўташкола» (12+).**
**10.10** «Сам сабе рэжысёр» (12+).
**11.00** Весткі.
**11.20** «Сто да аднаго» (12+).
**12.15** «Ранішняя пошта» (16+).
**13.00** «Калі ўсе дома» (12+).
**14.00** «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна» (16+).
**14.30** «Смяяцца дазваляецца» (16+).
**16.10 Маст. фільм «Права апошняй ночы» (12+).**
**18.00, 21.45 Маст. фільм «Вучылка» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.15** «У людзях».
**23.00** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.40** «Вечар у нядзелю».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.30, 22.35** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.05 Дэтэктыў «Наглядчык маяка» (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** Вялікі рэпартаж.
**8.50** Родныя людзі.
**9.15** «Хто ў доме гаспадар?» (16+)
**10.25** «Першая перадача» (16+).
**11.00** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.00** «Дачны адказ» (0+).
**13.05** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05** «Сакрэт на мільён». Валерый Камісараў (16+).
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.00** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.30** Ты не паверыш! (16+)
**23.10** «Расія руліць!» (12+)

### 8 канал

**7.00, 13.55, 19.00, 21.05, 1.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.10** М/ф.
**8.00 Камедыя «30 спатканняў» (16+).**
**9.40** «Утрамдзія».
**9.45** «Гатуй як шэф» (12+).
**10.00** «Законы прывабнасці» (12+).
**10.45** «Вячэрні квартал — 95».
**12.10 Камедыя «З 13 в 30».**
**14.00 «Глядзім усёй сям'ёй». Камедыя «Як прагуляць школу з карысцю» (6+).**
**16.10, 20.45** «Незвычайныя вёскі».
**16.15 Дэтэктыў «Хантэр Кілер» (16+).**
**18.15 Серыял «Касл» (12+).**
**19.05 Камедыя «Адпетыя махляры» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Дэтэктыў «Сем сакрэтаў» (18+).**
**23.35 Трылер «Я змагаюся з веліканамі» (12+).**



### ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.15** «Лаві момант» (16+).
**8.10** М/ф «Тры каты» (0+).
**8.30** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**9.05** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.10** Прыгоды «Прагулка» (12+).
**12.40, 19.30, 0.05** «Уральскія пельмені» (16+).
**13.15, 3.45** Серыял «Людзі Хэ» (16+).
**14.50** Серыял «Дах свету» (16+).
**16.55** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**18.00** «Форт Баярд» (16+).
**21.00** Серыял «Бамбізы» (16+).
**22.00** Камедыя «На мора!» (16+)
**1.05** Серыял «Аднойчы ў міліцыі» (16+).
**2.25** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**5.05** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква чырвоная.
**7.05** «Прыгажун-мужчына». Маст. фільм [СЦ].
**9.15, 2.40** Прыгожая планета.
**9.30** «Іншыя Раманавы». «Руская нявеста для крэўнага ворага» [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.00** XX стагоддзе. «Я пачынаю новы маналог...» Марыс Ліепа». Дак. фільм.
**12.30, 18.45, 0.20** Улада факта. «Японія ў эпоху Мэйдзі».
**13.10** «Алтайскія кержакі». Дак. фільм.
**13.35** «Лінія жыцця». Ірына Мазуркевіч [СЦ].
**14.30** «Энцыклапедыя загадак». Дак. серыял [СЦ].
**15.10** «Агора». Ток-шоу.
**16.15** «Колер часу». Леон Бакст.
**16.30** «Час-не-чакае». Серыял. 1-я серыя.
**17.50** Тыдзень барочнай музыкі. Філіп Жарускі і Фрайбургскі барочны аркестр.
**18.30** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Ступені цывілізацыі. «Сакральныя мясціны». Дак. фільм. 1-я серыя [СЦ].
**21.40** «Сацi. Нясумная класіка...»
**22.20** «Шахеразада». Серыял [СЦ].
**23.20** «Колер часу». Надзя Рушава.
**23.50** «Адкрытая кніга». Вольга Слаўнікава. «Скачок у даўжыню» [СЦ].
**2.00** «Сакрэт раўнавагі». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Сельская настаўніца» (12+).
**7.35, 8.45, 14.25, 15.45, 17.25, 19.00, 20.25, 21.45, 23.00, 1.05, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.50** Фільм-канцэрт «Андрэй Пятроў. Патрэбна добрая мелодыя». 1980 год (12+).
**9.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**10.00** Фільм-канцэрт гурта «Дети». 1988 год (16+).
**11.00** «Тэатральныя сустрэчы». «Непрыдуманыя гісторыі. Смешны выпадак». 1992 год (12+).
**12.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**13.00** «Вакол смеху» з Аляксандрам Івановым. 1986 год (12+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00** «Кінапанарама». «Паралельнае кіно». 1988 год (12+).
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Радыё 70-80-х гг.». 2005 год (18+).
**19.20** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч» (12+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1976-ы. 1-я частка. 2009 год (16+).
**1.20** Тэлеспектакль «Гульцы». 1978 год (12+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

### EuroSport 1

**0.00, 7.00** Гольф. Skins Game.
**0.20** Веласпорт. «Тур Парыжа».
**1.15, 9.00, 13.00, 22.00** Снукер. English Open. Фінал.
**2.30, 14.30, 20.40** Настольны тэніс. Кубак свету. Жанчыны. Фінал.
**6.00, 16.00, 23.00** Аўтагонкі. WTCR.
**10.00** Веласпорт. «Гран П'емонце».
**11.00** Веласпорт. Мілан — Турын.
**12.00** Веласпорт. «Тур Ламбардыі».
**17.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**19.00** Watts.
**20.00** «Дух паруснага спорту».

### Кінакамедыя

**1.05** Ягуар (16+).
**3.00** Закону тут не месца (12+).
**4.40** Без тармазоў (16+).
**6.35** Адчыніце, паліцыя! (16+)
**8.45** Замуж на два дні (12+).
**10.45** Рыцары каралеўства Кратуцы (18+).
**12.25** Не саступіць Штэйнам (16+).
**14.05** Копы ў глыбокім запасе (12+).
**16.05** Выгляд зверху лепшы (12+).
**17.45** Такія розныя блізняты (12+).
**19.30** Рэд-2 (12+).
**21.40** Сардэчна запрашаем у джунглі (12+).
**23.20** Дзень выбараў па-французску (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.50** «Перыскоп» (16+).
**8.10** «У тумане». Драма (12+).
**10.20** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.20** «Сляпая» (16+).
**12.25** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**13.00** «Без падману» (16+).
**13.50** «Світанак на Сантарыні». Маст. фільм (12+).
**15.40** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**16.40** «Натуральны адбор» (12+).
**17.30** «Мой герой» (12+).
**18.20** «Развітанне» (16+).
**19.15, 3.05** «Каханне першых». Дак. фільм (12+).
**20.10, 3.50** «Зорныя дзеці. Жыццё без кахання». Дак. фільм (12+).
**21.05** «Напарніцы». Серыял (16+).
**22.45, 2.20** «Прысуд» (16+).
**23.30, 4.35** «Уся праўда» (12+).
**0.05** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.50** «Таксі». Камедыя (16+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

### ТБ1000

**6.10** Голас монстра (16+).
**8.35** Эвалюцыя Борна (16+).
**11.20** Капітан Крук (12+).
**14.05** Васабі (16+).
**15.55** Госця (16+).
**18.15** Сямейка Крудс (6+).
**20.10** Эван Усёмагутны (12+).
**22.00** Залаты век (16+).
**0.05** Дарый, хачу з табой аженіцца (12+).
**2.15** Прывідны патруль (12+).
**4.15** Санктум (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**7.35** Нерэальнае каханне (12+).
**9.20** Цар (16+).
**11.45** Адрыў (16+).
**13.30** Лонданград. Ведай нашых (16+).
**15.25** Таежная казка (6+).
**15.35** Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
**17.10** Першыя (12+).
**19.00** Вольф Месінг: які бачыў скрозь час (12+).
**20.55, 5.45** Код Апакаліпсісу (16+).
**23.00** Апавяданні (18+).
**1.05** СуперБабровы (12+).
**2.45** Хачу ў турму (12+).
**4.30** Памятаю — не памятаю! (12+)

### National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.25** Суперзбудаванні (16+).
**7.15, 10.25, 19.45, 2.00** Аўта-SOS (16+).
**8.00, 14.20** Ледзяная дарога (16+).
**8.50, 13.30** Інстынкт выжывання (16+).
**9.40, 18.10** 911. Паветраны кантроль (16+).
**11.10** Дзікі тунец (16+).
**12.45** Золата ў халоднай вадзе (16+).
**15.05, 4.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.35** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**17.25** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**19.00, 22.00, 1.10, 3.35** Сонечны фараон Егіпта (16+).
**20.30** Рэальнае паранармальнае (16+).
**21.15** Секунды да катастрофы (16+).
**22.45** Закінутыя скарбы змяіных цароў мая (16+).
**23.35** Ліхтугі за мяжой (16+).
**0.25** Непакорныя акіяны (16+).
**5.10** Як перамагаць ва ўсім (16+).
**5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).

### Discovery

**8.00, 11.10, 13.55, 15.45, 21.15, 7.35** Як гэта ўстроена? (12+)
**8.25, 20.20, 1.50** Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.25** Круты цюнінг (12+).
**12.05, 23.05** Багажныя войны (12+).
**13.00, 3.40** Здзічэлыя (12+).
**14.50** Як гэта зроблена? (16+)
**18.30, 5.15** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**19.25, 6.50** У пагоні за ўраганам (12+).
**0.00** Хуткія і гучныя (12+).
**0.55, 6.00** Гульня на жыццё (16+).
**2.45** Голыя і напалоханыя (16+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.10** «Зона Х» (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.45, 12.10, 18.35,19.20 Серыял «Сальса» (16+).**
**13.05** Дзіцячы доктар.
**13.35 Серыял «Пасведчанне аб нараджэнні» (16+).**
**14.35, 15.25 Серыял «Вяртанне Ляллі» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**23.50** Сфера інтарэсаў.
**0.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 17.50** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10, 22.50** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.10, 17.55 Серыял «Ланцэт» (16+).**
**13.20, 23.55 Серыял «Жаночы доктар-3» (16+).**
**14.20** «Арол і рэшка. Рай і пекла-2» (16+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.35 Серыял «Я не робат» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.15** «Каханне на выжыванне» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Малочны суп з агароднінай.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30, 15.35 «Зорка эпохі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**9.25, 21.05** «Апошні дзень». Аркадзь Райкін (12+).
**10.05** «Камертон». Паэт, перакладчык, публіцыст Анатоль Аўруцін.
**10.30** «Беларуская кухня». Клёцкі са шкваркамі.
**11.00, 16.30 «Змова маршала». Маст. фільм, заключная серыя (16+).**
**12.25 «Дама з папугаем». Камедыя (12+) [СЦ].**
**14.00** «Жывая культура». Мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў аўтэнтычным фальклорным калектывам «Палескія напевы» (в. Новае Палессе, Лельчыцкі раён, Гомельская вобласць).
**14.25, 21.40 «Візіт да Мінатаўра». Маст. фільм (12+).**
**17.30 «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца». Камедыя (12+) [СЦ].**
**19.00** Парламенцкія выбары — 2019.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Артэфакты». Манаграфія Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» [СЦ].

## Беларусь 5

**6.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 3-і тур. «Лейпцыг» (Германія) — «Зеніт» (Расія).
**8.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 3-і тур. «Інтэр» (Італія) — «Барусія» (Дортмунд, Германія).
**10.00** Тэніс. WTA. Эліт трофі. Жухай.
**16.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 3-і тур. Дзённік гульнявога дня.
**16.45** Слэм-данк.
**17.15** Авертайм.
**17.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Металург» (Жлобін). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 3-і тур. ЦСКА (Расія) — «Ферэнцварош» (Венгрыя). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 3-і тур. «Трабзонспор» (Турцыя) — «Краснадар» (Расія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.50** На шляху да Токіа-2020. Відэачасопіс.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.05, 8.05** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.55** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «Паляванне на ізюбра» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Практыка» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.40** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20, 23.35** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.40** «Масгаз». Новая справа маёра Чаркасава (16+).

## СТБ

**5.30, 22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 20.00, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.45** «Міншчына».
**6.20, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Анфас».
**9.25, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Хросны». Серыял (16+).**
**12.25, 14.40** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.35, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 21.20** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.55, 16.50 «Снайперы. Каханне пад прыцэлам». Серыял (16+).**
**19.00** Выступленні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.
**20.30, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**21.00** «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**0.35** «Як устроены свет» (16+).
**1.25** «Ежа багоў» (16+).

## МІР

**6.00, 21.20, 4.10 Серыял «Даішнікі-2» (16+).**
**7.00, 10.10 Серыял «Востраў непатрэбных людзей» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.45** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 3.25** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.55** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.40** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.45** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.00** «Начны экспрэс» (12+).
**1.25** «Такому мама не навучыць» (12+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.55 Серыял «Аўташкола» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Токшоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35, 22.25, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Кацярына. Самазванцы» (12+).**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Нашы (6+).
**6.25** Беларусы (6+).
**7.10** «Цуд тэхнікі» (12+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50, 10.20 Серыял «Дэльта» (16+).**
**9.40, 22.00** «НЗ.by».
**11.15 Серыял «Ляснік» (16+).**
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** Пракурорская праверка (16+).
**15.10, 16.35 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**16.30, 19.40** Сёння. Галоўнае.
**17.50** «ДНК» (16+).
**19.55 Серыял «Марскія д'яблы. Рубяжы радзімы» (16+).**
**20.55, 22.25 Серыял «Цень за спінай» (16+).**
**23.20 Серыял «Сведкі» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 18.55, 21.05, 0.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.10, 16.05** М/с «Цімон і Пумба».
**7.35, 16.00** «Гумарынка».
**7.40 Камедыя «Як адчапіцца ад хлопца за дзесяць дзён».**
**9.35, 19.00 Серыял «Чорная кошка» (16+).**
**10.25** «Законы прывабнасці» (12+).
**11.00 Трылер «Дзяўчына ў тумане» (16+).**
**14.00, 19.50 Серыял «Эліта» (16+).**
**14.50 Серыял «Пунсовае сэрца» (12+).**
**16.40 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).**
**17.30, 23.20 Серыял «Імперыя» (16+).**
**18.15** «Гатуй як шэф».
**18.45** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**20.45** «Незвычайныя вёскі».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Трылер «У час навальніцы» (16+).**

## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.15** «Лаві момант» (16+).
**8.10** М/ф «Тры каты» (0+).
**8.30** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**9.00, 23.45** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.05** Камедыя «Дурдом на колах» (12+).



**12.10, 20.00** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**13.15, 3.45** Серыял «Людзі Хэ» (16+).
**14.50** Серыял «Дах свету» (16+).
**16.55** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**18.00** Серыял «Івановы-Івановы» (16+).
**21.00** Серыял «Бамбізы» (16+).
**22.00** Баявік «Міраж» (16+).
**0.45** Серыял «Аднойчы ў міліцыі» (16+).
**2.05** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.45** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква праваслаўная.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 14.05, 20.45** «Сакральныя мясціны». Дак. фільм [СЦ].
**8.30** «Легенды сусветнага кіно». Алег Яфрэмаў.
**9.00, 22.20** «Шахеразада». Серыял [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.20** XX стагоддзе. «Ластаўка з вострава Туманы». Дак. фільм. «Імчаца коні». Дак. фільм.
**12.00** Раман у камені. «Германія. Замак Разенштайн». Дак. фільм.
**12.30, 18.45, 0.30** «Гульня ў бісер». «Міхаіл Зошчанка. «Перад узыходам сонца».
**13.15** «Больш, чым каханне». Леў і Валянціна Яшыны [СЦ].
**13.55** «Колер часу». Ван Дэйк.
**15.10** Пернікавы домік. «Калыванскія камнярэзы» [СЦ].
**15.40** «2 Вернік 2».
**16.25** «Трэст, які лопнуў». Маст. фільм. 2-я серыя.
**17.35** Тыдзень барочнай музыкі. Уільям Крысці і ансамбль Les Arts Florissants. «У італьянскім садзе».
**18.35** «Колер часу». Уільям Цёрнэр.
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Энігма». Васіліса Бержанская.
**23.20** «Колер часу». Жорж-П'ер Сёра.
**23.50** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**2.00** «Павел Чэлішчаў. Няцотнакрылы анёл». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітлоўскім: «Вячэрняя школа». 2006 год (16+).
**7.00** Канцэрт «The Beatles in Washington D.C.». 2003 год (12+).
**7.25** Маст. фільм «Вялікія перагоны» (16+).
**8.25, 9.45, 11.00, 15.45, 17.00, 21.45, 1.05, 2.25, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**13.00** Маст. фільм «Іван» (16+).
**14.10** «Песня-80» (12+).
**18.00** «Яловая субмарына». 2005 год (12+).
**18.45** Маст. фільм «Апошні палкі закаханы» (16+).
**23.00** «Галіна Вішнеўская ў «Астанкіна». Фільм-канцэрт. 1993 год (12+).
**0.00** «СеваАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Радыё 70-80-х гг.». 2005 год (18+).
**1.20** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч» (12+).

## EuroSport 1

**0.30, 15.00** Веласпорт. Мілан — Турын.
**1.30, 16.00** Веласпорт. «Тур Ламбардыі».
**2.30, 6.30, 19.00** Снукер. English Open. Фінал.
**4.00, 9.30, 17.00, 23.50** Настольны тэніс. Кубак свету. Жанчыны. Фінал.
**5.30, 11.35** Watts.
**8.30** Веласпорт. «Тур Парыжа».
**11.05, 23.20** Гольф. Skins Game.
**12.00, 21.45** Аўтагонкі. WTCR.
**14.00** Веласпорт. «Гран Прэмонэ».
**18.30** Watts. Топ-10.
**20.35** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.

## Кінакамедыя

**1.05** Агент 117: місія ў Рыа (16+).
**3.05** Прыстойныя людзі (16+).
**4.55** Адчыніце, паліцыя! (16+)
**6.50** Прасунуты (16+).
**8.35** Белае віно з Бабулю (16+).
**10.30** Закону тут не месца (12+).
**12.20** Агні вялікай вёскі (12+).
**13.55** 100 мільёнаў еўра (16+).
**15.50** Дзень выбараў пафранцузску (16+).
**17.35** Зводныя браты (16+).
**19.30** Сіньёр Рабінзон (16+).
**21.35** Фантоцы (16+).
**23.35** Фантоцы Другі Трагічны. 1-я серыя (16+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя Беларусьфільма (12+).
**6.15** М/ф (6+).
**6.50** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.20** «Доктар І...» (16+)
**7.50** «Чыстая проба». Серыял (16+).
**9.40, 23.30** «Улегцы» (12+).
**10.10, 15.25, 4.25** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.05, 18.35** «Сляпая» (16+).
**12.10, 19.45** «Варажбітка» (12+).
**13.15, 17.30, 3.35** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.15, 3.05** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.30** «Паралельны свет» (16+).
**20.55** «Напарніцы». Серыял (16+).
**22.40** «Знак якасці» (16+).
**0.00** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**1.05** «Сахара». Баявік (12+).

## ТБ1000

**6.10, 17.30** Капітан Крук (12+).
**8.50** Ганна Карэніна (16+).
**11.15** 13-ы раён (16+).
**12.50** Чужы білет (12+).
**14.55** Эвалюцыя Борна (16+).
**20.10** Бандыты (16+).
**22.30** Паралельныя светы (16+).
**0.35** Апантанасць (18+).
**2.30** Даруй, хачу з табой ажаніцца (12+).
**4.15** Залаты век (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.00** Няўлоўныя: джэкпот (16+).
**7.40** Канікулы прэзідэнта (16+).
**9.45** Снежны анёл (12+).
**11.45** Мужчына з гарантыяй (16+).
**13.20** Лондангард. Ведай нашых (16+).
**15.10** Небяспечныя канікулы (6+).
**16.45** Населены востраў (12+).
**19.00** Вольф Месінг: які бачыў скрозь час (12+).
**20.55, 5.30** Часовыя цяжкасці (12+).
**22.30** Жыццё наперадзе (16+).
**0.05** Код Апакаліпсісу (16+).
**2.05** Апавяданні (18+).
**3.55** Першыя (12+).

## National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.20, 5.15** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.40, 18.15, 22.05, 1.05, 3.25** Суперзбудаванні (16+).
**7.25, 10.30, 19.45, 1.55** Аўта-SOS (16+).
**8.10, 14.25** Ледзяная дарога (16+).
**8.55, 13.35** Інстынкт выжывання (16+).
**9.40, 11.15** Дзікі тунец (16+).
**12.50** Золата ў халоднай вадзе (16+).
**15.10, 4.10** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.40** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**17.25** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**20.30** НЛА над Еўропай (16+).
**21.15** Секунды да катастрофы (16+).
**22.50** Мяжа (16+).
**23.35** Ліхтугі за мяжой (16+).
**0.25** Па іх уласных словах (16+).
**4.55** Як перамагаць ва ўсім (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.15, 7.35** Як гэта ўстроена? (12+)
**8.25, 20.20, 1.50** Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.25** Круты цюнінг (12+).
**12.05, 23.05** Багажныя войны (12+).
**13.00** Як мы вынайшлі свет (12+).
**18.30, 5.15** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**19.25, 6.50** У пагоні за ўраганам (12+).
**0.00** Залатая ліхаманка (12+).
**0.55, 6.00** Гульня на жыццё (16+).
**2.45** Кантакт (12+).
**3.40** Як устроены Сусвет (12+).

УНІКАЛЬНЫ ВОПЫТ

# МІНІ-САНАТОРЫЙ ДЛЯ ВЯСКОЎЦАЎ

Як працуе сучасны цэнтр вольнага часу для сталых людзей



**Гэты будынак па вуліцы Дубко ў аграгарадку Верцялішкі для многіх жыхароў стаў другім домам. Тут усё па-сямейнаму, без афіцыёзу і фармалізму. Сюды ідуць, каб сустрэцца з аднавяскоўцамі, адпачыць у пакоі ароматэрапіі, паляжаць на масажнай кушэтцы, згуляць у більярд, заняцца ёгай і выпіць кіслародны кактэйль. Чым не міні-санаторый? Прычым для пенсіянераў — цалкам бясплатны.**

## Падарунак ад калгаса

Цэнтр адпачынку ў Верцялішках яшчэ зусім малады. Ён з'явіўся два гады таму ў будынку, дзе раней была амбулаторыя. А для медыцынскай установы мясцовая гаспадарка пабудавала новы, сучасны аб'ект. Але і стары будынак пуставаў нядоўга. СПК «Прагрэс-Верцялішкі» сумесна з раённым сацыяльным цэнтрам адкрылі тут аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту. Так афіцыйна называецца ўстанова, якую тут ведаюць як цэнтр вольнага часу.

Яго загадчыца Кацярына Сыянтовіч успамінае, як ахвотна адгукнуўся на ініцыятыву старшыня гаспадаркі Васіль Рэвяка. Менавіта дзякуючы СПК будынак капітальна адрамантавалі і абсталявалі ўсім неабходным. Але і пасля гэтага калгас не застаецца ўбаку. Кожны месяц ён выдаткоўвае 200 рублёў на падтрымку цэнтра. За гэтыя сродкі купляюць гарбату на лекавых травах, кандытарскія вырабы. Пасля кожнага мерапрыемства ўсе наведвальнікі збіраюцца за сталом у фітабары. Нядаўна гаспадарка падарыла цэнтру апарат для кіслародных кактэйляў — як у сапраўдным санаторыі.

## Рэлаксацыя з пахам мяты

Па словах **начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага райвыканкама Ігара БУЛАЯ**, такога цэнтра няма нідзе больш у краіне. Хоць ўстаноў з дзённым знаходжаннем для сталых людзей нават у раёне нямала. Але ў Верцялішках рэалізавана ідэя вольнага часу з элементамі аздараўлення.

— Старшыня СВК пабываў за мяжой, пабачыў, як там жывуць пенсіянеры, і стаў ініцыятарам такога адпачынку ў сваёй гаспадарцы, — заўважыў Ігар Булай. — Вось напрыклад, пакой ароматэрапіі. Сядзіш сабе ў ратангавым крэсле, пад цёплым пледам, пад нагамі — спецыяльны масажор, гучыць спакойная музыка і разносіцца лёгкі водар мяты. І гэта толькі адна з паслуг. А вы прайдзіце па цэнтры, убачыце, які тут узровень. Гэта цэнтр будучыні.

Інструктар па рэабілітацыі Кацярына Кашкевіч — адна з чатырох работнікаў установы. Яна — прафесійны рэабілітолаг, тры разы на тыдзень праводзіць заняткі па аэробіцы, гімнастыцы.

— Прыходзіў, напрыклад, наш пенсіянер, у якога быў інсульт, у яго дрэнна працуе рука, і мы з ім распрацоўвалі яе, каб узнавіліся функцыі, — расказвае Кацярына. — Вельмі папулярная ёга для сталых людзей — з ухілам на расцяжку, распрацоўку суставаў і агульным комплексам для ўсіх відаў цягліц.

У адным з пакояў устаноўлена некалькі новых трэнажораў. За дзень можна прайсці цэлы комплекс паслуг. Многім, напрыклад, падабаецца масажная кушэтка. А для мужчын абсталявана більярдная зала. Часта наведваецца сюды Эдуард Баляслававіч з партнёрамі. Ён лічыць, што ў цэнтры нават за тыдзень можна адпачыць не горш, чым у санаторыі. А вось Іван Андрэевіч хоць і заняты работамі на ўчастку, але знаходзіць час, каб прыйсці ў цэнтр на рэпетыцыю хору.

— Пазнаёміўся з мясцовай жанчынай і пераехаў сюды. У вёсцы мне значна весялей, чым у горадзе, — кажа пенсіянер.

Па просьбе наведвальнікаў тут з'явіліся камп'ютарныя курсы. Многія завялі старонкі ў сацыяльных сетках, карыстаюцца паслугамі інтэрнэт-банкінгу. Дарэчы, фінансаванне курсаў, як і гуртка па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, таксама ўзяла на сябе мясцовая гаспадарка. Для пенсіянераў усё бясплатна.

— Прыйсці сюды можа кожны, хто мае жаданне, без абмежаванняў, — паведаміла Кацярына Сыянтовіч. — Жыхары іншых сельсаветаў таксама могуць прыходзіць, але для іх паслугі будуць платныя: за адну гадзіну — два рублі. Усяго нас наведвае каля ста чалавек, а свае карткі пастаянных наведвальнікаў маюць чалавек семдзесят. Многія працавалі ў калгасе, ёсць былыя настаўнікі, медработнікі. Гэты цэнтр мы стваралі, каб адцягнуць людзей ад паўсядзённых спраў, а таксама аздаравіць іх.

## Ад праекта да праекта

Кацярына Антонаўна — былы дырэктар школы, мае вялікі вопыт арганізатарскай дзейнасці. Дзякуючы гэтаму цэнтр актыўна займаецца міжнароднымі праектамі, якія фінансуюцца Еўрапейскім саюзам.

Першы праект быў накіраваны на сацыялізацыю дзяцей з інваліднасцю. У цэнтры стварылі лялечны тэатр «Званочак». Валанцёры пашылі лялькі. Пасля завяршэння праекта ўсё перадалі школе. Другі праект датычыўся даўгалецця з добрым здароўем. У яго рамках тут набылі масажор для ног, кіі для скандынаўскай хады і гімнастычныя кілімкі.

— Цяпер мы рэалізуем праект «Дзяцінства, апаленае вайной». У нас ёсць таварыства «Дзеці вайны», члены якога нарадзіліся з 1941 да 1944 года. Мы віншуем іх з днём нараджэння, арганізавалі экскурсіі, мерапрыемствы, выстаўкі. А нядаўна прыйшлі з праектам «Актыўнае даўгалецце», ён таксама будзе рэалізаваны, — паведаміла Кацярына Антонаўна.

Цэнтр адпачынку ў Верцялішках працуе, што называецца, па максімуме. Як расказала **дырэктар раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Ангеліна ДАЎГАШЭЙ**, сюды са Скідзеля будуць прыязджаць на рэабілітацыю людзі з інваліднасцю. Праект пачне працаваць у хуткім часе.

— Вельмі важна мець такую базу, якая можа працаваць у шырокім фармаце для сацыялізацыі інвалідаў, — кажа Ангеліна Даўгашэй. — Тут створана безбар'ернае асяроддзе ва ўсім будынку, ад уваход да санітарных памяшканняў. Людзі ў інвалідных калясках могуць спакойна тут перасоўвацца.

## Час адпачываць

Кожнае свята — гэта нагода сабрацца разам. У цэнтры ёсць нямала актыўных і таленавітых людзей, якія не даюць сумаваць. Валянціна Міхайлаўна была ў ліку першых удзельнікаў народнага хору «Ніва». Яшчэ яна займаецца на трэнажорах, ходзіць на ароматэрапію, любіць скандынаўскую хаду. Дарэчы, па хадзе тут ёсць і свае чэмпіёны — гэта 80-гадовая Алена Паўлюкевіч. Жанчыны пасля актыўнага адпачынку любяць пасядзець са сваімі сяброўкамі за кубачкам гарбаты, паспяваць даўнія песні.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# ФОРМЫ РОЗНЫЯ, А ЗМЕСТ АДЗІН

## Дзівінскае аддзяленне сацыяльнай дапамогі працуе на два сельсаветы

**«Што самае важнае ў нашай рабоце? — перапытвае Наталля Данілюк і тут жа адказвае: — Усмешка, добрае стаўленне, уменне падтрымаць гутарку. Здаралася і такое пачуць: «Сёння не трэба нічога рабіць, давай пагаворым». Ну а яшчэ рухавацца, мабільнасць. За дзень некалькі чалавек трэба наведаць, шмат чаго зрабіць».**

Наталля — адна з 45 сацыяльных работнікаў 2-га аддзялення дамашняй сацыяльнай дапамогі Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Гэтае аддзяленне размяшчаецца ў Дзівіне, у вёсцы, на краі Кобрынскага раёна і Брэсцкай вобласці. У дзевяці вёсках Дзівінскага і Павіцкаўскага сельсаветаў абслугоўваюцца 265 чалавек.

## 44 + 1

— Усе нашы работнікі ў асноўным маюць немалы стаж, калектыў даўно склаўся — расказвае **інспектар па асноўнай дзейнасці Вольга РАМАНЮК.** — У вёсцы ёсць пэўная спецыфіка. Нашы работнікі маюць менш падшэфных, чым іх калегі ў горадзе. Таму што людзі, як правіла, жывуць у вясковых хатах, без зручнасцяў, з пячным ацяпленнем. Работы па іх абслугоўванні больш. Ды і адлегласць паміж дамамі, а то і паміж населенымі пунктамі іншая.

У аддзяленні працуюць 44 жанчыны і адзін прадстаўнік моцнага полу. 27-гадовы Павел Брыштэн ужо пяць гадоў спяшаецца да сваіх падшэфных. «У яго ёсць самыя важныя для нашай работы якасці — камунікабельнасць, добразычлівасць. Нашы пенсіянеры вельмі задаволены работай Паўла», — адзначыла Вольга Раманюк. Яшчэ



**Наталля ДАНІЛЮК і Надзея СМЯХОВІЧ.**

Дзівінскае аддзяленне мае на сваім рахунку такія формы абслугоўвання, як дамы зімоўкі і замяшчальная сям'я.

## Удваіх — лягчэй

Называецца цяпер так — дом зімоўкі. А насамрэч і ў Павіцці, і ў Дзівіне на зіму сыходзяцца па дзве бабулі. Так ім лягчэй, а галоўнае — весялей, пеазімаваць. Напрыклад, у Павіцці да Васілісы Раманаўны Герасімік перабралася Ганна Арсенцьеўна Жук. Удзвюх лягчэй ладзіць хатнюю гаспадарку, паліць у печы, гатаваць ежу. Жанчын рэгулярна наведвае сацыяльны работнік, аказвае дапамогу. Ды і эканомія адчувальная, асабліва калі халодная зіма, трэба нарыхтоўваць многа дроў, брыкету. Зноў жа, калі адзін захварэе, другі можа патэлефанаваць на ФАП, выклікаць доктара. Такія формы сябе добра зарэкамендавалі, важна толькі падбіраць людзей псіхалагічна сумяшчальных. Часам яны і самі дамаўляюцца, іншым трэба падказаць, какуць у аддзяленні.

У гэтай жа вёсцы Павіцце не так даўно з'явілася замяшчальная сям'я. 50-гадовая Алена Якаўлеўна Шапяцюк — інвалід першай групы з дзяцінства. Яна не бачыць, абслугоўваць сябе належным чынам не можа. Раней жыла са сваякамі, а калі засталася адна, яе ўзяла ў сваю сям'ю цёзка па прозвішчы і імені — Алена Паўлаўна Шапяцюк. Алена Паўлаўна засталася ўдавою, жыве з трыма дзецьмі. У гэтай сям'і жанчыне-інваліду камфортна. Сацыяльныя работнікі пастаянна наведваюцца, знаёмыя з абстаноўкай, калі трэба, гатовы аказаць патрэбную дапамогу. Як і астатнім сваім падшэфным.

## Цэх чысціні

Ну, напрыклад, надзвычай актуальнай выглядае дапамога па генеральнай прыборцы дома, скажам, вясной напярэдадні Вялікадня альбо восенню пасля ўсіх сельгасработ. Гаспадыні ў гэты час, як правіла, перамываюць коўдры, пакрывалы, фіранкі. А для старых людзей, асабліва тых, хто хворы, адзінокі, такія справы могуць стаць сапраўднай праблемай. Цяпер, калі ў аддзяленні з'явілася свая пральня, многія праблемы вырашаюцца. Гэты цэх чысціні мае дзве пральныя машыны — на 7 і 10 кілаграмаў загрузкі, а таксама сушылку і прэс. Цэны на паслугі тут сацыяльныя, адна загрузка абыходзіцца для кліента прыблізна ў 12 рублёў. Затое можна памыць усе пасцельныя прыналежнасці, сталовую ці іншую бялізну. «Паслугай актыўна карыстаюцца пажылыя людзі», — расказвае Галіна Кокіц — работніца пральні.

## Жаданы госць

Але ж самая галоўная справа аддзялення сацыяльнай дапамогі — штодзённы догляд сваіх падшэфных, дапамога ў іх побытавых і гаспадарчых клопатах. Адна з сямі падапечных Наталлі Данілюк, пра якую згадвалася ў самым пачатку, — Надзея Канстанцінаўна Смяховіч. У яе мы і засталі Наталлю.

Хоць на доме Надзеі Канстанцінаўны і няма шыльды пра тое, што гэта дом узорнага парадку, яе смела можна туды вешаць. Бо такую ідэальную чысціню рэдка сустрэнеш не толькі ў вясковай хаце, але нават у гарадской кватэры. На чысцюткім белым абрусе раскладзены здымкі любімых людзей. Так склалася жыццё, што Надзея Канстанцінаўна цяпер адна. Адзін сын жыве ў Маскве, другі — у Адэсе. Прыязджаюць часта, сёлета былі два разы, летась за год наведалі маму нават тройчы. Але ж часцей бабуля з унукамі цяпер камунікуе па «Скайпе». І калі тры гады таму ўзніклі праблемы з суставамі, яна зразумела, што патрэбная дапамога, напісала заяву на паслугі сацыяльнага работніка. Бо нават у краму не магла зайсці, даводзілася прасіць суседзяў. А цяпер вось Наталля і ў краму сходзіць, і па хатняй гаспадарцы дапамажа.

— Усе нашы работніцы добрыя, адказныя. І калі Наташу падмянялі ў час яе адпачынку, таксама старанныя дзяўчаты прыходзілі. Складаная ў іх праца, — разважае Надзея Канстанцінаўна. — Сярод нас таксама розныя бываюць. Ну што вы хочаце, калі чалавек стары, хворы, капрызны?.. Я і сябе часам лаўлю на тым, што прашу яе затрымацца, пагаварыць. Хоць і разумею, ёй хутчэй бегчы трэба, бо другія чакаюць, — працягвае пенсіянерка. — Мы з Наташай ужо амаль як сяброўкі, дзелімся нейкімі сямейнымі справамі, абмяркоўваем прачытанае ў газетах, убачанае па тэлевізары. Два разы на тыдзень яна для мяне самы жаданы госць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

# БЕЗ ПЕРАШКОД

## У Оршы ў цэнтры сацабслугоўвання з'явіўся лесвічны гусенічны пад'ёмнік

**Большасць з нас зможа лёгка пераадолець некалькі прыступак лесвіцы, а вось для людзей, якія карыстаюцца інваліднай каляскай, яны стануць даволі сур'ёзнай перашкодай на шляху. Дапамагчы ў вырашэнні гэтай праблемы такім людзям цяпер можа лесвічны гусенічны пад'ёмнік «Барс».**



**Наведвальніца аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Лізавета КАЛМЫКОВА са спецыялістам па сацыяльнай рабоце Таццянай ЮРКО.**

Як паведамляе «Аршанская газета», нядаўна эксклюзіўная прылада з'явілася ў тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёна. Пакуль тэхналагічную навінку ў краіне выкарыстоўваюць толькі ў Мінску, Наваполацку і Оршы. Выраблена прылада ў Тальцы і прызначана для пад'ёму калясак вагой да 160 кілаграмаў. Мабільны пад'ёмнік кіруецца асобай-суправаджальнікам. «Барс» лёгка ўсталёўваецца на любую лесвіцу і зручны ў выкарыстанні. Неабходна проста закаціць на яго каляску, замацаваць яе, прышпіліць чалавека з інваліднасцю рамянём бяспекі і накіраваць пад'ёмнік уверх ці ўніз па лесвіцы.

— Часта карыстанне інваліднай каляскай абцяжарвае выхад за межы кватэры шматпавярховага дома. Пад'ёмная прылада «Барс» дапаможа людзям з інваліднасцю перасоўвацца па паверхах, дзе няма ліфта або пандуса, пашырыць доступ да аб'ектаў, перш за ўсё сацыяльнай сферы. Людзі, якія выкарыстоўваюць для перамяшчэння інвалідныя каляскі, змогуць у зручны для іх час прагуляцца па вуліцы, трапіць у аптэку, шпіталь. Дарэчы, для гэтых мэт яны могуць скарыстацца і дапамогай супрацоўніка цэнтра — спецыяліста па суправаджэнні, — кажа **дырэктар ТЦСАН Аршанскага раёна Кацярына МУРАНКОВА.**

Карыстацца прыладай можна бясплатна. Невялікая плата па сацыяльна нізкай цане прадугледжана толькі за дастаўку, пад'ём на патрэбны паверх і ўстаноўку лесвічнага пад'ёмніка.

ІДЭІ І РАШЭННІ

# «ХАТКА САВЫ» ДАПАМОЖА

## Для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі ў Бешанковічах рэалізавалі ўнікальны праект

**Сэнсарна-дынамічная зала, аналагаў якой на Віцебшчыне няма, з'явілася ў раённым цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі. Пра гэта паведамляюць «Віцебскія весткі».**

— Сёння ў краіне створана мадэль інтэграванай інклюзіўнай адукацыі, што з'яўляецца значным крокам наперад у параўнанні з ранейшым механізмам, калі дзіця з інваліднасцю практычна не мела шанцаў навучацца са сваімі аднагодкамі ў дзіцячым садзе ці школе, — кажа **дырэктар цэнтра Алена МАРОЗ.** — Падыход, які выключае любую дыскрымінацыю дзяцей, прызнаны ЮНЕСКА, АБСЕ і іншымі міжнароднымі арганізацыямі прыярытэтным у развіцці нацыянальных сістэм школьнай адукацыі.

Бешанковіцкі цэнтр карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі актыўна працуе ў гэтым кірунку. Сёлета па праекце «Шлях да здароўя», які ўдзельнічае ў праграме ААН пры падтрымцы Жаночай гільдыі ААН у Жэневе, было закуплена абсталяванне для пакоя сэнсарнай інтэграцыі «Хатка Савы». Яго кошт — больш за 14 тысяч рублёў. Яно сапраўды дапамагае дзецям, якія маюць абмежаваныя магчымасці, хутчэй асвоіць і замацаваць новыя навыкі. «Хатка Савы» рэкамендавана пры праблемах рухальнай сістэмы, нязграбнасці, маторнай няспрытнасці, ДЦП лёгкай формы, затрымцы развіцця, парушэнні навыкаў зносін і навучання, аўтыстычных праявах, гіпеfailактыўнасці, трывожнасці, агрэсіі.

— Самае галоўнае адрозненне гэтага абсталявання ад якога-небудзь іншага — усе прыстасаванні-снарады падвешаныя ў паветры. Менавіта гэта ў шмат разоў павялічвае эфектыўнасць заняткаў і працэдур, — кажа Алена Іванаўна. — Калі дзіця тут займаецца, яно не адчувае апоры і яму трэба засяроджвацца. У выніку адбываецца ўключэнне сэнсарных адчуванняў у кантэкст асэнсаваных, самастойных, адаптыўных формаў узаемадзеяння. Іншымі словамі, акцэнт робіцца на інтэграцыі ўсіх адчуванняў, а не толькі на маторных рэакцыях. Змяняючы спосабы замацавання снарада, можна рэгуляваць нагрузку. Гэта дазваляе суаднесці ўзровень складанасці практыкавання з патрэбамі канкрэтнага дзіцяці.

Вельмі важна і тое, што дзеці актыўныя падчас такіх заняткаў. Дарослы не навязвае свае правілы, а будуе дыялог з дзіцем вакол тых гульняў, якія яно абрала само. Такое ўзаемадзеянне, якое прадугледжвае чаргаванне спантанных і патрэбных рухаў, неабходна для развіцця эмоцый, мыслення, маўлення і сувязяў, каардынацыі.

— З дапамогай «Хаткі Савы» і іншага абсталявання мы аказваем увесь аб'ём карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, — дадае Алена Мароз. — Таксама ў цэнтры створаны кабінеты сэнсаматорнага развіцця з акустычным і святломузычным суправаджэннем, ранняй комплекснай дапамогі, пакой сацыяльнай рэабілітацыі. Дзецям асаблівае задавальненне прыносяць гульні з вадой ці пяском, арт- і казкатэрапія.

У цэнтры навучаюцца і дзеці з цяжкімі і множнымі фізічнымі і псіхічнымі парушэннямі. Для іх патрэбныя асаблівыя ўмовы: малая напаўняльнасць класа — да шасці чалавек, з якімі працуе не толькі настаўнік, але і выхавальнік, дэфектолаг, педагог-псіхолаг, масажыст, спецыяліст ЛФК і іншыя.

> Самае галоўнае адрозненне гэтага абсталявання ад якога-небудзь іншага — усе прыстасаванні-снарады падвешаныя ў паветры. Менавіта гэта ў шмат разоў павялічвае эфектыўнасць заняткаў і працэдур.

Штогод псіхолага-медыка-педагагічная камісія ў цэнтры абследуе 300 дзяцей. Звесткі заносяцца ў раённы банк даных. На іх аснове аддзел па адукацыі фарміруе інтэграцыйныя класы і групы, якім адпавядаюць пункты карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў школах, дзіцячых садках. Такім чынам адбываецца 100-працэнтны ахоп дзяцей, якія маюць патрэбу ў асаблівай падтрымцы.



**Каменский сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 20 ноября 2019 года открытого аукциона по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Селище, 3В** кадастровый номер 623282710101000031, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,2486 | электрификация, водоснабжение | 3000,00 | 600,00 | 1941,09 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 20 ноября 2019 в 11.00 по адресу: Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А, Каменский сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 72 3 81, 723 35, 72 3 43; (+37529) 1700261.
**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 14.11.2019 включительно;
**Для участия в аукционе необходимо:**
1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.
**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY42AKBB36006190711030000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 600537220, код платежа – 04901, получатель – Каменский сельский исполнительный комитет, УНП 600181630.
**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.
Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

*Экономическим судом г. Минска 06.09.2019 вынесено определение о защите требований Якубовича Е. В. на собрании кредиторов по делу № 205-5Б/2018 о банкротстве в отношении ЗАО «БЕЛКОММУНСТРОЙМОНТАЖ». Собрание кредиторов по защите требования Якубовича Е. В. состоится 29.10.2019 в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Петра Глебки, д. 11/1, 2-й этаж, зал «АКЦЕНТ». Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями возможно по месту нахождения управляющего ИП Шило А. С.: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. +37529 3360872.*
*УНП 101019973*

**Антикризисный управляющий частное предприятие «Антикризистим» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «МАНТРАНС СИСТЕМ» (дата торгов: 01.11.2019 в 09.00).**
Место проведения торгов: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8029 3360872. Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by/
УНП 193010846

*Антикризисный управляющий ИП Шило А. С. объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже дебиторской задолженности ЗАО «Белкоммунстроймонтаж» (дата торгов: 01.11.2019 в 10.30), по продаже имущества и дебиторской задолженности частного предприятия «ВВА и К» (дата торгов: 01.11.2019 в 10.00), по продаже имущества ГСПК «Жилищник-21» (дата торгов: 01.11.2019 в 09.30).*
*Место проведения торгов: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8029 3360872*
*Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by/*
УНП 690619966

# ЭНЕРГІЯ РАЗУМНАГА ГОРАДА

## Пілотныя ініцыятывы, што рэалізуюцца ў Навагрудку, дапамагаюць не толькі зберагаць прыродныя рэсурсы, але і рабіць горад больш камфортным

**Навагрудак ужо даўно і мэтанакіравана рухаецца ў напрамку ўстойлівага развіцця. Ён другім у нашай краіне пасля Полацка падпісаў добраахвотную ініцыятыву «Пагадненне мэраў» і абавязаўся да 2020 года скараціць выкіды вуглякіслага газу на 25 тысяч тон, зрабіўшы стаўку на энергазберажэнне.**

Выканаць гэтыя планы дапамогуць і пілотныя ініцыятывы ў рамках праекта «Зялёныя гарады». Яны накіраваныя на павышэнне энергаэфектыўнасці жылога фонду і сістэмы выкарыстання вулічнага асвятлення.

### Ліхтары запальваюцца, калі гэта неабходна

— Вулічныя ліхтары ў маштабах усёй Беларусі спажываюць тую колькасць энергіі, якая патрэбная для электразабеспячэння некалькіх адміністрацыйных раёнаў краіны, — прыводзіць адну з прычын неабходнасці ўдасканалення сістэмы вулічнага асвятлення **нацыянальны кансультант праекта «Зялёныя гарады» па энергаэфектыўнасці Іван ФІЛЮЦІЧ.** — Укараненне ж сучаснай святлатэхнікі — святлодыёдных ліхтароў з інтэлектуальнай сістэмай кіравання — дапамагае эканоміць да 30—40% электраэнергіі. Зніжаючы энергаспажыванне, мы адпаведна зніжаем выдаткі мясцовага бюджэту і адначасова скарачаем выкіды парніковых газаў.



Ганаровае адкрыццё гарадскіх вуліц, аснашчаных сістэмай «разумнага» святлодыёднага асвятлення, у Навагрудку прайшло ў рамках XV Рэспубліканскага экалагічнага форуму.

Падчас рэалізацыі праекта ў Навагрудку ўстанавілі 400 святлодыёдных ліхтароў і 25 шафаў інтэлектуальнага кіравання з вулічным асвятленнем. Сістэма ўлічвае асвечанасць і час сутак, наяўнасць людзей і транспарту, каб уключаць і выключаць асвятленне, тым самым эканомячы электраэнергію і грошы мясцовага бюджэту. Афіцыйнае адкрыццё вуліц з «разумным святлом» адбылося ў чэрвені 2019 года.

— З верасня мы пачалі праводзіць штомесячны маніторынг работы гэтага святлотэхнічнага абсталявання, — кажа эксперт. — І праз год зможам дакладна сказаць, колькі камунальная гаспадарка Навагрудка змагла сэканоміць кілават-гадзін і фінансавых рэсурсаў.

Па словах Івана Філюціча, ініцыятыву падтрымалі як мясцовыя органы ўлады ў Навагрудку, Навагрудская ЖКГ, так і гараджане. Бо, зразумела, заўсёды станоўча ўспрымаюцца змены, калі вуліцы добра асвятляюцца ў патрэбны час: павышаецца агульная бяспека ў горадзе, зніжаецца колькасць траўм і аварый, ды і горад выглядае больш прыгожа.

### Разумны ўлік

Другі пілотны праект накіраваны на ўстаноўку індывідуальных прыбораў уліку для ўсіх відаў энергарэсурсаў у двух шматкватэрных дамах па вуліцы Карскага ў Навагрудку.

— У краіне ўзяты курс на цыфравізацыю жыллёва-камунальнай гаспадаркі і ўкараненне так званых смарт-лічыльнікаў для ўліку розных відаў рэсурсаў. Наш праект — адзін з першых, дзе будзе ўкаранена такая сістэма, — адзначае Іван Філюціч.

Падрыхтоўчыя работы па праекце пачаліся яшчэ летась. Каб вызначыцца з аб'ектамі мадэрнізацыі, эксперты прааналізавалі энергаспажыванне больш за 40 жылых дамоў у Навагрудку, у тым ліку пакватэрнае. Затым з некалькіх дзясяткаў дамоў выбралі тры, дзе выкарыстоўваюцца ўсе віды рэсурсаў (электра- і цеплавая энергія, вада, газ), а таксама ёсць магчымасць паставіць пакватэрныя цеплалічыльнікі (у дамах з гарызантальнай разводкай сістэмы ацяплення).

Вялікую работу правялі і з мясцовым насельніцтвам — вызначалі, наколькі цікавы падобны праект, якія ў іх ёсць страхі адносна яго рэалізацыі, адказвалі на пытанні па тэхнічнай частцы. У выніку пераважная большасць жыхароў дамоў падтрымала гэтыя работы.

Цяпер распрацоўваецца праектная дакументацыя, а ўстаноўку разумных лічыльнікаў плануецца завяршыць у 2020 годзе.

### Добры вопыт павінен перадавацца

Каманда праекта «Зялёныя гарады», акрамя рэалізацыі пілотных ініцыятыў, таксама прыкладае намаганні для тыражавання гэтага вопыту на ўсю тэрыторыю Беларусі.

— Мадэрнізацыя вулічнага асвятлення і ўкараненне прыбораў уліку — гэта якраз тыя накірункі, якія могуць садзейнічаць павышэнню энергаэфектыўнасці і зніжэнню выкідаў парніковых газаў ва ўсіх без выключэння муніцыпалітэтах, раёнах, буйных і сярэдніх гарадах Беларусі, — упэўнены Іван Філюціч.

Сёння спецыялісты займаюцца распрацоўкай тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў па мадэрнізацыі вулічнага асвятлення для сямі гарадоў Беларусі, у тым ліку Полацка і Наваполацка.

— Мы імкнёмся не проста рэалізаваць інфраструктурныя праекты, але і стварыць такое асяроддзе, якое і пасля іх завяршэння дазволіць рэалізоўваць падобныя ініцыятывы з меншымі выдаткамі і большай эфектыўнасцю, — кажа эксперт. — Для гэтага займаемся ўкараненнем прынцыпаў «зялёных» закупак і аказваем садзейнічанне пілотным гарадам у прыцягненні розных крыніц фінансавання (інвестараў) для рэалізацыі «зялёных» праектаў.

Працуюць эксперты і над метадычнымі рэкамендацыямі, якія дазволяць дакладна ацэньваць зніжэнне выкідаў парніковых газаў ад розных мерапрыемстваў. Яны лягуць у аснову нацыянальнай палітыкі ў вобласці маніторынгу, справаздачнасці і верыфікацыі такіх выкідаў.

# НА «ЗЯЛЁНАЙ» ХВАЛІ

## Як у Полацку і Наваполацку «будуюць» устойлівы гарадскі транспарт

**Пакуль аўтамабільны Полацк прывыкае да закрыцця на капітальны рамонт аднаго з мастоў цераз Заходнюю Дзвіну, у самым старажытным горадзе Беларусі і яго маладым суседзе Наваполацку змяняюць падыходы да арганізацыі гарадскога транспарту. Менавіта такую мэту ставіць пілотная ініцыятыва, якая рэалізуецца ў абодвух гарадах пры падтрымцы мясцовых органаў улады.**

Дзейнасць гэта вельмі своечасовая. Толькі ў першы дзень закрыцця старога моста па вуліцы Юбілейнай Полацк стаў у пробках, на новым мосце сутыкнуліся восем аўтамабіляў. Каб пазбегнуць транспартнага калапсу, у Полацку ўкараняюцца мерапрыемствы па павелічэнні прыярытэту выкарыстання грамадскага транспарту над асабістым. Адно з дасягненняў праекта — арганізацыя канструкцыйна вылучанай паласы для грамадскага транспарту. Яна праходзіць па вуліцах Багдановіча, Зыгіна, Кастрычніцкай да вакзала і павінна дапамагаць больш эфектыўна перасоўвацца па цэнтральнай частцы горада, тым больш ва ўмовах рамонту.

Як расказаў **нацыянальны кансультант праекта «Зялёныя гарады» па транспарце і ўстойлівай мабільнасці Павел АСТАПЕНЯ,** для зручнасці пасажыраў грамадскага транспарту ў Полацку і Наваполацку плануецца ўстанавіць электронныя інфармацыйныя табло, дзе ў рэжыме рэальнага часу будзе адлюстроўвацца інфармацыя пра рух грамадскага транспарту, і новыя прыпыначныя павільёны. Месцы для ўстаноўкі такіх аб'ектаў выбіралі з улікам меркавання гараджан.

У рамках праекта таксама заменяць кантролеры на святлафорах на цэнтральных вуліцах Полацка і Наваполацка. 25 разумных прылад будуць сінхранізавацца праз спадарожнікі, а не праз лініі сувязі і GSM, як раней (такія тэхналогіі прымяняюцца ў нашай краіне пакуль адзінкава).

— Мы будзем імкнуцца скаардынаваць святлафоры так, каб гэта было зручна ў першую чаргу грамадскаму транспарту, каб знізіць яго выдаткі, супакоіць транспартны паток, каб ён рухаўся раўнамерна, без разгону да 69 км/г, — адзначае Павел Астапеня. — Цяпер ідзе працэс праектавання. Праз пэўны час пасля закрыцця моста мы прааналізуем, як змяніліся гарадскія патокі, каб потым адрэгуляваць святлафоры пад актуальныя абставіны.

Горад — не толькі для аўтамабіляў, упэўнены аўтары праекта. Таму ў пілотных гарадах плануюць укараніць інавацыйную схему арганізацыі дарожнага руху, накіраваную на прасоўванне выкарыстання ўстойлівых відаў транспарту, зніжэнне выкідаў $CO_2$, змяншэнне аварыйнасці, паляпшэнне ўмоў для руху грамадскага, веласіпеднага транспарту і пешаходных перамяшчэнняў.

Першая задача — упарадкаваць паркоўку ў горадзе: вызначыць канкрэтныя месцы для стаянкі аўтамабіляў, а таксама не дапускаць яе ў несанкцыянаваных месцах. На дапамогу спецыялісты выклікаюць арганізацыі, якія выконваюць фотафіксацыю парушэнняў ПДР. У выніку



Магчымыя макеты прыпыначных пунктаў, якія плануецца ўстанавіць у Полацку і Наваполацку.

парушальнікам правіл паркоўкі будуць прыходзіць не віртуальныя папярэджанні, а рэальныя штрафы. Камеры плануюць устанавіць і на паласе для грамадскага транспарту.

Полацк — адзін з лідараў развіцця веларуху ў краіне. Менавіта тут раней за сталіцу з'явілася велапаласа на праезнай частцы. Яна дапамагае веласіпедыстам перамяшчацца па горадзе, не перашкаджаючы іншым удзельнікам руху. У межах праекта плануецца працягнуць гэту работу ў двух гарадах, каб іх жыхары ўсё часцей у якасці сродку перасоўвання выбіралі веласіпед. За гэты час дзесьці ўжо абнавілі старыя велапалосы, прыбралі бар'еры для перамяшчэння, дзесьці пабудавалі ці будуюць новыя (напрыклад, на вуліцы Гогаля ў Полацку і на вуліцы Маладзёжнай у Наваполацку). Каб вырашыць пытанне захоўвання экалагічных транспартных сродкаў, у Наваполацку будзе ўстаноўлена пяць велапарковак каля шматпавярховікаў.

Выконваюцца і мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі пераезду веласіпеда праз праезную частку, зніжэнні бардзюраў, удасканаленні веладарожак, якія праходзяць па тратуарах, для мінімізацыі канфліктаў паміж веласіпедыстамі і пешаходамі.

Як расказаў Павел Астапеня, эксперты прапануюць таксама змяніць структурызацыю вуліц. У новым варыянце яна будзе абапірацца не на колькасць палос, а на функцыі, што выконваюць вуліцы, — якія ўчасткі горада яны звязваюць, якія цэнтры прыцягнення людзей (установы адукацыі, магазіны і іншыя) там існуюць.

— Сёння мы і ў сталіцы можам назіраць чатырохпалосныя вуліцы, на якіх дзве паласы не выкарыстоўваюцца па прызначэнні, таму што запаркаваныя, — кажа эксперт. — Праектаванне і будаўніцтва такіх часам непатрэбных для руху аб'ектаў — гэта перарасход бюджэтных сродкаў на іх будаўніцтва і абслугоўванне, павышаныя хуткасць руху і аварыйнасць з-за паркоўкі каля пешаходных пераходаў. Мы лічым, што неабходна змяніць гэту сітуацыю і ўнесці карэктывы ў заканадаўства, у тым ліку ТКП адносна структурызацыі вуліц.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# «МАЛЕНЬКАЯ КРАІНА» СВАІМІ РУКАМІ

## У Заходнім мікраараёне Гомеля пачалі будаваць зону адпачынку для самых маленькіх

**ЖЫХАРЫ дамоў №№ 10, 12 і 14 на вуліцы Гайдара за ўласныя сродкі і практычна сваімі сіламі ўжо зрабілі некалькі гульнявых зон для дзяцей. І наперадзе ў іх яшчэ вялікія планы, паведамляе газета «Савецкі раён».**

На дваровай тэрыторыі паміж шматпавярховікамі досыць месца, дзе дзеці могуць бавіць час. Але з забавак маленькім жыхарам прапаноўваліся толькі перакладзіны, паламаная горка-верталёт і пустка, па якой нават на санках узімку не праехаць.

Невялікі «мамсавет» узяў ініцыятыву ў свае рукі. Сабралі грошы на фарбу, умацавалі і абнавілі металічныя канструкцыі. Наступнай неабходнай пазіцыяй вызначылі набыццё пясочніцы. Да актывістак далучылася каля 70 суседзяў, а неўзабаве прыйшлі на дапамогу дэпутаты, спонсары і камунальнікі.

Стварэнне «Маленькай краіны» на вуліцы Гайдара стала лагічным працягам руху па добраўпарадкаванні двароў, якія пачалі некалькі гадоў таму актывісты КТГС «Сонечны». Унікальную для горада ініцыятыву падтрымалі практычна ўсе раёны, але самыя бадай, яркія вынікі можна сустрэць у Савецкім. «Сонечны дворык», «Праспект цудаў», «Горад міньёнаў»... Дырэктару дзяржпрадпрыемства «Савецкае», дэпутату гарсавета Міхаілу Прусу не хапае пальцаў на руцэ, каб пералічыць адрасы двароў, якія пачалі добраўпарадкоўвацца дзякуючы настойлівасці і творчаму падыходу суседзяў.

У Заходнім мікраараёне такі двор першы, ён уваходзіць у склад КТГСа «гайдараўскіх». Ідэяй на месцы былой «верталёткі» пабудаваць «Маленькую краіну» першымі загарэліся мясцовыя жыхаркі Ганна Булановіч і Таццяна Мекшун.

— Улады і камунальныя службы ідуць з падтрымкай туды, дзе нас чакаюць, дзе людзі гатовыя да перамен і турбуюць нас у добрым сэнсе гэтага слова, — тлумачыць выбар пляцоўкі Міхаіл Прус. — Дапамагчы спланаваць тэрыторыю, прывезці пясок або непатрэбныя дошкі тым, хто з іх зробіць гульнявое абсталяванне, нам няцяжка.



Старшыня КТГС «Гайдараўскі» Людміла САМАРДАКАВА і дэпутаты гарсавета Міхаіл ПРУС і Міхаіл ПАЧЫНОК.

Акрамя камунальнікаў, ініцыятыву суседзяў падтрымалі дэпутаты гарсавета. Так, Міхаіл Пачынок знайшоў рэсурсы, каб аднавіць горку-верталёт. А Міхаіл Прус пераканаў гарадскую ЖКГ накіраваць знятую летась плітку з вуліцы Савецкай менавіта ў гэты двор на стварэнне пешаходных сувязяў.

Ну а актыўнасці жыхароў можна толькі пазайздросціць. Малады бацька Сяргей Паплаўны днём працуе электрыкам, а па вечарах і выхадных будуе зону адпачынку для самых маленькіх. Паддоны і старыя дошкі ў яго руках ужо ператварыліся ў гульнявую хатку, масток і арэлі, а вялікія шпулькі з-пад кабелю — у столік і крэслы. У планах — невялікі лабірынт з драўляных шчытоў.

У Viber «мамсавет» стварыў тэматычную групу, дзе жыхары двара дзеляцца ідэямі, карысннай інфармацыяй, абмяркоўваюць далейшыя планы па добраўпарадкаванні. З найбліжэйшых — сабраць грошы на вялікую горку і новыя арэлі, перспектыва налета — абсталяваць у «Маленькай краіне» шматфункцыянальны гульнявы комплекс.

> Стварэнне «Маленькай краіны» на вуліцы Гайдара стала лагічным працягам руху па добраўпарадкаванні двароў, якія пачалі некалькі гадоў таму актывісты КТГС «Сонечны». Унікальную для горада ініцыятыву падтрымалі практычна ўсе раёны

Тым часам да ініцыятывы на вуліцы Гайдара прыглядаюцца жыхары суседніх дамоў — №№ 4, 6 і 8. На іх тэрыторыі можна разбіць спартыўны гарадок для старэйшых дзяцей. Тут ужо ёсць баскетбольнае кола з сеткай, турнікі, вароты для мініфутбола. Апошнія, дарэчы, з'явіліся таксама дзякуючы дэпутатам гарсавета. У дзень адкрыцця «Маленькай краіны» яны прыехалі ў двор павіншаваць жыхароў і выслухаць іх просьбы.

Самым надзённым стала пытанне асвятлення дзіцячай пляцоўкі. Наяўныя вулічныя ліхтары накіраваны на праезную частку і пешаходныя сцежкі. Міхаіл Пачынок і Міхаіл Прус паабяцалі паглыбіцца ў праблему і знайсці аптымальнае рашэнне. Пакуль жа тут прайшоў ямачны рамонт часткі двара, за што жыхары горача падзякавалі дэпутатам. Налета астатнюю частку дарогі залатаюць адну з першых.



Фота Вячаслава КАЛАМІЙЦА.


## Дополнение и изменения к проектной декларации по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами торгово-общественного назначения по ул. Купревича», опубликованной в газете «Звязда» от 22.02.2019 г. № 35 (28902).

**Застройщик:** ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

**О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА**

Многоквартирный жилой дом запроектирован трехсекционным, 16-этажным, на 235 квартир.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

Планируемый Заказчиком срок ввода объекта в эксплуатацию – декабрь 2019 года.

Строительство жилых помещений будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее – договоры). Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартир.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком на день платежа.

Первоначальный взнос в размере 50 % вносится в течение 30 календарных дней с момента заключения договора в следующем порядке: в течение 5 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме – 20 % от стоимости договора, в течение последующих 25 календарных дней – в размере 30 % от стоимости договора. Оставшаяся сумма в размере 50 % выплачивается в соответствии с графиком платежей до 31 декабря 2019 года.

Гражданам для заключения договоров предлагается 41 квартира, в том числе:

4 однокомнатных квартиры общей площадью от 43,34 до 44,08 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1190 долларов США.

1 однокомнатная квартира общей площадью 48,43 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1190 долларов США.

2 однокомнатные квартиры общей площадью от 50,53 до 50,62 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1190 долларов США.

1 двухкомнатная квартира общей площадью от 57,16 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1190 долларов США.

10 двухкомнатных квартир общей площадью от 61,69 до 69,24 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1160 долларов США.

21 трехкомнатная квартира общей площадью от 80,43 до 82,66 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1100 долларов США.

1 трехкомнатная квартира (1-й этаж) общей площадью от 92,1 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 1100 долларов США.

1 четырехкомнатная квартира (1-й этаж) общей площадью 104,99 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры – 950 долларов США.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве**

Прием заявлений от граждан осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, каб. 304Б с 23 октября 2019 года, понедельник–четверг – с 8.15 до 16.50, обед с 12.00 до 12.45, пятница с 8.15 до 15.30, обед с 12.00 до 12.45. Дополнительная информация предоставляется по телефонам: +375 (44) 7771158, 017 2072060.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.



## Сведения о результатах проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 7»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220089 г. Минск, пр-т Дзержинского, 5–613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.
2. Заинтересованным лицом рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Маунфелд Бай», юридический адрес: 220015, г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 47, пом. 40, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192768834, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 03.02.2017.
3. Сроки проведения рекламной игры:
Срок начала рекламной игры: 06.09.2019.
Срок окончания рекламной игры 15.11.2019.
4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3623, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 21.08.2019.
5. Количество участников рекламной игры – 1646 чел.
6. Информация о призовом фонде:
Размер призового фонда рекламной игры составляет 1002,25 (одна тысяча два) белорусских рубля (двадцать пять) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.
7. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Русецкий А. П. | Приз 1 – шкаф духовой электрический MAUNFELD EOEH.7611B, денежные средства в размере 52,13 бел. руб. |
| 2 | Горбачевский В. А. | Приз 2 – электрическая индукционная панель MAUNFELD MVSI59.4HZ-BK черное стекло, денежные средства в размере 30,18 бел. руб. |
| 3 | Кузьменков Д. Н. | Приз 3 – печь микроволновая электрическая MAUNFELD MFSMO 20.7SGB |

8. Для получения призов победители должны явиться не позднее 15.11.2019 (включительно) по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 5 – офис 613, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 17 кастрычніка 2019 года.**